Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

2 ЧЭРВЕНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 99
(26457)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

Ідзе падпіска на II паўгоддзе 2009 года

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс	*на 1 месяц*	*на 3 месяцы*	*на 6 месяцаў*
63850 (індывідуальны)	**10600**	**31800**	**63600**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**9990**	**29970**	**59940**
63858 (ведамасны)	**17050**	**51150**	**102300**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**15550**	**46650**	**93300**
Да запатрабавання (праз газетныя кіёскі РУП «Белпошта»)			
63850 (індывідуальны)	**9460**	**28380**	**56760**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**8850**	**26550**	**53100**
63858 (ведамасны)	**14926**	**44778**	**89556**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**13639**	**40917**	**81834**
Да запатрабавання (праз кіёскі «Белсаюздруку»)			
63850 (індывідуальны)	**8410**	**25230**	**50460**
63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	**7830**	**23490**	**46980**
63858 (ведамасны)	**11086**	**33258**	**66516**
63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	**10525**	**31575**	**63150**

НЕ ПАДЗЯЛІЛІ ДАРОГУ...

Фота Уладзіміра ЧЫЧЫНА.

Размова Аляксандра Лукашэнкі з кіраўнікамі буйных друкаваных выданняў Расіі доўжылася тры з паловай гадзіны

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю буйным друкаваным выданням Расіі: газетам «Известия» і «Завтра», часопісам «Российская Федерация сегодня» і «Союзное государство», перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Інтэрв'ю планавалася даўно і праходзіла ў форме гутаркі. Размова Прэзідэнта з галоўнымі рэдактарамі выданняў доўжылася тры з паловай гадзіны. Аляксандру Лукашэнку было зададзена больш за 20 пытанняў, якія датычыліся ўнутранага развіцця Беларусі, устойлівасці яе эканомікі ў сучасных умовах і дзеянняў у час сусветнага крызісу. Расійскія журналісты цікавіліся прычынамі тармажэння ў будаўніцтве Саюзнай дзяржавы. У цэнтры ўвагі знаходзілася таксама тэматыка адносінаў Беларусі з краінамі Захаду, удзел у праграме «Усходняе партнёрства». Акрамя таго, шмат гаварылася аб гісторыі саюзнага будаўніцтва, нюансах з'яўлення саюзнага дагавора. Кіраўніку беларускай дзяржавы былі зададзены і асабістыя пытанні, якія датычацца яго сям'і, поглядаў на жыццё, яго бачання ролі лідара ў кіраванні краінай.

Кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з нацыянальным святам — Днём абвяшчэння Рэспублікі — Прэзідэнта Італіі Джорджа Напалітана і Старшыню Савета Міністраў гэтай краіны Сільвіа Берлусконі.

«Упэўнены, што прагрэс, дасягнуты апошнім часам у развіцці беларуска-італьянскага дыялогу, будзе трывалай асновай для далейшага пашырэння і ўмацавання супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі на карысць народаў Беларусі і Італіі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка ў віншаванні Джорджа Напалітана. У віншавальным пасланні Сільвіа Берлусконі Прэзідэнт Беларусі выказаў глыбокае задавальненне ўмацаваннем дыялогу і ўзаемаразуменне паміж дзвюма краінамі. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць у тым, што ўсебаковае пашырэнне беларуска-італьянскага супрацоўніцтва, традыцыйна цесныя сяброўскія сувязі паміж нашымі народамі, а таксама плённыя кантакты на найвышэйшым узроўні дазволяць у поўнай меры рэалізаваць значны патэнцыял, які існуе ва ўсіх сферах узаемадзеяння, на карысць Беларусі і Італіі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Магчымасць прадастаўлення Беларусі расійскага крэдыту ў памеры $500 млн захоўваецца

Аб гэтым заявіў віцэ-прэм'ер, міністр фінансаў Расіі Аляксей Кудрын на брыфінгу па выніках пасяджэння Прэзідыума ўрада, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Нацбанк Беларусі прагназуе скарачэнне попыту на замежную валюту з боку насельніцтва ў найбліжэйшы час

Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка — прэс-сакратар Анатоль Драздоў.

Ён нагадаў, што ў канцы мая рэзка ўзрос попыт насельніцтва на замежную валюту. Анатоль Драздоў растлумачыў, што гэта адназначна было выклікана чуткамі аб плануемай у пачатку чэрвеня чарговай дэвальвацыі за адзін раз беларускага рубля. Таксама абвостранасць на наяўным валютным рынку выклікалі і пэўныя СМІ, у якіх актыўна абмяркоўвалася гэта тэма. Аднак на 1 чэрвеня сітуацыя зусім не змянілася, курс беларускага рубля застаецца стабільны. «Чуткі чарговы раз не спраўдзіліся. Такім чынам, мы разлічваем, што людзі зразумеюць, што яны ашукаліся, і чакаем змяншэння попыту насельніцтва на валюту», — падкрэсліў ён. У Нацбанку таксама паведамілі, што ў гэты адпускны сезон праблем з прапанаваннем банкамі валюты не чакаецца, бо адпаведная работа з імі была праведзена.

БЕЛТА.

Твае правы

АДЗІН БУДЫНАК. РОЗНЫЯ ЎМОВЫ?

Работніца завода працуе на сваім месцы 28 гадоў, мае рэпутацыю добрага спецыяліста. І раптам здараецца непрадбачанае — прадпрыемства ўзначальвае новы дырэктар, які без асаблівых тлумачэнняў прымае рашэнне не працягваць з жанчынай кантракт. Нягледзячы на «букет» захворванняў і неабходнасць плаціць немалыя грошы па крэдыце на жыллё... Сапраўды, можна пагадзіцца: ніякіх парушэнняў з боку адміністрацыі тут нібыта няма. Але разам з тым сітуацыя непрыемная. І выйсці з яе зараз магчыма толькі на мясцовым узроўні, як кажуць, у індывідуальным парадку — у тым ліку шляхам пошуку новай беспрацоўнай іншага месца з улікам яе досведу, кваліфікацыі і стану здароўя.

Між тым, таксама не сакрэт: «выключныя меры» патрабуюцца не заўсёды — шляхі вырашэння многіх канфліктаў «падказвае» непасрэдна заканадаўства. Ці могуць «перавесці» на іншую працу цяжарную жанчыну без яе згоды, якія кампенсацыі прадугледжваюцца пры скарачэнні і што рабіць у выпадку затрымкі зарплаты? Усё гэта стала тэмамі чарговай «выязной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, што была наладжана для жыхароў Нясвіжскага і Клецкага раёнаў Міншчыны.

Кантракт магчымы не заўсёды

Практыку заключэння працоўных кантрактаў назваць вельмі папулярнай нельга. Але сітуацыі ёсць розныя. У прыватнасці, ці можа запатрабаваць падпісання таго ж кантракту жанчына, якая ўладкавалася на замену «дэкрэтніцы»? Бо зразумела: такі варыянт дае гарантаваную працу прынамсі на год.

— Супрацоўніца, якая знаходзіцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, лічыцца асноўнай і можа вярнуцца на сваё месца практычна ў любы момант — у гэтым плане заканадаўства цалкам на яе баку, — адзначае намеснік дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Ірына Шыляева. — Таму, каб не ўзнікала канфліктаў, з работнікам «на замену» заключаецца не кантракт, а тэрміновы працоўны дагавор — з указаннем, што прыём робіцца выключна на перыяд знаходжання ў сацыяльным водпуску па доглядзе за дзіцем «дэкрэтніцы».

Аклад. Але свае надбаўкі

Нельга не заўважыць, што замены — практыка даволі распаўсюджаная. А адсюль яшчэ адно пытанне — аб аплаце. Улетку работніца дзіцячага садка, якая аформлена на 0,5 стаўкі, працуе на час водпуску замест калегі-«ставачніцы». Як у такім выпадку робяцца налічэнні?

— Паводле Працоўнага кодэксу, аплата за выкананне абавязкаў калегі, што часова адсутнічае, павінна рабіцца зыходзячы з акладу работніка, які замяняецца, — распавядае Ірына Шыляева. — Аднак пры гэтым надбаўкі і даплаты работнік, што выходзіць на замену, атрымлівае свае. Што ж да прэмій, то яны налічваюцца зноў-такі зыходзячы з памеру службовага акладу без надбавак і даплат работніка, які замяняецца.

Цяжарнасць з «лёгкім» варыянтам

Цяжарная работніца цяпліцы трапіла ў бальніцу. А па выпісцы яе пераводзяць на іншае месца — з матывіроўкай, што на месцы ранейшым даводзіцца мець справу з ядахімікатамі і перасоўваннем цяжкасцяў. Ці мае тут рацыю наймальнік з улікам таго, што ніякіх заяў з просьбай даць іншую працу сама работніца цяпліцы не пісала?

— Калі медыкі далі заключэнне, што цяжарнай жанчыне супрацьпаказаныя тыя ж фізічныя нагрузкі і яна мае патрэбу ў лёгкай працы, то наймальнік проста абавязаны гэта патрабаванне выканаць, і тут не мае значэння, пісаў або не пісаў работнік адпаведную заяву, — кажа Ірына Шылява. — Але адначасова варта сказаць: перавод на лёгкую працу робіцца з захаваннем за работнікам яго ранейшай сярэдняй зарплаты і да таго ж — незалежна ад нормаў выпрацоўкі.

Кожнаму — сваё

Таксама па-сапраўднаму цікавы выпадак. У арганізацыі праходзіць атэстацыя працоўных месцаў «на шкоднасць». Прычым па яе выніках адным супрацоўнікам вызначаецца дадатковы водпуск працягласцю ў 14, а іншым — у 7 каляндарных дзён.

— Такое насамрэч можа быць, — заўважае Ірына Шыляева. — Як вядома, дадатковы водпуск за шкодныя ўмовы дазваляецца па выніках атэстацыі, прычым яна праводзіцца ў цэлым па арганізацыі і на канкрэтных месцах. Адсюль не выключаецца сітуацыя, калі розная працягласць дадатковага водпуску будзе нават у супрацоўнікаў, якія выконваюць адну работу ў адным будынку, але не ў аднолькавых умовах. Зрэшты, калі з вынікамі атэстацыі работнікі не згодныя, то рашэнне камісіі можна абскардзіць. А пачынаць тут трэба са звароту ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне свайго раёна.

Зарплату вяртаюць праз суд

Адсутнасць у арганізацыі грошай на выплату зарплаты — з'ява ў наш час нярэдкая. Тым не менш некаторыя выпадкі па-сапраўднаму ўражваюць. Са студзеня заробкі вадзіцелю-«дальнабойшчыку» выплачваюць выключна дробнымі часткамі. Прычым з таго часу агульная сума даўгоў работніку наблізілася да 6 мільёнаў рублёў.

— Своечасовасць выплаты зарплаты кантралюецца дзяржаўнай інспекцыяй працы, і, калі факт затрымак пацвердзіцца, наймальніку пагражае адміністрацыйная адказнасць у выглядзе штрафу да 100, а кіраўніку ці яго ўпаўнаважанай асобе — штраф ад 4 да 20 базавых велічынь, — падкрэслівае Ірына Шыляева. — Да слова, у такой сітуацыі сам работнік мае поўнае права звярнуцца ў суд — па вяртанне затрыманых сум з улікам індэксацыі.

Тры зарплаты. Мінімум

З мэтай эканоміі сродкаў арганізацыя мае намер скараціць пасаду дапаможнага рабочага. Што чакае супрацоўніка, які гэту пасаду займае?

— Трэба заўважыць, што ініцыяваць скарачэнне колькасці штату работнікаў наймальнік мае поўнае права, і ніхто не можа паўплываць на яго рашэнне — аднак у такім разе гаворка павінна ісці менавіта аб скарачэнні пасады, а не аб «замене» на ёй аднаго чалавека іншым, — зазначае Ірына Шыляева. — Апроч таго, наймальнік абавязаны выканаць пэўную працэдуру. Перш-наперш — пісьмова папярэдзіць аб будучым скарачэнні за два месяцы, а далей — прапанаваць работніку на працягу тых жа двух месяцаў усе вакансіі, што застаюцца ў арганізацыі. І толькі калі работнік адмовіцца — можна скасоўваць працоўныя адносіны з выплатай 3-месячнага сярэдняга заробку.

Аднак тут жа варта ўзгадаць і яшчэ адзін нюанс. Паводле ўзаемнай дамоўленасці з наймальнікам, работнік можа не заставацца на сваім месцы ўвесь 2-месячны тэрмін папярэджання, а атрымаць кампенсацыю ў памеры свайго сярэдняга заробку прапарцыянальна неадпрацаванаму часу — скажам, за два месяцы, адзін месяц ці за тыдзень. Прычым кампенсацыя за неадпрацаваны тэрмін папярэджання выплачваецца ў дадатак да выплаты з сяэднемесячных зарплат.

Сяргей ГРЫБ.

Нясвіжскі раён.

«Прамая лінія»

ДАПАМОГІ, ПЕНСІІ І ЛЬГОТЫ

Пенсіі і сацыяльныя паслугі, ільготы і адрасная сацыяльная дапамога — пра ўсё гэта мы прапануем пагутарыць з **намеснікам міністра працы і сацыяльнай абароны Валянцінай Вікенцьеўнай КАРАЛЁВАЙ.** «Прамая лінія» пройдзе **3 чэрвеня з 11.00 да 12.30 па рэдакцыйных тэлефонах (8 017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па мінскім нумары 287 17 57.**

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

У АЎТААВАРЫІ ЗАГІНУЛІ СВЯТАРЫ

31 мая ўдзень у Бабруйскім раёне на аўтадарозе «Магілёў-Гомель» адбылася аварыя, у якой загінулі праваслаўныя святары.

У Магілёўскай ДАІ паведамілі, што паблізу вёскі Баяры мікрааўтобус «Фальксваген-Каравэла», якім кіраваў 21-гадовы бабруйчанін, выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся з аўтамабілем «Вольва», які рухаўся ў спадарожным кірунку і паварочваў налева. У выніку аварыі на месцы загінуў вадзіцель і два пасажыры, святары Бабруйскай праваслаўнай епархіі 42 і 25 гадоў. Яшчэ адзін пасажыр, 27-гадовы святар з горада Масты Гродзенскай вобласці, быў дастаўлены ў бальніцу з адкрытай чэрапна-мазгавой і іншымі траўмамі.

Алена КАЗЛОВА.

КВАС З ПАДПОЛЛЯ

У Магілёве раніцай 30 мая на Шклоўскай шашы затрымалі два аўтамабілі, якімі кіравалі два 30-гадовыя жыхары Магілёва. У «Фордзе» і «Мерседэсе» міліцыянеры знайшлі 60 кегаў з квасам без належных дакументаў. Агульная сума грузу — каля 29 мільёнаў рублёў.

У доме, каля якога затрымалі аўтамабілі, далей выявілі нелегальны цэх па вытворчасці квасу з канцэнтрату і разліву яго ў кегі.

Алена КАЗЛОВА.

ТАВАРААБАРОТ БЕЛАРУСІ З УКРАІНАЙ У СТУДЗЕНІ—КРАСАВІКУ — $774 МЛН

Гэта 47 працэнтаў да адпаведнага перыяду 2008 года, паведамілі БЕЛТА ў гандлёва-эканамічнай групе пасольства Беларусі ва Украіне.

Экспарт беларускай прадукцыі склаў $405 млн і перасягнуў імпарт на $35,9 млн. Тавараабарот паміж Беларуссю і Украінай за чатыры месяцы 2008 года перасягаў $1,64 млрд пры дадатным сальда $367 млн.

ПРЫЛЁГ ПАД ТРАКТАРАМ

На полі каля в. Шляхта Кобрынскага раёна пад коламі трактара загінуў беспрацоўны з в. Астромічы. Калі трактарыст крануў з месца МТЗ-80, то не думаў, што пад ім ляжыць чалавек. З цяжкімі траўмамі пацярпелага даставілі ў бальніцу, дзе ён праз некалькі гадзін і памёр.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ВНИМАНИЕ — АУКЦИОН!

МИХАНОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ МИНСКОГО РАЙОНА

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома:

Лот 1 — земельный участок в д. Котяги, площадь земельного участка — 0,1016 га, кадастровый номер 623684203601000192, начальная цена — 17 908 760 бел. руб.

Лот 2 — земельный участок в д. Котяги, площадь земельного участка — 0,1162 га, кадастровый номер 623684203601000193, начальная цена — 20 483 040 бел. руб.

В непосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения.

Аукцион состоится 7 июля 2009 года в 15.00 по адресу: п. Михановичи, пер. Садовый, 8.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 1 июля 2009 года до 17.00 в каб. 7.

Контактные телефоны:
8 017 503 71 00, 8 017 503 83 34.

УНП 600303747.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже складского комплекса, расположенного в Минском районе, промузел «Колодищи» в составе 22 зданий, 9 сооружений, 22 единиц оборудования. Начальная цена с НДС – 16 159 222 787 бел. руб. Площадь земельного участка – 7,9748 га.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 30.05.09. Порядок проведения аукциона и подробный перечень имущества оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.06.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **29.06.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Тел: (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by.

Падпіска-2009

Адданым падпісчыкам — прызы па заслугах

Рэдакцыя газеты «Звязда», як і абяцала, працягвае дастаўляць каштоўныя прызы сваім падпісчыкам. Чарговы выезд быў прызначаны ў Докшыцы, дзе каляровы тэлевізар «Віцязь» зачакаўся жыхар вёскі Рашкаўка Пётр Касцюк.

Каляровы тэлевізар «Віцязь» Пятру КАСЦЮКУ ўручае супрацоўнік аддзела ідэалогіі Докшыцкага райвыканкама Таццяна МОЛЧАН.

Па традыцыі, маршрут паездкі быў вельмі шырокім: да месца правядзення галоўнай сустрэчы ўдалося пабываць на Лагойшчыне, у Смалявічах, Жодзіне, Барысаве. У гутарках з кіраўніцтвам раёнаў і вузлоў паштовай сувязі яшчэ раз пераконваешся, што падпісная кампанія, якая плаўна ўліваецца ў лета — справа нялёгкая. Тым больш, што размовы пра сусветны эканамічны крызіс зараз «у модзе». Але ж асабістыя сустрэчы супрацоўнікаў «Звязды» на месцах далі ўпэўненасць, што беларускамоўнае выданне ў народзе любяць і пры любых абставінах наша газета застанецца запатрабаванай. Пацвярджэннем таму стала сустрэча ў Докшыцкай раённай бібліятэцы, куды мясцовы актыў прыйшоў, каб павіншаваць свайго земляка з набыццём каштоўнага прыза і паўдзельнічаць у Дні падпісчыка.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

НЕМАЎЛЯТЫ-«СПАРТСМЕНЫ»

Забег дзяцей ва ўзросце 8-11 месяцаў прайшоў у сталічным кінатэатры «Перамога» 30-31 мая

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Праўда, забегам гэта назваць цяжка, хутчэй, у кінатэатры быў «запоўз». Васьмі-, дзевяцімесячныя малыя паўзлі на хуткасць дыстанцыю ў пяць метраў. Бацькі ў гэты час дапамагалі ім паўзці, прыцягваючы ўвагу рознымі забаўкамі. У ход ішло ўсё: лялькі, кубікі, абутак і г.д. Але самымі папулярнымі сродкамі сталі... мабільны тэлефон і лічбавы фотаапарат. Дыстанцыю змаглі прайсці далёка не ўсе «спартсмены», хтосьці ўпарта не хацеў нікуды паўзці, нехта зварочваў на сцяжынку суперніка.

— Мы прачыталі пра акцыю ў інтэрнэце, — кажа Надзея, маці траіх дзяцей. — Яшчэ летась ведалі пра яе, аднак узрост у малодшай Дар'і быў непадыходны. Цяпер якраз можам браць удзел. Дзяцей, вядома ж, выхоўваць няпроста. Хацелася б, каб дапамога з боку дзяржавы павялічылася, каб дашкольныя і іншыя ўстановы былі ўважлівымі — на жаль, хамства сустракаецца на кожным кроку...

— Ой, вельмі спадабалася. Мы прыбеглі другімі ў сваім забегу, — дзеліцца ўражаннямі мама Настассі Святлана. — Паболей такіх конкурсаў. У сённяшніх умовах цяжкавата выхоўваць дзяцей. Хацелася б, каб цэны на дзіцячае больш нізкія былі.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 2.06.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 780,00
▲ 1 еўра	3 952,33
1 латвійскі лат	5 573,93
1 літоўскі літ	1 145,07
1 чэшская крона	147,30
1 польскі злоты	889,86
▲ 1 расійскі рубель	90,42
1 украінская грыўня	365,07

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	30,7441
10 UAH	40,3201
1000 BYR	11,0551
EUR	43,4875

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

АЭРОБУС AIR FRANCE ЗНІК

Учора ў другой палове дня супрацоўнікі авіядыспетчарскай службы французскага аэрапорта «Шарль дэ Голь» паведамілі, што страцілі надзею на тое, што самалёт Air France, які вылецеў з Рыа-дэ-Жанэйра, мог ацалець. На борце аэробуса A330-200 знаходзіліся 216 пасажыраў і ад 12 да 15 членаў экіпажа.

АБАМА ЗВАДЗІЎ ЖОНКУ Ў ТЭАТР НА БРАДВЕІ ЗА $72 ТЫС.

Прэзідэнт ЗША Барак Абама ў мінулую суботу выканаў дадзенае падчас перадвыбарнай кампаніі абяцанне сваёй жонцы Мішэль — звадзіў яе на спектакль у тэатр на Брадвеі.

Паводле звестак прэсы, за квіткі ў тэатр Абама заплаціў са сваёй кішэні каля 190 доларaў, але пададаткаплацельшчыкам гэтая рамантычная паездка першай пары Амерыкі абышлася ў 72 тыс. доларaў. Менавіта столькі, паводле інфармацыі The Daily Mail, было выдаткавана на тры самалёты — адзін для сябе і жонкі і яшчэ два, каб пераправіць ахоўнікаў, памагатых і рэпарцёраў з Вашынгтона.

ЕЎРАСАЮЗ АДМОВІЎСЯ ПРЫЗНАЦЬ ВЫБАРЫ Ў ПАЎДНЁВАЙ АСЕЦІІ

Кіраўніцтва Еўрапейскага саюза назвала парламенцкія выбары, якія прайшлі ў Паўднёвай Асеціі 31 мая, нелегітымнымі, паведамляе AFP.

У заяве Чэхіі, якая цяпер старшынствуе ў ЕС, гаворыцца, што Еўропа не прызнае ні легітымнасць выбараў, ні іх вынікі. Як падкрэсліваецца ў заяве, Еўрасаюз зноў выказвае сваю падтрымку суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Грузіі ў рамках міжнародна прызнаных межаў. На выбарах у парламент перамагла прапрэзідэнцкая партыя «Адзінства».

ДВУХ КАНДЫДАТАЎ У ПРЭЗІДЭНТЫ КІРГІЗІІ ЗНЯЛІ З ВЫБАРАЎ ЗА НЯВЕДАННЕ РОДНАЙ МОВЫ

Пра гэта паведамілі ў панядзелак у Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэферэндумаў у рэспубліцы. З заданнем не справіліся бізнэсмен Кутманбек Эшэнбаеў і прапаршчык у адстаўцы Азамат Уламаеў.

СМІ: ЦІМАШЭНКА І ЯНУКОВІЧ ДАМОВІЛІСЯ ПАДЗЯЛІЦЬ УЛАДУ ВА УКРАІНЕ І ЗМЯНІЦЬ КАНСТЫТУЦЫЮ

Проа гэта пішуць украінскія СМІ са спасылкай на дасведчаныя крыніцы.

Калі новая канстытуцыя будзе прынятая, то прэзідэнта Украіны будзе выбіраць не народ, а Вярхоўная Рада, паведамляе NEWSru.ua. Прэзідэнт краіны Віктар Юшчанка ўжо заявіў, што Цімашэнка і Януковіч хочуць падзяліць краіну «на дваіх». Калі названы праект занясуць у парламент Юшчанка мае намер абвясціць усенародны рэферэндум.

Правілы прыёму ў творчыя ВНУ ў гэтым годзе будуць зменены

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 29 мая на сустрэчы з маладымі выканаўцамі, якія ўдзельнічаюць у конкурсе «Новыя галасы Беларусі», паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, у творчыя ВНУ будуць накіраваны спецыялісты, якія адбяруць будучых студэнтаў. Ён нагадаў, што такая практыка актыўна прымянялася гадоў 7-8 таму. «Уводзячы цэнтралізаванае тэсціраванне, вы, рэктары творчых ВНУ, мяне пераканалі, што ні ў якім выпадку ніякага тэсціравання ў вашых ВНУ быць не можа. Я пайшоў у вас на повадзе, вось і атрымаў той вынік, аб якім гавару. Хачу, каб вы зрабілі вывады, каб гэта не скончылася дрэнна».

«Калі пасля гэтага не будуць зроблены нейкія вывады, — прадоўжыў Прэзідэнт, звяртаючыся да рэктараў ВНУ, — і мне яшчэ будуць дакладваць, што для таго, каб паступіць у творчую ВНУ, трэба знайсці ў вас выкладчыкаў, якія будуць рыхтаваць гэтых людзей, тыя будуць ім добра плаціць, а потым прыйдуць да гэтых выкладчыкаў здаваць экзамены ў творчую ВНУ, — то гэта не што іншае як хабар. Скрыты гэта хабар, ці адкрыты, але гэта ёсць у нашым грамадстве, і такая праблема яшчэ раз прагучала за кулісамі гэтага конкурсу».

Гаворачы аб канкурсантах, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што не настойвае, каб іх без экзаменаў узялі ў ВНУ. «Але яны прайшлі ўжо самы жорсткі грамадскі конкурс. Яны ўжо зрабілі першы крок і здалі першы тэст», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы даручыў чыноўнікам вызначыцца, якім чынам будзе прадоўжаны адбор маладых талентаў па ўсіх напрамках, не толькі песеннага мастацтва. Ён нагадаў, што добры прыклад падтрымкі адораных маладых людзей ужо ёсць — Прэзідэнцкі аркестр Рэспублікі Беларусь. «Гледзячы на аркестр, я ганаруся, што ўдалося з гэтай дзетвары стварыць такі ўнікальны ансамбль, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — У іх была адна задача — увасабляць маладую краіну, маладую Беларусь».

Звяртаючыся да ўдзельнікаў конкурсу, кіраўнік дзяржавы выказаў надзею, што яны ўсё ж застануцца на сцэне — нехта на опернай, нехта будзе спяваць на эстрадзе. Ён запэўніў, што калі маладыя таленты будуць старанна працаваць, то заўсёды атрымаюць падтрымку дзяржавы і ў іх заўсёды будзе магчымасць данесці свой пункт погляду да Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка пахваліў вакалістаў, аднак заўважыў, што ім часам, нягледзячы на добры голас, не хапала душэўнасці ў выкананні. «Думаю, што з часам гэта прыйдзе», — дадаў Прэзідэнт.

Беларускай эстрадзе і сцэне наогул патрэбны новыя творчыя людзі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 29 мая на сустрэчы з маладымі выканаўцамі, якія ўдзельнічаюць у конкурсе «Новыя галасы Беларусі».

Аляксандр Лукашэнка выказаў насцярожанасць наконт таго, што дзяржава штогод траціць вялікія грошы на падтрымку таленавітай моладзі, а аддачы не бачыць. «Мы тратім мільярды рублёў у год, існуюць два прэзідэнцкія фонды па падтрымцы адоранай моладзі, праграма «Дзеці Беларусі». У нас ёсць таленавітыя дзеці, а чаму мы тратім вялікія грошы і не бачым добрага «прадукту» на вашым узроўні? Гэта мяне вельмі насцярожвае: укладваем вялікія грошы, а аддачы няма», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Дзеці спяваюць, а як толькі даходзіць да дарослых — з паўфіналу ў фінал не выходзім, яшчэ нейкія праблемы. Чаму так адбываецца?» — задаўся пытаннем Прэзідэнт. Менавіта па гэтай прычыне быў арганізаваны конкурс «Новыя галасы Беларусі». З дапамогай такога творчага спаборніцтва было важна чарговы раз пераканацца, што беларускі народ здольны нараджаць таленты, іх проста трэба знайсці. Аляксандр Лукашэнка адзначыў дастойны ўзровень выступлення маладых выканаўцаў. «Гледзячы на вас, я думаў, што будуць рабіць заўтра нашы «зоркі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Я вельмі рады, што вы разварушылі гэта зарослае цінай дрымотнае царства. Гэта добра, таму што многія нашы так званыя зоркі, ды і палова канкурсантаў, не дацягваюць да патрэбнага ўзроўню».

«Нам трэба ўзварушыць беларускае грамадства па гэтым прыкладзе, пачынаючы ад эканомікі, палітыкі і заканчваючы мастакамі, выканаўцамі і гэтак далей. Думаю, у бліжэйшы час мы разбяромся, і гэта стане добрай падставай ва ўрадзе для прыняцця канкрэтных рашэнняў», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Разам з тым ён выказаў недаўменне, што вымушаны прыходзіць на канцэрты і кантраляваць, у той час як гэтым павінны займацца чыноўнікі, кампазітары, «вялікія артысты, якія сябе лічаць зоркамі». Прэзідэнт нагадаў, што два-тры гады таму ён даручыў кіраўніку канала АНТ Рыгору Кісялю напісаць дзесяць шлягераў. «Я іх не атрымаў. Я чакаю ад вас гэтага рэзультату», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Звяртаючыся да маладых выканаўцаў, кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што іх талент мае патрэбу ў пастаянным развіцці. «Калі вы будзеце працаваць, то з гэтага таленту нешта атрымаецца. Калі вы працаваць не будзеце, то, напэўна, гэта быў ваш першы, самы яркі і апошні канцэрт», — дадаў ён.

Арганізацыі ўсіх формаў уласнасці змогуць фінансаваць праектаванне і будаўніцтва аб'ектаў інфраструктуры

У мэтах забеспячэння апераджальнага будаўніцтва аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры для раёнаў жылой забудовы ўсім арганізацыям незалежна ад формы ўласнасці дазволена ажыццяўляць фінансаванне праектавання і будаўніцтва аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры. Адпаведным указам Прэзідэнта Беларусі № 265 ад 28 мая ўнесены змяненні і дапаўненне ва ўказ ад 7 лютага 2006 года № 72 «Аб мерах па дзяржаўным рэгуляванні адносінаў пры размяшчэнні і арганізацыі будаўніцтва жылых дамоў, аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры». Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Прыватныя арганізацыі, якія маюць адпаведныя ліцэнзіі, змогуць укладаць уласныя сродкі ў будаўніцтва гэтых аб'ектаў. У выніку павялічыцца доля эксплуатуючых арганізацый і зменшыцца нагрузка на бюджэт, будуць забяспечаны роўныя правы суб'ектаў гаспадарання ўсіх формаў уласнасці для ажыццяўлення дзейнасці, паскорыцца працэс будаўніцтва.

Цяпер фінансаванне праектавання і будаўніцтва аб'ектаў інжынернай, транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў (уключаючы сродкі дарожных і іншых дзяржаўных мэтавых бюджэтных фондаў, сродкі ад продажу права арэнды зямельных участкаў і ад продажу такіх участкаў), уласных сродкаў арганізацый, што ўваходзяць у склад Беларускага дзяржаўнага энергетычнага канцэрна, газазабеспячальных арганізацый, якія ўваходзяць у склад Беларускага канцэрна па паліве і газіфікацыі, арганізацый, падпарадкаваных Міністэрству сувязі і інфарматызацыі, Міністэрству транспарту і камунікацый.

Рашэнне аб парадку ўдзелу арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці ў фінансаванні праектавання, будаўніцтва і рэканструкцыі аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры ў раёнах жылой забудовы прымаюцца аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам. Урадам у двухмесячны тэрмін будуць вызначаны парадак праектавання і будаўніцтва аб'ектаў у раёнах сядзібнай жылой забудовы, а таксама парадак фінансавання праектавання, будаўніцтва і рэканструкцыі аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры для раёнаў жылой забудовы. Указ дасць магчымасць больш аператыўна ажыццяўляць фінансаванне будаўніцтва аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры, вырашаць праблему ўводу жылля ў эксплуатацыю, у тым ліку для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Сувязь праз Швецыю

Падчас яе старшынства ў Еўрасаюзе будзе надавацца ўвага адносінам Беларусі і ЕС.

Пра гэта паведаміў Стэфан Эрыксан, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Швецыі ў Беларусі. Швецыя ўжо рыхтуецца прыняць эстафету старшынства ў Чэхіі.

— Падчас старшынства ў Еўрасаюзе самая галоўная задача краіны будзе заключацца ў тым, каб узгадняць пазіцыі 27 краін, а не прасоўваць свае погляды, — адзначыў Стэфан Эрыксан. — Краіны могуць мець розныя прыярытэты. Мы будзем надаваць вялікую ўвагу адносінам Беларусі і ЕС. Ініцыятыва «Усходняга партнёрства» стала праграмай, якая была зацверджана ў Празе. Мы будзем рабіць так, каб ажыццяўляліся нейкія рэальныя дзеянні на карысць супрацоўніцтва Беларусі з Еўрасаюзам. Верагодна, што падчас нашага старшынства будуць палітычныя кантакты, сустрэчы з беларускім бокам.

Акрамя таго, спадар пасол адзначыў, што Беларусь, хоць і не мае доступу да Балтыйскага мора, але гістарычна і геаграфічна з'яўляецца прыбалтыйскай краінай. Таму ў Беларусі ёсць шанцы атрымаць статус назіральніка ў Савеце дзяржаў Балтыйскага мора. Гэтае пытанне можа быць вырашана.

Шведскі дыпламат пракаментаваў таксама і ідэю будаўніцтва нафтаправоду «Паўночны паток» з Расіі ў Еўропу па дне Балтыйскага мора:

— Балтыйскае мора вельмі адчувальнае, дзе ўжо ёсць шэраг экалагічных праблем. Таму адразу была пастаўлена задача — зрабіць экалагічную экспертызу. Але яна пакуль не зроблена, звестак няма. Таму ідэя будаўніцтва нафтаправоду выклікае клопат у шведскага грамадства. Разам з тым у нас існуе разуменне таго, што ўсе краіны павінны вырашаць праблемы энергетыкі. У Швецыі надаецца шмат увагі развіццю альтэрнатыўных крыніц (энергіі ветру, сонца і г. д.). Мы сярод першых краін, якія працуюць паспяхова ў гэтым кірунку.

Супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі можа быць паспяховым і ў турыстычнай сферы. На жаль, шведаў да нас ездзіць пакуль не так шмат. Але спадар Эрыксан меў магчымасць паездзіць па Беларусі і быў уражаны прыродай: ён быў на Браслаўшчыне, на Палессі, у Белавежскай пушчы. Дыпламат лічыць, што у нас ёсць унікальныя прыродныя скарбы, якія могуць быць цікавыя для шведаў. Акрамя таго, шмат цікавага шведы знаходзяць у беларускай культуры — у літаратуры ці музыцы. Беларусы ў культурным супрацоўніцтве са шведскім бокам таксама для сябе шмат адкрываюць: на днях выйшла кніга перакладаў сучаснай шведскай літаратуры на беларускую мову маладых беларускіх перакладчыкаў. Шведскае кіно, дарэчы, мы таксама будзем разумець праз беларускую мову. Адчуем і майстэрства саксафаніста Матса Олафа Густафсана, які ўпершыню будзе іграць у Беларусі джаз па-шведску.

Ларыса ЦІМОШЫК.

НЕМАЎЛЯТЫ-«СПАРТСМЕНЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Арганізатарамі забегу выступілі міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Разуменне», кінатэатр «Перамога» УП «Кінавідэапракат» Мінгарвыканкама і інтэрнэт-партал Rebenok.by.

— Мы вырашылі правесці гэтую акцыю, каб прыцягнуць грамадскую ўвагу ўвогуле да дзяцей, — кажа Юлія Макейчык, менеджар па развіцці МГА «Разуменне». — У аснове акцыі — прасоўванне ідэі па папярэджванні гвалту дзяцей. Мы вядзём прапаганду здаровай і сяброўскай сям'і, дзе на дзіця не шкадуюць ні ўвагі, ні клопату ні любові. Так атрымоўваецца, што сучасныя дарослыя вельмі часта імкнуцца атрымаць, дастаць, здабыць. І адкладваюць стасункі са сваім дзіцем на потым. У выніку атрымоўваецца звычка жыць вось так. Не хапае часу паразмаўляць, і пачынаюцца праблемы ў сям'і. Так што з маленства патрэбна абавязкова знаходзіць час на стасункі, што мы і спрабуем зрабіць сваімі мерапрыемствамі. Сама акцыя праходзіць другі раз. Першы раз яна была ў лістападзе і мела вялікі поспех. Мы атрымалі шмат зваротаў бацькоў з просьбамі паўтарыць мерапрыемства. І вырашылі правесці яшчэ раз.

Забег паўзункоў — адна з вялікіх акцый МГА «Разуменне». На працягу трох дзён аб'яднанне праводзіць розныя мерапрыемствы ў межах кампаніі «Дзеці — гэта мы». Гэта і конкурсы сумесных малюнкаў і танцаў, акцыя «Дэкларацыя бацькоў», дзе яны выказваюць сваё меркаванне на тэму, хто такая мама і хто такі тата. Магчымасць выказацца атрымалі і дзеці. Падчас акцыі «Свабодны мікрафон», якая прайшла першага чэрвеня, дзеці маглі выказаць сваё меркаванне наконт паводзінаў дарослых.

Аб'яднанне плануе запусціць нацыянальную акцыю па папярэджанні гвалту дзяцей у лістападзе.

Настасся ЗАНЬКО. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Калі парадуе лета?

Пачатак чэрвеня будзе халодны, ліпень чакаецца дажджлівы, а жнівень спякотны

Лета на двары. Усе мы пачалі рыхтавацца да адпачынкаў. Аднак кожны з нас спадзяецца бавіць вольны час выключна на прыродзе пад пяшчотным сонейкам і пажадана без дажджоў. Сапраўды дакладны прагноз надвор'я сіноптыкі прапануюць нам не больш чым на тыдзень, а вось наконт таго, што будзе далей, — спраўджваецца не заўсёды...

Цёплае лета

Гэта лета абяцае стаць вельмі цёплым, а ў асобныя дні нават спякотным, паведаміў рэдакцыі **начальнік службы гідраметэапрагнозаў Дзмітрый РАБАЎ**. Прагназуецца, што сярэдняя тэмпература паветра трох месяцаў лета будзе прыкладна на градус вышэйшая за норму, якая складае ад 16 да 19 градусаў. Спецыялісты падлічылі, што за лета ў Беларусі выпадзе каля 250 міліметраў ападкаў, а вось самым дажджлівым месяцам стане ліпень.

Сіноптыкі прагназуюць, што самым спякотным гэтым летам будзе жнівень. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, менавіта ў жніўні на працягу 1—2 тыдняў можа трымацца дзённая тэмпература не ніжэйшая 25—30 градусаў, а ў паўднёвых раёнах гарачыня можа дасягаць і больш за 30—35 градусаў. Разам з тым, сіноптыкі разлічваюць, што нейкіх сур'ёзных ураганаў, вельмі моцных ліўняў або працяглай засухі гэтым летам не будзе.

Прагназуецца камфортны чэрвень, але...

Згодна з доўгатэрміновымі прагнозамі, у чэрвені сярэднямесячная тэмпература чакаецца прыкладна на градус вышэй за норму і складзе 15—17 градусаў. Месячная норма ападкаў мяркуецца ў межах нормы, што адпавядае 69—87 міліметрам.

Падлічана, што ў другой і трэцяй дэкадах чэрвеня тэмпература паветра ўначы складзе 8—15, а ў самыя халодныя ночы 4—7 градусаў, удзень 19—25, у самыя цёплыя дні да 28, а па поўдні краіны і да 30 цяпла. Час ад часу ў другой палове чэрвеня будуць назірацца дажджы, месцамі навальніцы, аднак нейкіх экстрэмальных змяненняў надвор'я не чакаецца.

З сярэдзіны тыдня дажджы, а ў выхадныя ўначы замаразкі

Сёння ў Беларусі захаваецца ўмерана цёплае надвор'е, пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах з навальніцамі, паведаміла рэдакцыі **галоўны сіноптык гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА**. Тэмпература паветра 16—22, на паўднёвым усходзе Беларусі да 25 градусаў.

Пачынаючы з сярэдзіны тыдня, атлантычны цыклон істотна пагоршыць умовы надвор'я. Да пятніцы ўключна чакаецца дождж і ўзмацненне ветру, а тэмпература знізіцца. У чацвер-пятніцу дзённая тэмпература будзе не вышэйшай за 9—16, а ўначы 3—10 градусаў. У гэтыя дні будзе на 4—6 градусаў ніжэй за норму.

У выхадныя атмасферны ціск павялічыцца, аднак месцамі будзе ісці кароткачасовы дождж, часам навальніцы. Тэмпература паветра ўначы ў суботу-нядзелю 2—8 цяпла, на глебе месцамі замаразкі да 0 — мінус 2 градусаў, удзень 12—19, у нядзелю на поўдні краіны да плюс 23.

Сяргей КУРКАЧ.

Бернд ШТАНГЕ:

«РЫХТУЕМСЯ ДА ПАКАЗАЛЬНАГА ВЫСТУПЛЕННЯ...»

6 чэрвеня на стадыёне «Нёман» у Гродне пройдзе адборачны матч да чэмпіянату свету 2010 года нацыянальнай зборнай па футболе. Учора галоўны трэнер каманды Бернд Штанге, а таксама гульцы Ігар Шытаў і Дзмітрый Лянцэвіч адказалі на пытанні журналістаў.

«Гэта будзе спецыфічны матч, бо балельшчыкі чакаюць ад нас толькі перамогі, і любы іншы вынік будзе катастрофай. Бо мы гуляем супраць Андоры. Аднак не трэба забываць, як мы аднойчы згулялі з Люксембургам», — папярэдзіў абаронца Дзмітрый Лянцэвіч. «Мяркую, што ў суперніка будзе 10 гульцоў ззаду, у абароне, і, магчыма, адзін нападаючы. За кошт чаго яны могуць нас перайграць? За кошт стандартаў, контратак», — падзяліўся сваім меркаваннем футбаліст. Ігар Шытаў дадаў, што андорцы могуць стварыць праблемы за кошт сваёй агрэсіўнай манеры гульні. «Са мной дзяліўся ўражаннямі Віталь Булыга, які гуляў супраць Андоры. Ён расказаў, што футбалісты не грэбуюць брудным прыёмамі, — штурхаюцца, шчыплюцца...»

Бернд Штанге, для якога гэта, дарэчы, будзе соты матч у ролі рулявога нацыянальных зборных (дагэтуль ён трэніраваў нацыянальныя каманды ГДР, Ірака, Амана) зазначыў, што іншага выніку, як перамога, для яго і каманды ў гэтым матчы не існуе. Ён назваў выдатнымі абставінамі той факт, што гульня пройдзе ў Гродне. «Усе білеты былі хутка прададзены, і мы чакаем выдатнай атмасферы на стадыёне. У Гродне адметныя ўмовы : добрае поле, дагледжаны газон, выдатныя ўмовы пражывання. Жыць, праўда, мы будзем ізалявана і сканцэнтруемся на падрыхтоўцы да матча. Адзіная праблема — доўгі шлях на аўтобусе, аднак гульцы да гэтага прызвычаіліся. Мы дакладна ведаем, што павінны выйграць. Вельмі важна ўсе гульні супраць Андоры і Казахстана выйграць, калі мы хочам мець шанц ісці далей». Паводле слоў трэнера, у камандзе сабраныя футбалісты, якія на сёння могуць гарантаваць перамогу. Хоць страт не ўдалося пазбегнуць цалкам — у складзе адсутнічаюць трое вопытных футбалістаў: Аляксандр Кульчы — з-за перабору жоўтых картак, Віталь Кутузаў і Віталь Булыга — з-за траўмаў. «Але мы аптымістычна настроены і рыхтуемся да добрага паказальнага выступлення перад поўным стадыёнам», — падзяліўся Бернд Штанге.

Усе гэтыя дні ў Мінску і Гродне каманда будзе трэніравацца, і трэніроўкі будуць адкрытымі. 3 чэрвеня — у 18.30 на мінскім стадыёне «Дынама», 5 чэрвеня ў 18.00 ў Гродне на стадыёне «Нёман» усе аматары футбола змогуць атрымаць аўтаграмныя карткі гульцоў, паразмаўляць і сфатаграфавацца з футбалістамі. Таксама ў Гродне каманда наведае адзін з дамоў для дзяцей-сірот. «Мы па традыцыі праводзім шэраг мерапрыемстваў для таго, каб зменшыць адлегласць паміж намі і балельшчыкамі», — растлумачыў галоўны трэнер зборнай.

10 чэрвеня нацыянальная зборная правядзе таварыскі матч супраць каманды Малдовы, ён пройдзе на гарадскім стадыёне Барысава. Галоўны трэнер растлумачыў выбар суперніка. «У гэты перыяд цяжка знайсці суперніка — у Еўропе скончаны сезон, і гульцы ў адпачынку. Таму мы гуляем не з Бразіліяй і не з Францыяй, а з Малдовай. 10 чэрвеня — дзень ФІФА, і мы не можам яго прапускаць. Мы прапусцілі 11 лютага, і атрымалі за гэта шквал крытыкі. Да таго ж, каманды, якія не гуляюць, аўтаматычна апускаюцца ў рэйтынгу. Мы хочам паказаць добрую гульню і выйграць, але пакуль усе сканцэнтраваныя на матчы з Андорай», — заявіў галоўны трэнер. Бернд Штанге паведаміў, што Аляксандр Кульчы запрошаны на матч з Малдовай і гулец даў згоду прыехаць. «Я тыдзень таму быў у Маскве, сустракаўся з футбалістам, і мне вельмі прыемна, што Кульчы сказаў свайму трэнеру ў клубе, што ён хоча згуляць за сваю краіну.» Пасля матча з Андорай Бернд Штанге вызначыцца, хто з гульцоў моладзевай каманды, выкліканых зараз у нацыянальную, застанецца на матч з Малдовай, а хто паедзе рыхтавацца да чэмпіянату Еўропы ў Штутгарт. Пракаментаваць сітуацыю наконт выбару клуба Аляксандрам Глебам галоўны трэнер зборнай адмовіўся. «Федэрацыя не ўмешваецца ў справы гульцоў і клубаў. Гэта вырашаць самім футбалістам. І мне зараз складана сказаць, што сёння для нашага капітана было б лепей — заставацца ў «Барселоне» ці ісці ў іншы клуб».

Галоўны трэнер зборнай прысутнічаў на фінальным матчы розыгрышу Кубка Беларусі паміж наваполацкім «Нафтанам» і салігорскім «Шахцёрам» і падзяліўся сваімі ўражаннямі. У прыватнасці ён заўважыў, што гульня атрымалася напружанай, добра арганізаванай, гульцы згулялі ветліва і выглядалі добра падрыхтаванымі. «Аднак атмасфера была не такая, якой павінна быць на вялікім стадыёне, і тут ёсць над чым працаваць. Узровень каманды пакуль не той, каб на роўных выглядаць з камандамі ў Лізе Еўропы ці Лізе чэмпіёнаў. Але ў мяне няма падстаў крытыкаваць «Нафтан». Калі мы паедзем у Наваполацк і паглядзім, у якіх умовах трэніруецца каманда, мы зразумеем, колькі яшчэ трэба зрабіць. Камандзе складана будзе прайсці першы раўнд», — даў сваю ацэнку нямецкі спецыяліст. «Але маладыя гульцы паказалі выдатную гульню. Калі Верхаўцоў так адрэагаваў на маю крытыку, то гэта вельмі добры вынік. Рудзік добра згуляў, ён вельмі хутка прагрэсуе. Такія гульцы, якія хочуць выйграваць, патрэбныя нацыянальнай камандзе».

Алена АЎЧЫННІКАВА.

Абзац

◢ Сяргей Багдашоў, які ў мінулую пятніцу завалодаў зброяй канваіра і ўцёк з будынка суда ў Жодзіне, аб'яўлены ў рэспубліканскі вышук.

◢ Стаўка экспартнай пошліны на нафту ў Беларусі з 1 чэрвеня павышана да $152,8 за тону. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове ўрада № 690.

◢ «Белавія» працягвае зніжаць цэны. Так, кошт білета Мінск—Сочы стаў меншым на 31 еўра: мінімальны тарыф туды-назад без збораў аэрапортаў складае 199 еўра. Для набыцця білета па мінімальным кошце неабходна яго выкупіць на працягу 24 гадзін пасля браніравання. Акцыя будзе дзейнічаць па 10 ліпеня г.г.

◢ Спецыялісты з Гарвардскага ўніверсітэта зрабілі выснову, што гнеў і раздражняльнасць прыводзяць да парушэння гарманальных працэсаў, зніжаюць імунітэт і ў канчатковым выніку становяцца прычынай пашкоджання тканак унутраных органаў. Даследаванне грунтуецца на эксперыменце, у якім прынялі ўдзел 670 мужчын ва ўзросце ад 45 да 86 гадоў. Праверкі, якія вяліся 8 гадоў, паказалі, што ў недружалюбных мужчын знос лёгкіх адбываецца хутчэй, чым у добразычлівых і спакойных. Азлобленасць і раздражняльнасць прыводзяць таксама да хваробаў сэрца, астмы, гіпертаніі і іншых недамаганняў.

Поўны абзац

◢ У пацыента, які прымаў прэпарат для лячэння раку, зніклі адбіткі пальцаў. З-за іх адсутнасці ён быў затрыманы на некалькі гадзін пры спробе ўезду ў ЗША. 62-гадовы хворы прымаў прэпарат, які быў прызначаны яму пасля хіміятэрапіі. Адным з пабочных дзеянняў прэпарату з'яўляецца запаленне далоняў і ступняў. З цягам часу гэта прыводзіць да змяненняў малюнка адбіткаў пальцаў. Пацыента не папярэдзілі пра гэты эфект, што і прывяло да інцыдэнту на мяжы. У такіх выпадках спецыялісты рэкамендуюць мець пры сабе дакумент, у якім тлумачацца ўсе нюансы праблемы.

◢ Паказальны судовы працэс адбыўся нядаўна ў ЗША. Кампанія-працадаўца павінна выплаціць супрацоўніку 17,5 млн долараў за знішчаныя файлы на цвёрдым дыску. Кампанія наняла Дэлена Трылафа ў 1995 годзе і паставіла перад ім задачу развіцця продажаў па ўсёй тэрыторыі ЗША. Пры гэтым кампанія не выдала яму нават службовага ноўтбука. На ўласным камп'ютары супрацоўнік выбудаваў сетку продажаў у 11 штатах і напісаў уласную праграму для ўліку руху тавараў. Яму абяцалі кар'ерны рост і павышэнне заробку, але "потым". Калі спадзяванні на "потым" скончыліся, супрацоўнік пачаў шукаць новую працу. Прэзідэнт кампаніі вырашыў, што ён можа забраць з сабой і сакрэтныя звесткі, а таму скраў ноўтбук і знішчыў на ім усю інфармацыю. Трылаф падаў у суд, які і прыняў рашэнне на яго карысць. Памылка кампаніі, якая не выдала свайму супрацоўніку ноўтбук і не заключыла з ім дамовы аб нераспаўсюджанні звестак, каштавала ёй 17,5 млн долараў.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

АГУЧАНЫ НАМІНАНТЫ НА СУІСКАННЕ ПРЭМІІ САЮЗНАЙ ДЗЯРЖАВЫ Ў ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

Экспертны савет па прысуджэнні прэмій Саюзнай дзяржавы зацвердзіў на пасяджэнні ў Мінску намінантаў на суісканне прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва за 2009-2010 гады. Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі першы намеснік міністра культуры Беларусі Уладзімір Рылатка.

На суісканне прэміі вылучаны серыя работ «Палітра майго часу» народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва, раманы «Вам — заданні» і «Сыны» старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца, помнікі Янку Купалу ў Маскве і Аляксандру Пушкіну ў Мінску, аўтарам якіх з'яўляецца творчы калектыў архітэктара Юрыя Грыгор'ева, скульптараў Льва і Сяргея Гумілеўскіх, скульптараў Юрыя Арэхава (пасмяротна) і Рыгора Арэхава, а таксама цыкл жывапісных карцін «Родная зямля» народных мастакоў СССР Аляксея і Сяргея Ткачовых.

БЕЛТА.

П'ЯНЫЯ КІРОЎЦЫ НАРАБІЛІ БЯДЫ

У нядзелю ў Мінску па віне п'яных кіроўцаў у дарожна-транспартных здарэннях загінулі і пацярпелі людзі.

Паводле звестак аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, буйное ДТЗ каля сямі гадзін вечара было зафіксавана на праспекце Любімава. 38-гадовы кіроўца, які сеў за руль «Мерседэса-Бенц» п'яным, выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з аўтамабілямі «Мазда» і «Волга». У гэтым здарэнні загінуў вадзіцель «Мазды», мужчына 1980 года нараджэння, а яго пасажыры — дзяўчына, якая нарадзілася ў 1988 годзе, і хлопец 1981 года нараджэння — у цяжкім стане былі шпіталізаваныя ў бальніцу. Дасталося і кіроўцу аўтамашыны «Волга», які таксама быў шпіталізаваны з ЧМТ лёгкай ступені і пераломам рэбраў.

А праз тры гадзіны на вуліцы Даўгабродскай 24-гадовы кіроўца, які прыняў чарку, на «Хондзе Цывік» учыніў наезд на жанчыну 1971 года нараджэння і мужчыну 1961 года нараджэння, якія пераходзілі дарогу па нерэгуляваным пешаходным пераходзе. У выніку гэтага здарэння жанчына загінула, а мужчына з цяжкай траўмай дастаўлены ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

У СВІСЛАЧЫ ПАТАНУЛІ БРАТ І СЯСТРА, САСКОЧЫЎШЫ З МОСТА

Як паведаміў начальнік вадалазна-выратавальнай службы Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага таварыства ратавання на водах Іван Масквічоў, трагедыя адбылася ўначы 30 мая. Нецвярозы 25-гадовы хлопец, паспрачаўшыся з таварышамі, вырашыў саскочыць з моста ў раку Свіслач насупраць дома № 25 па вуліцы Янкі Купалы. Следам за ім у раку скокнула і яго 21-гадовая сястра. Абодва патанулі. Адзначым, што ў Мінску з пачатку года ўжо патанулі 14 чалавек.

Андрэй ШМЫГІН, «Мінск—Навіны».

БЫЛА Б ПЕНА — ЗАСТАЛІСЯ Б ВОКНЫ

У міліцыю звярнуўся жыхар Кобрына, якога абакралі невядомыя. У доме, які будуецца, мужчына ўсталяваў чатыры акны з ПВХ, але не замацаваў іх спецыяльнай пенай. Раніцой гаспадар убачыў, што воконы зніклі. Зладзеі прыхапілі яшчэ і электрадрыль.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Размаўляеш па-беларуску? Будзь юрыдычна падкаваным!

Юрыдычную школу «Ведаем свае правы» адкрывае Мінская гарадская арганізацыя ГА «Таварыства беларускай мовы». Яна прызначана для тых грамадзян, якія хочуць адстойваць сваё права паўнавартасна выкарыстоўваць у жыцці беларускую мову, але не ведаюць, як гэта рабіць граматна, у адпаведнасці з дзейным заканадаўствам. Напрыклад, як дабіцца выхавання дзіцяці ў беларускамоўных садку і школцы, ці як атрымаць адказ ад чыноўнікаў па-беларуску.

Юрыдычная школа будзе складацца з двух этапаў — тэарэтычнага, на якім юрысты раскажуць тонкасці заканадаўства ў сферы рэгулявання моваў, і практычнага, на якім будуць прааналізаваныя жыццёвыя сітуацыі парушэнняў права выкарыстоўваць беларускую мову. Там жа слухачоў курсаў навучаць, як правільна пісаць звароты, лісты і скаргі ў абарону сваіх правоў. Напрыканцы арганізатары плануюць правесці «круглы стол» «Нашы прапановы па паляпшэнні заканадаўства Рэспублікі Беларусь адносна функцыянавання дзяржаўнай беларускай мовы». Першы занятак пройдзе сёння, 2 чэрвеня, а 19-й гадзіне на сядзібе «Таварыства беларускай мовы» (Мінск, вул. Румянцава,13). Усе семінары і навучанне — цалкам бясплатныя. Не бяда, калі прапусціце першы занятак — семінары будуць праходзіць кожны аўторак (тэарэтычныя — да пачатку ліпеня, практычная — да верасня).

Павел БЕРАСНЕЎ.

Ну і ну!

ВЫЙГРАЎ, А З ЖОНКАЙ НЕ ПАДЗЯЛІЎСЯ, АБО ЯК МУЖ І ЖОНКА ПРАЗ СУД ДЗЯЛІЛІ ГРОШЫ ЗА ВЫЙГРАНЫ АЎТАМАБІЛЬ

Сяргей Пятровіч (імя і імя па бацьку зменены), жыхар гарадскога пасёлка, што ў Віцебскім раёне, у красавіку мінулага года выйграў у латарэю «Суперлато» дарагую аўтамашыну «Таёта». Прадаў. А з жонкай грашыма падзяліцца не захацеў. Яна, зразумела, пакрыўдзілася. Доўга патрабавала палову «шалёных» грошай. Урэшце па дапамогу звярнулася ў суд.

На думку Надзеі Пятроўны (назавём гэтую жанчыну так), паколькі ў мужа і жонкі па закону ўсё агульнае, хай ён і падзеліцца: «За сямейныя ж, агульныя, грошы купіў той самы шчаслівы білет. А зарплата, маўляў, у мяне зусім маленькая — медсястра я...»

Праўда, калі менавіта ён купіў той білет і дзе — жонка дакладна не ведала, блыталася ў сваіх паказаннях. Няўжо трэба за кожную пакупку рабіць справаздачу? Сяргей Пятровіч на судзе расказаў, што той самы шчаслівы білет і яшчэ два білеты названай латарэі падарыла ягоная... каханка. Яна часта купляе білеты. А ў той дзень ён, ягоны брат і каханка гулялі ў Віцебску па праспекце Фрунзэ, яна купіла тры білеты, якія яму і падарыла. Маўляў, на ўдачу табе, каханы, ад усёй душы.

На судзе няшчасная афіцыйная жонка настойліва патрабавала, каб дапамаглі падзяліць грошы за выйгрышную машыну, а гэта даволі вялікая сума — больш як 67 мільёнаў рублёў. Муж расказваў у судзе, што ён у падарунак атрымаў білет ужо праз два месяцы пасля таго, як пайшоў з сям'і... Як расказаў карэспандэнту «Звязды» старшы памочнік пракурора Кастрычніцкага раёна Віцебска Андрэй Козікаў, суд, уважліва вывучыўшы усе акалічнасці (нават рэалізатара білетаў запрасілі на пасяджэнне), пастанавіў, што шчасліўчык не абавязаны дзяліцца выйгрышнымі грашыма. Нават калі муж і жонка афіцыйна ў шлюбе, падарункі, або атрымананае нешта ў спадчыну, з'яўляецца прыватнай уласнасцю аднаго з іх...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

БУСЛОЎ МАЛА, А ДЗЯЦЕЙ БАГАТА

Дэмаграфічная сітуацыя на Брэстчыне вядомая — у сельскай мясцовасці смяротнасць перавышае нараджальнасць. Гэта — у цэлым, але ў вобласці ёсць раён, дзе сітуацыя з нараджэннем дзяцей іншая. На Століншчыне дзіцячыя садкі не зачыняюцца, а, наадварот, будуюцца. У некаторых населеных пунктах (горадзе Давыд-Гарадок, вёсках Альшаны, Белаўша, Глінка, Кародзічы, Лядзец) у дзіцячыя садкі існуе чарга. Прыемная нечаканасць.

Наведаўшы Альшаны, я даведаўся, што гэтая вёска знакамітая не толькі цяпліцамі. Галоўнае багацце тут — дзеці. Крыху статыстыкі. У Столінскім раёне 1980 шматдзетных сем'яў і 459 з іх пражываюць на тэрыторыі Альшанскага сельсавета, нават у райцэнтры іх толькі 119.

У Альшанах больш шасцідзесяці жанчын узнагароджаны ордэнам Маці. І ўжо запланавана тут узвесці садок-школу на 471 месца. А мясцовую сярэднюю школу знешне можна параўнаць з універсітэцкім вучэбным корпусам. Штогод тут адчыняюць дзверы 7-8 першых класаў, а бывала і адзінаццаць. У школе займаюцца 1700 вучняў — лічба салідная і для іншага райцэнтра.

У сельсавеце я сустрэўся з 33-гадовай маладзіцай. Марыя Клачко гадуе шасцярых дзяцей, яна адна з самых маладых вясковых маці, якія ўзнагароджаны адпаведным ордэнам.

Жанчына запрасіла да сябе і пазнаёміла са сваёй свякроўю — Ганнай Міхайлаўнай. І хаця ў свекрыві толькі чацвёра дзяцей — затое 22 унукі. Як бачым, усе сем'і шматдзетныя, у дачкі Ганны Міхайлаўны Ларысы толькі чацвёра, а ў сыноў — ад 5 да 7 дзяцей.

Але вернемся да размовы з Марыяй, якая лічыць, што ёй наракаць на лёс не даводзіцца — у сям'і панядрак і любоў. Убачыўшы, як старэйшыя (тыя, хто не быў у школе) няньчацца з немаўляткам, разумееш, што гэта сапраўды так.

Усё добра ў сям'і Клачко.

Напэўна, сям'я шчаслівая і таму, што ў доме дастатак. Катэдж адбудаваны з густам і размахам. Пры доме вялікая цяпліца (а як без яе ў Альшанах?), але ўсё трымаецца на гаспадары, які цягне лямку прадпрымальніка. Ганна Міхайлаўна ўсё ж не стрымалася і сказала, што найбольшае багацце — дзеці, а не матэрыяльны прыбытак. Можна з гэтым пагадзіцца, толькі добра, калі дзеці дагледжаныя і ведаюць бацькоўскую ласку.

На Палессі існуе няпісаны закон, а ў Альшанах пра яго мне сказалі некалькі разоў. Калі дачку выдаюць замуж, то ў пасаг даюць дом ці катэдж. Давялося засумнявацца, бо не ўсе ж жывуць заможна, каб за дачкой аддаваць і дом. Яшчэ невядома, як у маладых жыццё складзецца. А калі тых дачок некалькі?

Бывае і так, але агульная тэндэнцыя менавіта такая — дачка павінна жыць у сваім доме. А наконт жыцця, калі яно ў маладых дасць збой, тут усё проста. Палешукі — народ прагматычны: пасаг афармляецца падарункам, і былы муж на дом прэтэндаваць не можа. Бяры ў дом — і жыві, як хочаш.

Ёсць і яшчэ адна асаблівасць. Альшаны — вялікае сяло, і ў ім шмат дзяцей. Але ў Альшанах штосьці бусляк не давялося пабачыць, хоць яны, напэўна ж, ёсць. Праўда, тыя, у каго многа дзяцей, у гэта не вераць. І тут можна раскрыць тайну альшанскага феномена. Калі абысці гэтую тайну, то ў чытача ўзнікне пытанне: у чым прычына высокай нараджальнасці?

Усе хрысціянскія канфесіі асуджаюць штучнае перарыванне цяжарнасці. Праваслаўная, каталіцкая і пратэстанцкая цэрквы выступаюць супраць абортаў, і ў жыцці — найперш вернікі, якія належаць да апошняй, — прытрымліваюцца гэтай устаноўкі. Дык вось, у Альшанах пераважная большасць шматдзетных сем'яў — гэта пратэстанты.

І хоць ад многіх з іх даводзілася чуць, што на гэтым свеце чалавек толькі госць, але тым не менш на зямлі гэтыя людзі стаяць моцна.

— Ужо тое, што яны не п'юць гарэлкі, сёння з'яўляецца вялікім плюсам, — кажа старшыня мясцовага кааператыва Іван Антановіч, — хоць стараюцца працаваць, найперш, на сябе. У прынцыпе, так і павінна быць — чалавек свае праблемы вырашае сам.

Нагадаю, што ў СВК з 615 работнікаў — 300 жанчын знаходзіцца ў дэкрэце...

Мне як чалавеку, пазбаўленаму ўсякіх рэлігійных ілюзій, было не цікава, да якой разнавіднасці пратэстанцкай царквы належыць абшчына ў Альшанах, але я зразумеў, што мясцовая ўлада добра да іх ставіцца. Ды і ў сям'і Марыі Клачко ўспаміналі школьных педагогаў добрым словам і лічаць, што ўлада — ад Бога.

Калі законапаслухмяны чалавек нараджае дзяцей, выхоўвае іх, шмат працуе, каб мець прыстойны дом і заможна жыць, то тут не важныя яго нацыянальнасць і веравызнанне — галоўнае, што ён грамадзянін Беларусі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ, фота аўтара.

Столінскі раён.

Нявесты натхнілі Магілёў

Фота Ксеніі ЛУЧКОВАЙ.

У нядзелю ў Магілёве ўпершыню адбыўся парад нявест.

— Ідэя проста вітала ў паветры, — прызналася арганізатар парада фатограф Ксенія Лучкова. — Падобныя парады праходзяць у Маскве, на Украіне. Цяпер гэта прыгожая падзея адбылася і ў нас.

У парадзе бралі ўдзел 34 нявесты ўзростам ад 17-ці да 34-х гадоў. Яны ўдзень прыехалі на плошчу Зорак у абласным цэнтры, дзе іх сустрэў натоўп цікаўных магіляўчан.

Маладыя жанчыны ў белым убранні прыгожым строем прайшлі па пешаходнай Ленінскай вуліцы ў суправаджэнні народу. Шэсць мужчын-сек'юрыці дбалі пра бяспеку ўдзельніц парада.

Праўда, галоўным клопатам сталі не дакучлівыя паклоннікі, а туфлі для ўрачыстасці. На вялікіх абцасах цяжка хадзіць па брусчатніку: гаворыць, бедныя ногі нявестаў былі ў мазалях, але болю яны не адчувалі, бо былі шчаслівыя ад увагі людзей.

Калі казаць праўду, то толькі каля паловы ўдзельніц парада — нявесты сапраўдныя, якія будуць браць шлюб найбліжэйшым часам. Для іх у нядзелю адбылася генеральная рэпетыцыя вяселля: самым вялікім адкрыццём стала тое, што ў зашнураваным гарсэце цяжка рухацца і зусім немагчыма нахіліцца. Іншыя ўдзельніцы парада — мадэлі, якія ўразілі публіку сваёй прыгажосцю і грацыяй.

Каля фантана ў гарадскім скверы пасля парада адбыліся конкурсы для нявест. Маладыя жанчыны спаборнічалі — хто далей кіне букет, хто хутчэй завяжа гальштук мужчыну і хто выявіць больш фантазіі ў ролі Папялушкі. У апошнім конкурсе трэба было танцаваць на крэсле, нібыта ў нявесты ўжо скралі туфельку.

Жанчыны атрымаюць свой галоўны прыз — бясплатныя фотасесіі. Сама 24-гадовая фотамастачка, дарэчы, нявестай была ўжо тройчы! І нарэшце знайшла сваё шчасце ў шлюбе з каханым мужчынам. Ксенія гадуе маленькага сына і прыдумляе новыя творчыя праекты.

Ілона ІВАНОВА.

НІ ХВАСТА, НІ ЛУСКІ

Сярод рыбалоўных клубаў Беларусі на дамбе Дуброўскага вадасховішча прайшоў 1 этап Чэмпіянату краіны па спартыўнай лоўлі фідэрам, у якім узялі ўдзел восем камандаў з Бабруйска, Гомеля, Магілёва і Мінска.

У асабістым заліку перамогу атрымаў Аляксандр Волкаў з каманды «FishProfi», які за сем гадзін злавіў 2690 грамаў рыбы. Гэта ж каманда атрымала і першае месца, злавіўшы чатыры з паловай кілаграмы рыбы. Арганізатарамі конкурсу выступілі грамадскае аб'яднанне «Брык» і Федэрацыя рыбалоўнага спорту. Фінал Чэмпіянату пройдзе ў верасні.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

Беларуская экзотыка на палотнах мастакоў

У Магілёўскім мастацкім музеі імя Паўла Масленнікава адкрылася выніковая выстава XIV Міжнароднага пленэру «Вобраз Радзімы ў выяўленчым мастацтве».

Выстаўлена 90 работ: па тры карціны ад кожнага мастака, дзве з іх падараваны ў калекцыю і адну купіў музей. Сёлета вобраз Беларусі малявалі прадстаўнікі 9 краін — Польшчы, Ізраіля, Арменіі, Чарнагорыі, Сербіі і іншых. Яны 20 дзён працавалі ў Бабруйскім, Кіраўскім і Асіповіцкім раёнах.

— Мы пашырылі мастацкія межы пленэру, — расказала намеснік дырэктара музея Святлана Строгіна. — Разам з традыцыйнымі пейзажамі з'явілася, напрыклад, канцэптуальнае мастацтва, якое цяпер вельмі папулярнае ў Еўропе.

Карціны Мячыслава Скалімоўскага — сапраўды як свежы вецер на выставе. Польскі мастак прыехаў з Бяла-Падляскі. Ён — прафесар жывапісу, кіраўнік мастацкай галерэі. Незвычайная манера, яркія фарбы, сваё бачанне свету, незашораны погляд на жыццё.

Польскі мастак Мячыслаў СКАЛІМОЎСКІ: «Я адлюстроўваў натуральную, народную, простую эстэтыку жыцця беларусаў».

З карціны глядзіць сіні страус з чырвонай дзюбай, і пытанне: «Хто гэта?» На звычайным тратуары мастак убачыў рознакаляровыя каменьчыкі, і яны склаліся ў незвычайна прыгожую кампазіцыю на палатне.

А вось раённы цэнтр Кіраўск: шмат роўных дрэў, ярка-зялёная майская трава і ўдалечыні — помнік.

— Гэта Кіраў, які стаіць на цэнтральнай плошчы горада, — тлумачыць пан Мячыслаў. — Жыццё навокал ідзе, а ён стаіць — штодня і шмат гадоў. Напэўна, яму сумна. Што ён думае пра нас? Увогуле я хадзіў па гэтым горадзе і бачыў, што гэта нешта зусім іншае, непадобнае на нас. Вялізныя надпісы на схілах пра Беларусь, пафарбаваныя камяні з заклікамі берагчы прыроду. Экзотыка!

Польскага мастака моцна ўразіў парк у цэнтры Кіраўска, дзе ўсе ствалы дрэў вельмі роўненька пабеленыя. Ён вырашыў, што гэта эстэтычная патрэба тутэйшых людзей.

— Гэта зусім не кіч: у сваіх карцінах я паспрабаваў выказаць натуральную, народную, простую эстэтыку жыцця беларусаў, — пракаментаваў Скалімоўскі. — А людзі тут такія ж, як і мы: шчырыя і адкрытыя.

Кожны з наведвальнікаў выставы меў свае сімпатыі. Многія аддавалі перавагу традыцыйным вясковым пейзажам. Публіка актыўна абмяркоўвала партрэты акцёраў Магілёўскага драматычнага тэатра, зробленыя ў поўны рост у сцэнічных строях. Многім спадабаліся работы мастака з Чарнагорыі Драгалюба Браёвіча: чыстыя фарбы і наіўная манера ствараюць светлае прыемнае ўражанне.

Юных мастачак з Магілёўскага каледжа культуры зацікавіў незвычайны каларыт неба (тэрыторыя прыбраная, ёсць прыбіральня, месца для вогнішча, мангалы, утульныя альтанкі).

І калі ў летні час мясцовыя зоны адпачынку пакуль не могуць задаволіць месцамі ўсіх ахвотных, дык у халоднае надвор'е адваротная карціна, многія нумары прастойваюць. На думку кіраўніцтва нацпарку, вырашыць гэту праблему дапамагло б будаўніцтва ў раёне санаторыя, тым больш, што на Браслаўшчыне ёсць унікальныя серавадародныя воды і гразі, якія дапамагаюць пры лячэнні органаў стрававання і рухальнага апарата. Да мясцовых крынічак з серавадароднай вадой пастаянна ідуць людзі. Напрыклад, адна з іх — Акменіца — размясцілася ля гары Маяк. Кажуць, што вада ў ёй дапамагае не толькі лячыць хваробы, але і прыдае жанчынам прыгажосці, а мужчынам — сілы. Усе навакольныя дрэвы абвязаны разнастайнымі стужкамі — гэта падзяка за жывую вадзіцу. З крыніцай звязана некалькі легендаў, па адной з іх раней тут расла вялікая елка, і мясцовыя жыхары, каб даведацца, адкуль яна бярэ сілы, ссеклі яе, ля каранёў знайшлі выдатную ваду. На другой — быццам бы па зямлі ішоў бог са жбаном вады, дзе вада пралівалася, утвараліся азёры і рэкі. А ў гэтых мясцінах ён прыпыніўся адпачыць, вада са жбана разлілася і з таго часу тут б'е крыніца.

Браслаўшчына мяжуе з Латвіяй і Літвой. Спрашчэнне афармлення і перасоўвання на памежнай тэрыторыі ў 50-кілометровай зоне таксама сыграла б на развіццё турызму. Сюды часцей сталі б прыязджаць не толькі сваякі і сябры беларусаў, што жывуць у суседніх краінах, але і замежнікі, што наведваюць Літву і Латвію.

Беларускі мастак Віктар Альшэўскі намаляваў вобраз малой радзімы ў жамчужным аздабленні.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Аляксандра Захаранкі.

Маладыя людзі вельмі прасунутага выгляду актыўна цікавіліся творамі мінскага мастака Віктара Альшэўскага. Сам ён, дарэчы, ураджэнец Магілёўшчыны. Малая радзіма мастака — вёска ў Бялыніцкім раёне, і гэта непадалёк ад мясцінаў, звязаных з імем Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Іх Альшэўскі і адлюстраваў у арыгінальнай манеры на сваіх палотнах.

— Я намаляваў дарогу да Крынак і мелодыю цішыні на пагорку, дзе калісьці стаяў дом вядомага мастака, — паказваў Віктар Уладзіміравіч. — А гэта рака Друць набірае моц, бо Бялыніцкі-Біруля — гэта вялікая духоўная з'ява. І ўсе мілыя вобразы малой радзімы я аздобіў жэмчугам. Таму што зямля Магілёўская — гэта сапраўдная жамчужына.

Сам Альшэўскі адзначыў на выставе працы сербскай мастачкі, жонкі пасла Сербіі ў Беларусі Веры Джукіч. Многім прыйшоўся даспадобы яе нацюрморт.

— Гэта шчыры твор, дзе жаданне дае больш жывы імпульс, чым некаторыя вялізныя прафесійныя палотны, — лічыць беларускі мастак.

У калекцыі Магілёўскага мастацкага музея сёння каля тысячы карцін, якія напісаны ўдзельнікамі міжнароднага пленэру за ўсе гады.

— Я ўбачыў на выставе ўзоры вялікага мастацтва, — сказаў на новай выставе намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама і старшыня арганізацыйнага камітэта Валерый Малашка. — Розныя мастакі і краіны, разнастайныя тэхнікі і настроі. Але ўсё зроблена з любоўю да нашай краіны і беларускай зямлі.

Ілона ІВАНОВА.

Простыя рэчы

КУЛЯ

Куля — знешне і простая рэч, свінцовы кавалачак з абалонкай альбо без яе. Вось прызначэнне яе своеасаблівае. Калі гэта куля прызначаецца для палявання на якую-небудзь жывёліну ў лесе ці на полі — адно. А калі яна прызначаецца для паражэння чалавека ў ваенных дзеяннях — іншае. Хаця скажу шчыра: ні палявання, ні тым больш чалавеказабойства не прызнаю ні ў якім разе. Я не пацыфіст, але прыроджана адчуваю, што стрэліць у чалавека — гэта вялікі грэх. І апраўданы ён можа быць толькі самазахаваннем, захаваннем жыцця іншых людзей.

А вось з кулямі ў жыцці давялося сустракацца не адзін раз. Вайсковую службу я праходзіў у мотастралковай часці. Там падчас вучэнняў нам выдавалася на аўтамат тры магазіны з трыццацю патронамі ў кожным, на кулямёт — стужка на сто патронаў. І ў кожным куля. Але пра гэта далей. А вось карцела пачаць размову са свайго верша, напісанага яшчэ ў васьмідзясятых. Але, адназначна, безумоўна, саступлю Пімену Панчанку, нашаму народнаму і мною вельмі любімаму. У яго ёсць верш яшчэ перадваенны, але вельмі прадбачлівы:

Нябачная першая куля
ля вуха злавесна свісне,
Зямля ў нябёсы дзьмухне
крывавай віхурай гранат,
Барвовая душная хмара
над ціхім акопам навісне,
Таварыш паранены
войкне —
І ты зразумееш: вайна.

А вось што пра кулю напісалася ў мяне. Мяркуйце самі. Толькі ўлічыце, што пісалася гэта трыццаць гадоў таму, і маладзёна перапаўнялі рамантычныя настроі.

Сустрэліся ў полі дзве кулі.
Адна ўжо на злёце была.
Другая пытае:
— Ці чулі,
Каму вас агнём са ствала?
— О, я ганаруся ахвярай.
Тут голаў свой зложыць герой.
Нарэшце здзяйсняецца мара
Навечна з ім стаць над гарой.
Сяброўка яе спахмурнела:
— А мне ўжо дык за ўцекачом
Ганяцца даўно насмылела.
Напэўна, пакіну жыўцом.

Насамрэч куля не такая і важкая. Усе мы памятаем расійскую песню, дзе ўспамінаецца пра «девять граммов». А куля — гэта снарад прадаўгаватай формы з завостраным ці тупаватым канцом. Старадаўнія кулі былі падобныя на шарыкі ці проста на кавалачкі свінцу. Потым пачалі адрозніваць і вырабляць кулі для палявання і для вайны. Паляўнічыя — свінцовыя і свінцовааболонкавыя, той жа шрот. А вось ваенная куля — галоўная частка баявога патрона. Тут сплаў свінцу і сурмы. Для большай трываласці кулі маюць стальную, мельхіёравую ці тампакавую абалонку. Сталь і мельхіёр — зразумела. А вось што такое тампак? У адным са спецыяльных слоўнікаў па метале знайшоў, што tombac — гэта французскае слова, але паходзіць ад малайскага — tambaga, што азначае медзь ці латунь. Гэты метал забяспечвае высокую каразійную стойкасць, што вельмі патрэбна для зброі, патронаў, найперш куль.

Кулі бываюць проста для паражэння жывой сілы праціўніка і спецыяльныя — трасіруючыя, запальныя, бранябойныя. У Анатоля Астрэйкі:

І нада мной і над табой
Гула шрапнель, свісталі кулі.

Цяпер да маёй вайсковай службы. Некалькі разоў было так, што і пад кулі траплялі. Адночы правадзіліся начныя вучэнні, наступленне. Задача пяхоты — не адставаць ад танкаў, якія ідуць наперадзе, са сваёй зброі паражаць мішэні, якія ў начны час абазначаюцца мігатлівай падсветкай, нібыта па нас таксама страляюць. Наш узводны лейтэнант, толькі з вучылішча, падганяе. І танк, за якім наступаем, вырваўся крыху ўперад у лагчыну. Такім чынам адарваліся ад роты наперад. А астатнія ўзводы роты прынялі габарытныя агні гэтага танка за падсветку мішэняў. І пачалі страляць па іх. Спачатку мы не зразумелі, што гэта так дробна цокае па брані танка. А як зразумелі... Прыціснуліся да зямлі так, што толькі камандзір батальёна, пад'ехаўшы на «бэтээры», змог нас узняць не зусім ласкавымі словамі.

Маладыя, мы бавіліся яшчэ і такім: набіваеш у магазін трыццаць трасіруючых патронаў. Потым націскаеш на спуск — вырываецца чарга куляў усяго з нейкі метр даўжынёй, але ляціць яна прыгожа, нібы ты крамсануў нечым начное неба.

А сама назва кулі, відаць, паходзіць ад нямецкага Kugel — першапачаткова шар. У старой беларускай мове былі яшчэ і словы «кулька», «кулетніца» — гэта скураная торбачка для нашэння куль. А яшчэ і «кулялітня» — майстэрня для адлівання куляў.

Ёсць у кулі яшчэ адно састарэлае ўжо значэнне — **зямная куля**, што азначае зямны шар.

Ну, а пра тое, што загадваюць даімчаць куляй, усім вядома.

Можна і **заліваць кулі** — пра нешта дзёрзка і смачна маніць.

А кулямёт? Назва гэтай зброі паходзіць менавіта ад слова «куля». З кулямётам у мяне свае памятныя зносіны. За два гады службы пацягаў яго дастаткова. У нас на ўзбраенні быў кулямёт Калашнікава. Вагой пятнаццаць кілаграмаў. Да яго скрынка са стужкай патронаў на сто штук. Адкінеш сошкі кулямёта, установіш яго — да кіламетра аблегласці любая цэль твая. Трапна біў і, відаць, б'е гэты кулямёт. Прабач, чытач, але ў гэтай размове пра простыя рэчы хочацца прывесці і яшчэ свае радкі. Напрыклад, такія:

Мне сніцца стаў начамі кулямёт,
Што два гады мне ў войску
плечы муляў.
І па мішэнях высланыя кулі
Ніяк не перапыняць свой палёт.

Неяк раней не адчуваліся гады. Але калі твая ўнучка ходзіць у школу, калі, наведваючы дзядулю, пачынае яго вучыць, як правільна пісаць літары, разумееш: нешта немалое засталося ў мінулым.

Мінулае беларускай зямлі гаворыць аб сабе перанасычанасцю металам. Снарады, кулі, абломкі і самыя разнастайныя рэшткі машын ваенных часоў. Неяк, ходзячы за плугам недалёка ад пастаўскага касцёла, выараў дзве кулі і я. Зноў жа прабачце за самацытаванне:

Мужчына араў
каля храма.
І вынесла раптам зямля
Тупую ад кайзера кулю
І вострую кулю цара.

Гэта было сапраўды. І сапраўды, у тую, Першую сусветную, вайну ў нямецкай арміі былі кулі паўкруглыя, а расійскія кулі былі вострыя. Забівалі і калечылі гэтыя кулі, відаць, аднолькава. Я пачынаў сваю службу, калі аўтаматы Калашнікава ў нас былі калібрам 7,62 міліметра. Праз год нам далі аўтаматы калібрам 5,45 міліметра. Правяралі мы такія кулі на баяздольнасць, насцілаючы дошкі. Куля 5,45 мм праходзіць першую, а потым пачынае «варочацца». Гэта для чалавека вельмі небяспечна. Тады, у час службы ў войску, пачуў я пра кулю «дум-дум». Гэта страшная куля. Упершыню прымянілі яе англічане ў англа-бурскай вайне. Была такая вайна ў Афрыцы. Буры, таксама некарэнныя насельнікі Паўднёвай Афрыкі, змагаліся за сваю незалежнасць з англійскімі ўладамі. І было гэта не так і даўно, гадоў сто таму. Дык вось, там пачалі выкарыстоўваць кулі «дум-дум». Такая куля была з няпоўнай альбо падпіленай абалонкай, лёгка разварочвалася альбо сплюшчвалася ў целе чалавека. Наступствы раненняў такой куляй былі вельмі цяжкімі. Наколькі помню, іх нават забаранялі ў Жэнеўскай канвенцыі. Яшчэ цікава, што назва такой кулі паходзіла з Індыі. Выраблялі іх у прадмесці Калькуты і правільна назва гучала б «Дам-Дам».

Ды, напэўна, лепш і не ведаць. Лепш ведаць пра кулю, якую адпусціў хтосьці з тваіх субяседнікаў.

Алесь КАСЦЕНЬ.

г. Паставы.

Без іх, куляў, зразумела, не абыдземся. Але не ў іх галоўны сэнс чалавечага жыцця. Што ж да палявання і пасылання куляў у безабаронных жывёл — тут таксама ў кожнага свой прынцып і падыход. Толькі я супраць.

Пазнай свой край

ЛЕДАВІКОВАЯ СПАДЧЫНА

Вада, вада, кругом вада

Жаўтаватыя плямы трысняговых паплавоў, зялёныя астравы і бязмежныя азёрныя гладзі. Глядзіш на гэтае харство з гары Маяк, вышыня якой 40 метраў над узроўнем вады, і не можаш вызначыць, якія далягляды больш кранаюць. Павернешся ў бок возера Снуды — душу напаўняе спакой, нездарма продкі далі яму такую назву: з балцкіх моў яно перакладаецца «тое, што наводзіць на сон». У возера Струсты (трысняговае) са зрэзанай берагавой лініяй з мноствам заліваў і бухтаў свая аўра, яно падбівае на авантуры, так і хочацца сесці ў лодку і адправіцца высвятляць, што за сакрэты схаваныя на яго астравах. Прынамсі, адзін з іх — Чайчын, другі па памеры ў Беларусі, мае асаблівае начынне (унутры востраў — сваё міні-возера, тут растуць гіганцкія ядлоўцы і рэдкая ў нас карэльская бяроза).

Адкрытая ўсім вятрам гара Маяк — адзін з лепшых аглядных пунктаў Беларусі. Мясцовыя кажуць, што калі чалавек не пабываў тут, значыць ён не быў на Браслаўшчыне. А завітаць у гэты край варта. Вы нідзе не атрымаеце лепшага ўяўлення пра блакітную Беларусь, і месяцу адпачынку не хопіць, каб агледзець усе мясцовыя азёры, іх тут больш за 200! Асаблівасць Браслаўскіх азёраў — празрыстасць, часам можна бачыць на 11 метраў у глыбіню, тут чыстая вада, кажуць, што з возера Волас Паўночны яе можна нават піць. Што пацвярджаюць і асаблівыя індыкатары чысціні: тут, а таксама на возеры Волас Паўднёвы (дарэчы, адным з самых глыбокіх у Беларусі — 40,4 метра), захаваліся рэліктавыя ракападобныя, што бяруць свой пачатак яшчэ з часоў раставання ледавіка. Многія азёры злучаюцца паміж сабой, таму і нагадвае гэты край нейкі гіганцкі блакітны лабірынт з пратокамі, залівамі, бухтамі, мысамі, перашыйкамі.

А яшчэ Браслаўшчына — гэта ўнікальны ландшафт, тут можна пабачыць узгоркі акруглай формы — камы і выцягнутай — озы. 18-20 тысяч гадоў таму тут чараваў ледавік, паміж разнастайных па вышыні і памерах узвышшах разліваў азёры, раскідаў вялізныя валуны.

Гэты край насычаны разнастайнымі паданнямі і легендамі, тут шмат помнікаў гісторыі і культуры, гарадзішчаў, курганоў, культавых збудаванняў. І жывуць тут шчырыя і адкрытыя людзі, большая частка насельніцтва — католікі, але вельмі вялікі працэнт і стараверaў, калі будзеце праязджаць па мясцовых хутарах, заўважыце, што тут няма ні адной царквы, толькі дзе-нідзе на ўзлесках ці ў полі стаяць невялічкія капліцы. Праваслаўныя храмы ёсць толькі ў Браславе, Друі і Друйску. Ёсць тут і старавераўскія могілкі, дзе пахаваны прадстаўнікі старавераўскага роду Мяснікоўскіх, якія ў XVIII стагоддзі пасяліліся на Браслаўшчыне.

Ёсць тут і свае легенды. Напрыклад, пра возера Снуды. Кажуць, што ў ім жыве вялізная рыба, якая ўтрымлівае ваду ў возеры. Калі рыба ўстане, то ўся вада выцячэ. Ці пра возера Струсты, дзе, кажуць, жыве вялізная шчупачыха, якая ўтрымлівае ваду ў возеры. Калі шчупачыха ўстане, то ўся вада выцячэ. Ці пра возера Волас Паўночны, дзе, кажуць, жыве вялізная шчупачыха, якая ўтрымлівае ваду ў возеры. Калі шчупачыха ўстане, то ўся вада выцячэ.

Добра, ды мала

У 1995 годзе на тэрыторыі раёна створаны Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры», у склад якога ўвайшлі найбуйнейшыя азёры краю з бліжэйшымі ўзвышшавымі ландшафтамі, а таксама лясныя масівы ў цэнтральнай і паўднёвай частках раёна. І калі мясцовыя азёры багатыя на разнастайную рыбу, то лясы парку адны з самых «населеных» у Беларусі. Так, неяк навукоўцы праводзілі тут улік жывёл. На працягу 10 кіламетраў налічылі 140 казуль. Нездарма паляўнічая гаспадарка раёна лічыцца адной з лепшых у Беларусі, і прыязджаюць сюды людзі з Расіі, Германіі, Аўстрыі, Бельгіі, Польшчы, Італіі і нават з Нарвегіі, дзе вельмі вялікая папуляцыя ласёў, але такіх трафеяў, як у нас, яшчэ пашукаць трэба.

Апошнім часам расце цікавасць да арніталагічных тураў, усё больш людзей цікавяцца экалагічнымі экскурсіямі. Вабіць гэты край і аматараў водных падарожжаў і рыбалкі (у азёрах парку водзіцца каля 30 відаў рыбаў, тут нават жывуць вугры, праўда, калі ў мінулым яны прыплывалі сюды самі, дык цяпер іх лічынак закупляюць за мяжой). Дарэчы, нават у неспрыяльнае для рыбалкі надвор'е тут рэальна атрымаць выдатны ўлоў. Тут створана спецыяльная сажалка, у якой рыба ловіцца ў любы час. Сама бачыла, як за хвілін 15 тут выцягнулі на вуду тры ладныя рыбіны, грамаў так на 300. Сакрэт поспеху просты, сажалка перазарыбленая і ў пошуках корму яе насельнікі адразу накідваюцца на прынады. Каштуе гарантаваная рыбалка — 30 тысяч, сядзець можна хоць цэлы дзень, і лавіць на некалькі вудаў, галоўнае толькі, каб улоў не перавышаў 5 кілаграмаў. «Клёвае» месца вытурыстычных стаянках у летні сезон яўна малавата. У цёплае надвор'е Браслаўшчыну штодзень наведвае 3-5 тысяч чалавек, і большую частку турыстаў «прыстройвае» прыватны сектар. Таму, як паведаміў **выканаўца абавязкаў генеральнага дырэктара нацпарку Андрэй КУДЗІН**, плануецца ў найбліжэйшы час пашыраць турыстычную інфраструктуру — павялічыць колькасць месцаў на базах адпачынку да 400, на турыстычных стаянках да 1000. Інвестыцыі ў гэту справу павінны скласці каля 17 мільярдаў рублёў. Будуць рамантавацца базы адпачынку, закладацца новыя. І, па словах Андрэя Кудзіна, тут зможа прыпыняцца не толькі бізнэс-эліта, але і людзі сярэдняга дастатку. А што датычыцца адпачынку для рамантыкаў з палаткамі, ужо цяпер умовы сталі больш прыдатнымі — грошы будуць збірацца за месца, а не з кожнага турыста. Трэба сказаць, што цяпер там створана 33 стаянкі, 11 з іх заказныя. Кожная з іх размешчана ў прыгожым кутку нацпарку і мае усе ўмовы для таго, каб людзі адпачывалі цывільна (тэрыторыя прыбраная, ёсць прыбіральня, месца для вогнішча, мангалы, утульныя альтанкі).

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

І калі ў летні час мясцовыя зоны адпачынку пакуль не могуць задаволіць месцамі ўсіх ахвотных, дык у халоднае надвор'е адваротная карціна, многія нумары прастойваюць. На думку кіраўніцтва нацпарку, вырашыць гэту праблему дапамагло б будаўніцтва ў раёне санаторыя, тым больш, што на Браслаўшчыне ёсць унікальныя серавадародныя воды і гразі, якія дапамагаюць пры лячэнні органаў стрававання і рухальнага апарата. Да мясцовых крынічак з серавадароднай вадой датна сябе акупляе, так толькі за адзін месяц тут было прададзена 200 пуцёвак, і ўсё пры тым, што гэта зусім новая і пакуль яшчэ не раскручаная паслуга нацпарку і тэрыторыя вакол вадаёма толькі пачала абсталёўвацца. Таму ёсць ідэя адкрываць новыя платныя сажалкі, а магчыма, зарыбіць і якое натуральнае возера невялікага памеру. Усё ж не кожнага рыбака можна завабіць рыбалкай, няхай і выдатнай, у штучным вадаёме.

На цэнтры адпачынку нацпарку ў летні сезон попыт перавышае прапанову. Так, 180 ложка-месцаў на базах адпачынку і каля 500 на пастаянна ідуць людзі. Напрыклад, адна з іх — Акменіца — размясцілася ля гары Маяк. Кажуць, што вада ў ёй дапамагае не толькі лячыць хваробы, але і прыдае жанчынам прыгажосці, а мужчынам — сілы. Усе навакольныя дрэвы абвязаны разнастайнымі стужкамі — гэта падзяка за жывую вадзіцу. З крыніцай звязана некалькі легендаў, па адной з іх раней тут расла вялікая елка, і мясцовыя жыхары, каб даведацца, адкуль яна бярэ сілы, ссеклі яе, ля каранёў знайшлі выдатную ваду. На другой — быццам бы па зямлі ішоў бог са жбаном вады, дзе вада пралівалася, утвараліся азёры і рэкі. А ў гэтых мясцінах ён прыпыніўся адпачыць, вада са жбана разлілася і з таго часу тут б'е крыніца.

Браслаўшчына мяжуе з Латвіяй і Літвой. Спрашчэнне афармлення і перасоўвання на памежнай тэрыторыі ў 50-кілометровай зоне таксама сыграла б на развіццё турызму. Сюды часцей сталі б прыязджаць не толькі сваякі і сябры беларусаў, што жывуць у суседніх краінах, але і замежнікі, што наведваюць Літву і Латвію.

Адчуйце розніцу

Раён вельмі насычаны хутарскімі пасяленнямі, ды і сам горад Браслаў нагадвае вялікую вёску: тут амаль няма шматпавярховых дамоў, таму турыстам, якія прыедуць сюды адпачываць летам, без праблем можна зняць сабе жыллё. Многія з мясцовых жыхароў не супраць падзарабіць летам, яны самі могуць сяліцца ў падсобных памяшканнях, а свой дом здаваць у арэнду. Але гарантый на выдатны адпачынак прыватнік вам не дае. Мы з мужам здымалі домік ля Браслава. Але тое, што гаспадар распісаў па тэлефоне, нас вельмі расчаравала: у возеры, недалёка ад якога стаяў дамок, купацца было немагчыма, ля ўзбярэжжа яно зарасло травой, бясплатная лодка была дзіравай, плаваць на ёй можна было, але пры гэтым даводзілася вычэрпваць са дна ваду. Ды і размясцілі нас на задворку, у прыбудове, а дачу гаспадар здаў нейкай вялікай кампаніі, якая ўвечары добра паддавала і спявала песні. Прычым, каштаваў наш прыстанак 50 долараў. Наогул, адпачынак у прыватніка можа каштаваць сама меней 10 долараў з чалавека за суткі, калі вы едзеце вялікай кампаніяй, і ад 50 долараў, калі здымаеце дом цалкам.

А варта было б крыху пераплаціць за адпачынак — і адчуванні былі б зусім іншыя.

У чым можна было ўпэўніцца падчас прэс-туру ў нацпарк, арганізаванага Кіраўніцтвам справамі Прэзідэнта. Мы пабывалі на базах адпачынку Дрывяты і Золава. Утульныя нумары, альтанкі і лазні, добраўпарадкаваныя пляжы, магчымасць заказаць смачную ежу дазваляюць сапраўды адпачыць, а не стварацца ўражанне барацьбы за адпачынак. Прынамсі, першая база — проста выдатнае месца для адпачынку з дзецьмі: возера Дрывяты — адно з найбольш цёплых на Браславе, акрамя таго, тут пакатае дно; ёсць дзіцячыя пляцоўкі, а самі нумары маюць абсталяваны пад кухню куток, пры неабходнасці можна прыгатаваць сняданак малым.

А калі вы хочаце проста атрымліваць асалоду ад шэлесту чароту і пырскання вады, сядзець ва ўтульнай альтанцы на беразе вады, прыма

На слыху

У гасцях з «Казкай»

Аляксандр Рыбак правёў у Мінску паўтара дня, але паспеў выканаць «Купалінку» з аркестрам, завітаць у госці да бабулі і вывучыць некалькі фраз на беларускай.

Па запрашэнні тэлеканала АНТ пераможца «Еўрабачання-2009» прыляцеў у Беларусь літаральна на паўтара дня, але затое гэты візіт атрымаўся вельмі насычаным: «салодкая сустрэча» і імправізаваны канцэрт яшчэ ў аэрапорце, здымкі ў некалькіх тэлепраектах, эфір на радыё і онлайн-канферэнцыя, удзел у журы праекта «Новыя галасы Беларусі» і выступленне з Прэзідэнцкім аркестрам РБ і, нарэшце, паўгадзіны ў гасцях у мінскай бабулі...

Зразумела, што графік 23-гадовага артыста быў распісаны па хвілінах, і разлічваць яму на спакойныя прагулкі па горадзе, а журналістам — на эксклюзіўныя задушэўныя размовы не выпадала. Пешыя прагулкі замяніла аўтамабільная экскурсія, у якой ролю гіда ўзяла на сябе мама Сашы, Наталля Валянцінаўна — сам артыст Мінск амаль не памятае, паколькі сям'я пераехала ў Нарвегію больш за 17 гадоў таму, з гэтай прычыны маці нагадала яму некаторыя любімыя месцы — парк Горкага, Чырвоны касцёл, Траецкае прадмесце.

А вось задушэўнасць Саша забяспечыў сам — сваім нязменна добрым настроем і адкрытай усмешкай, непасрэднасцю і шчырасцю ў адказах на пытанні фанатаў і прадстаўнікоў прэсы. Калі ў каго і ўзнікалі сумненні наконт таго, ці не падчэпіць «казачны хлопчык» «зорную хваробу», онлайн-канферэнцыя на АНТ паказала — нічога падобнага! Рыбак азартна расплывадаў пра тое, што дагэтуль лічыць любімай стравай калдуны, дома размаўляе на рускай мове, пераходзячы на нарвежскую, толькі калі злуецца, і што ўсё лета ў яго распісана канцэртамі па Нарвегіі, але ён з задавальненнем зноў прыедзе ў Беларусь.

«Хіба я дарослы спявак?»

Прыхільнікі жадалі ведаць пра трыумфатара сёлетняга «Еўрабачання» ўсё і яшчэ крыху больш — за некалькі дзён прыйшло больш за тысячу пытанняў! Піар-менеджар выбрала для 40-хвілінnай канферэнцыі найбольш цікавыя, кшталту «Які самы смелы ўчынак вы здзейснілі ў жыцці?». З адказам Саша доўга не вагаўся: «Думаю, выступіць на «Еўрабачанні» было пакуль што самым смелым маім рашэннем». Дарэчы, бацькі, хоць і навучалі сына як класічнага музыканта, яго дэмаршам на папулярную сцэну ніколькі не засмучаюцца. «Мы былі абсалютна шчаслівыя, — прызналася Наталля Валянцінаўна, — і перакананыя, што гэта Сашавы шлях — змешваць розныя музычныя жанры, эксперыментаваць з імі».

Імідж заваднога хлапчука, які цяпер замацаваўся за Сашам, яго ніколькі не абцяжарвае. «Вы не баіцеся, што да вас прыклеіцца гэты вобраз і вас не будуць успрымаць як дарослага спевака?» — цікавяцца прыхільнікі. «А хіба я падобны на дарослага спевака? — тут жа рэагуе Саша. — Проста ў мяне цяпер такі імідж. Безумоўна, гадоў праз дзесяць яго будзе цяжка памяняць, але я спадзяюся, што да гэтага часу буду ўжо кампазітарам, магчыма, мюзікл напішу...».

Пакуль жа артыст сумяшчае ў сабе амаль дзіцячую непасрэднасць (напрыклад, падчас нядаўняга візіту ў нямецкі цырк захапіўся цюленем і доўга абдымаўся з ім) і цалкам дарослы сцэнічны прафесіяналізм — так, недарэчны выпадак са смыкам, які выпадкова разарваўся на адной з генеральных рэпетыцый маскоўскага «Еўрабачання», выклікаў у публікі шквал эмоцый, і цяпер Рыбак выкарыстоўвае гэты эфект ужо спецыяльна.

«Дагэтуль веру ў цуды»

Зразумела, у аўтара песні з назвай «Fairytale» («Казка») спыталіся, ці верыць ён сам у казачныя цуды і ці любіў іх у дзяцінстве.

— Так, мне бацькі штовечар чыталі па тры-чатыры казкі, — узгадаў Рыбак. — А ў цуды я веру дагэтуль: кожны раз, калі надыходзіць вясна і распускаюцца кветкі — памойму, гэта сапраўдны цуд!

1 чэрвеня ўбачыў свет цэлы зборнік цудаў ад Сашы Рыбака — ягоны альбом «Fairytales», які будзе прадавацца ў тым ліку ў Беларусі, Расіі і Украіне, і кожны ахвотны можа пераканацца, што Рыбак — аўтар больш чым аднаго хіта. А вось ці здарыцца наступны прыемны і вельмі чаканы публікай цуд — прыезд Рыбака на «Славянскі базар у Віцебску» — загадваць пакуль рана. Графік артыста гэтым летам распісаны надзвычай шчыльна — канцэрты, тэлешоу, здымкі ў фільме. Ды і на віцебскіх афішах, дзе раней анансаваўся ўдзел Аляксандра Рыбака ў канцэрце адкрыцця «Славянскага базару», цяпер яго імя няма. І ўсё ж — надзея ёсць. Абодва бакі вельмі прасілі менеджараў артыста паспрабаваць уключыць паездку ў Віцебск у летні графік...

А на мой погляд, сапраўдны цуд — ва ўмовах агульнага лёгкага вар'яцтва вакол «Еўрабачання» здолець не ўпусціць гэты пафас і мішуру ў сваё жыццё, годна прайсці выпрабаванне меднымі трубамі — куды цяжэйшы, чым сам конкурс. Наколькі гэта ўдаецца ў сям'і Аляксандра Рыбака, я і запыталася ў мамы і сына.

— Як адбілася такая вялікая перамога на вашым звычайным жыцці? Казалі, што Сашу нават давядзецца наняць ахову... Ці ўдалося вам у спакойнай абстаноўцы адзначыць 50-гадовы юбілей Наталлі Валянцінаўны?

— Так, мы адсвяткавалі яго дома — пакуль што не рабілі вялікага банкету з мноствам гасцей, але затое ў гэты дзень глядзелі фільм «Валл-И» ў суседзяў (я ведаў, што маме ён вельмі спадабаецца), яны прыгатавалі вельмі смачныя пачастункі, я торт купіў...

— А яшчэ цябе павіншаваў губернатар, — падказвае мама.

— О, я забыўся! У першы дзень, калі я толькі прыехаў дадому, нас сустракала вельмі многа людзей — чалавек чатырыста ці пяцьсот, і ўсе віншавалі мяне і маму, бо яна працуе ў школе, яе многія ведаюць.

— Калі віншуе сам губернатар, гэта вельмі прыемна, і гэта адчувальная перамена ў жыцці, — дабаўляе Наталля Валянцінаўна. — Мы спрабуем захаваць наша ранейшае жыццё, хоць гэта і вельмі цяжка з-за вялікай увагі звонку. Ахова? Так, калі Саша прыязджае на канцэрты, то, безумоўна, патрэбны чалавек, які займаўся б яго бяспекай, але не нашай, не бацькоў.

Бывай, «Еўрабачанне»!

Удзельнічаць у «Еўрабачанні» Саша Рыбак больш не збіраецца — лічыць, што перасягнуць пастаўлены сёлета рэкорд будзе вельмі цяжка і што ўвогуле адной перамогі дастаткова, трэба рухацца далей. А вось з канцэртамі ў Беларусь — заўжды з задавальненнем. «Думаю, налета я ўжо буду менш папулярны, чым цяпер, — без хітрыкаў разважае артыст, — і змагу прыехаць сюды зноў і з выступленнямі, і проста ў госці».

Пакуль жа слава пераследуе артыста паўсюдна — ад аэрапорта «Мінск-1», дзе прызямляўся чартэрны рэйс, да вялікай залы Палаца Рэспублікі, дзе гледачы стоячы апладзіравалі беларускамоўнаму (!) прывітанню і «Купалінцы» ў выкананні Рыбака з Прэзідэнцкім аркестрам РБ, ад бабулінага дома да шматзоркавага атэля. Таму суботні вылет спевака назад у Нарвегію быў зашыфраваны па ўсіх правілах канспірацыі, нават аўтамабіль, на якім артыста вазілі па горадзе, у апошні момант замянілі іншым. Да трапа самалёта дапусцілі толькі групу суправаджэння з АНТ, якая і развіталася з Рыбаком за ўсіх нас. А ў Осла з Сашам і Наталляй Валянцінаўнай Рыбакамі паляцелі, паводле слоў супрацоўнікаў АНТ, не толькі найлепшыя пажаданні ад бабулі і мінскіх сваякоў, але таксама мноства беларускіх сувеніраў і прысмакаў, торт «Птушынае малако» і хлеб «Нарачанскі».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота БЕЛТА.

Адданым падпісчыкам — прызы па заслугах

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стр.)

Як і меркавалася, размова насіла адкрыты характар. Начальнік Докшыцкага РВПС Раман Каралевіч падкрэсліў, што «Звязда» была і застаецца не толькі праваднiком штодзённай інфармацыі, але і носьбітам беларускасці, што зараз для нашага грамадства надзвычай важна і актуальна. Нямала камплiментаў у адрас газеты было сказана і нашым шчасліўчыкам спадаром Касцюком. Пётр Міхайлавіч адзначыў, што ён ужо не адзін дзясятак гадоў выпісвае газету і лепшага штодзённага выдання на сёння для сябе не бачыць.

Выступае начальнік Докшыцкага РВПС Раман КАРАЛЕВІЧ.

У звяздоўскай віктарыне ўдача ўсміхнулася Марыі БЕЙНАРОВІЧ, Тацяне МОЛЧАН і Наталлі ФУРСЕВІЧ.

Прыемна, што гэтыя словы былі падмацаваныя актыўнасцю людзей, што сабраліся ў зале. Асаблівай папулярнасцю карысталася звяздоўская віктарына, што зусім не дзіўна: лепшыя знаўцы гісторыі газеты і яе сённяшніх спраў за адмысловыя веды атрымалі прызы і сувеніры. Пэўна, што кожны з іх у душы бачыць сябе на месцы шчасліўчыка, якому лёс падносіць, як мінімум, каляровы тэлевізар.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Мінск—Лагойск—Смалявічы—Жодзіна—Барысаў—Докшыцы—Глыбокае—Паставы—Мядзел—Вілейка—Маладзечна—Мінск.

БЕЛАРУСКАЯ АЛКАГОЛЬНАЯ І ХАРЧОВАЯ ПРАДУКЦЫЯ — НА ПОЛЬСКІ РЫНАК

У Варшаве падпісаны ўстаноўчыя дакументы сумеснага беларуска-польскага прадпрыемства «Kristall — Polska». Яго асноўная мэта — арганізацыя ў Польшчы гандлю алкагольнай і харчовай прадукцыяй беларускіх прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у канцэрн «Белдзяржхарчпрам».

Установчыя дакументы падпісалі гендырэктар РУП «Мінск — Крышталь» Леанід Кучаравы, гендырэктар РУП «Гандлёвы дом «Белдзяржхарчпрам» Валерый Кавалёў і старшыня праўлення ТАА «J&J Decor» Томаш Цесляк. Згодна з інфармацыяй беларускага пасольства ў Польшчы, прэзентацыя СП адбудзецца ў рамках Нацыянальнай выставы Беларусі, якая пройдзе ў Варшаве 24 — 26 чэрвеня. Алкагольная прадукцыя РУП «Мінск-Крышталь» пастаўляецца ў Польшчу з 2007 года. Летась гарэлка «Хлебова Прэміум» атрымала галоўную ўзнагароду міжнароднага кірмашу «Польагра 2008» у Познані.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Шануй сваё!

«МЫ НАЛІЧЫЛІ БОЛЬШ ЗА 600 ВЫБІТНЫХ ЖАНЧЫН У НАШАЙ ГІСТОРЫІ...»

У МІНСКУ ВЫЙШАЎ АЛЬБОМ «ЖАНЧЫНЫ, НАЙБОЛЬШ ЗНАКАМІТЫЯ Ў ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ»

Ужо ў назве адчуваецца нейкая задзірыстасць і прэтэнзія. Хоць бы таму, што кнігі «Мужчыны, найбольш знакамітыя ў гісторыі Беларусі», няма. Можа, таму, што мы прызвычаіліся: гісторыі, і ўсё значнае ў гэтым жыцці здзяйсняюць прадстаўнікі моцнага полу?..

Аўтары кнігі — журналістка Ірына Маслянiцына і гісторык Мікола Багадзяж — добра вядомыя абазнанаму чытачу, бо працуюць у тандэме не першы год. У гэтую іх кнігу ўвайшлі як добра вядомыя ўсім асобы — Ефрасіння Полацкая, Рагнеда, Анастасія Слуцкая, Францішка Уршуля Радзівіл, гэтак і тыя, пра якіх мы ведаем хіба што імя: жанчына-волат Настасся, прыгонная танцорка Антонія Тызенгаўза Апалонія Дарэўская, сястра Жыгімонта II Аўгуста Ганна Ягелонка... Пра жанчын, найбольш знакамітых у гісторыі Беларусі, мы гутарым з Ірынай Маслянiцынай.

— Спадарыня Ірына, ваша кніга — ці гэта не чарговы феміністычны крок, каб давесці, што не толькі мужчыны нешта здзяйснялі ў нашай гісторыі?..

— Калі б гэта быў феміністычны крок, у мяне б не было суаўтара Міколы Багадзяжа. Яго нельга назваць феміністкай, бо ён мужчына! І персаналіі таксама былі б падабраныя адпаведна: жанчыны, якія не любяць мужчын, якія працавалі толькі на сваю карысць... Такія таксама ёсць у гісторыі Беларусі, але ў гэтай кнізе іх няма.

— Вы ўжо згадалі свайго суаўтара Міколу Багадзяжа. А ці не моцна вам замінаў рабіць такую кніжку суаўтар-мужчына?

— Ён мне дапамагаў, бо ён — гісторык з адукацыі, які вельмі любіць літаратуру. А я з адукацыі журналіст, літаратар, які любіць гісторыю. І мы неяк так дапамагалі адзін аднаму.

— Скажыце, вось гэты прынцып, выкладзены ў прадмове — маўляў, мы разгледзім не тых жанчын, якія былі проста жонкамі свайго славутага мужа, але тых, якія нешта здзейснілі самастойна. Ці гэты прынцып не адкінуў сапраўды вартых «жанок свайго мужа»?

— Напэўна, не. У гэтай кнізе сабраныя жанчыны, якія зрабілі нешта ў чатырох напрамках — пад знакам мяча, факела, кароны і ружы. Гэта, адпаведна, вайсковая справа, навука, кіраванне і творчасць. Але цяпер мы рыхтуем кнігу «Вянок жаночых лёсаў: адзінаццаць стагоддзяў беларускай гісторыі», дзе будуць іншыя жаночыя постаці ад Х да першай паловы XX стагоддзя.

— Атрымліваецца, каб набраць 16 жаночых імёнаў для гэтай кнігі, вам не давялося моцна шукаць, нешта засталося і ў запасе?

— Вядома! Мы працуем над гэтай тэматыкай з 90-х гадоў. Цяпер мы маем матэрыял на цэлы энцыклапедычны даведнік «Жанчыны ў гісторыі Беларусі». Спачатку меркавалі, што туды ўвойдзе 555 жанчын. Але цяпер іх ужо 600!.. І гэта з улікам, што мы бяром толькі гістарычных асобаў, каб не пакрыўдзіць нікога з жывых...

— Але, слухайце, калі цяпер мужчыны не сумняваюцца, што яны зрабілі ў гісторыю большы ўнёсак чым жанчыны, дык ці не давядзецца мужчынам пасля выхаду такога даведніка зноў даказваць сваё першынство?

— Не давядзецца, бо мужчынскіх персаналіяў усё адно болей у гісторыі. Я лічу, што на 600 гэтых жанчын мужчын выйдзе разоў у пяць болей!

— У вашым альбоме ёсць як «распіяраныя» постаці (Ефрасіння Полацкая, Рагнеда), гэтак і малавядомыя дагэтуль асобы — скажам, былінная паляніца Настасся. Адкуль такія звесткі? І ці рабілі вы для сябе нейкія адкрыцці падчас працы над альбомам?

— Безумоўна. Кожны нарыс у гэтым альбоме — ён для нас саміх быў адкрыццём. Бо нават пра «распіяраныя асобы» нам удалося здабыць нейкую новую, цікавую інфармацыю. Бо калі б не было нічога новага, скажам, пра Ефрасінню Полацкую, дык мы, відаць, не ўключалі б яе сюды, а зрабілі б нарыс пра яе сястру Звеніславу, якая таксама была цікавая асоба. Мы б не бралі Рагнеду, а напісалі б пра дачку Рагнеды... Што датычыцца паляніцы Настассі, дык у нарысе мы апісалі пакручасты шлях уласных пошукаў. Напачатку ў быліне пра сватаўство Уладзіміра да Рагнеды мы звярнулі ўвагу на «Настасцю, сястру Рагнеды». Але ж, паводле ўсіх звестак, не было ў Рагнеды сястры! І тады пачалі супастаўляць, што гэта магла быць стрыечная сястра — ёсць жа згадкі, што ў князя Тура былі дзве дачкі...

— Калі мне сказалі, што выйшаў такі вось альбом пра выбітных беларускіх жанчын, дык я вельмі здзівіўся, не знайшоўшы тут Барбару Радзівіл. Чаму?

— Відаць, таму, што Барбара Радзівіл — гэта славутая жанчына ў сэнсе кахання. Гэта наш узор кахання! А мы не закраналі кахання ў гэтай кнізе — асобна ад дзейнасці па згаданых чатырох напрамках. Але Барбара Радзівіл дакладна будзе ў нашай кнізе «Вянок жаночых лёсаў».

— Дарэчы, ці былі такія жанчыны, якія дасягнулі нечага значнага і адначасова мелі шчасце ў каханні?

— Такія прыклады ёсць. Скажам, Соф'я Кавалеўская — гэта геніяльная жанчына-матэматык, якая двойчы спазнала вялікае каханне. Знайшла сябе і ў навуцы, і ў пачуццях. Увогуле, вельмі часта менавіта каханне рухала жанчынамі, штурхала іх да нейкіх здабыткаў, подзвігаў. І, зноў жа, каханне да жанчыны кіравала ўчынкамі многіх вялікіх мужчын.

— А гэтую кнігу вы рабілі для мужчын ці для жанчын?

— Мы яе рабілі і для тых, і для тых. І прыемна чуць станоўчыя водгукі з абодвух «гендарных» бакоў.

— А што яна мусіць сказаць адным і другім?

— Яна мусіць сказаць, што змяняюцца рэаліі часу, але не змяняецца сутнасць чалавека. Бог стварыў і мужчыну, і жанчыну, каб яны нешта творча рабілі. Пра гэта кніга. Кожная жанчына, напэўна, зможа знайсці нешта агульнае з гераінямі кнігі. І кожны мужчына таксама — бо ў кнізе ёсць і героі-мужчыны. Так, яны на другім плане... Але мужчынскія вобразы годныя — князь Сямён Алелькавіч, князь Кейстут, князь Тур ці князь Рагвалод... На іх мы таксама дастаткова звярнулі ўвагі. Думаю, мужчыны не будуць пакрыўджаныя!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота з архіва.

Віктар ІЎЧАНКАЎ:

«АЙЧЫННАМУ МОВАЗНАЎСТВУ НЕ СТАЕ ФУНДАМЕНТАЛЬНАСЦІ І АНАЛІТЫЗМУ»

Гутарку па-беларуску чуваць усё часцей — у выпадковых абрыўках слоў мінака, паведамленнях мабільнага аператара, рэкламе. Не паспееш азірнуцца, як уступіць у дзеянне Закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Пра тое, якія праблемы зараз узнікаюць і чым жыве айчыннае мовазнаўства, — у гутарцы з Віктарам Іўчанкавым, загадчыкам кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі БДУ, доктарам філалагічных навук, прафесарам.

— Вакол чаго вядуцца спрэчкі ў сучаснай беларускай лінгвістыцы? Скажам, у нашай рэдакцыі абмяркоўваецца магчымасць замяніць «працэнты» «адсоткамі», «адыходзячы» год называць «адыходным», а «карту» — «мапай»...

— Нават тыя словы, што вы прывялі, сведчаць пра выразную дынаміку ў функцыянаванні роднай мовы. На пераломе двух стагоддзяў у беларускім мовазнаўстве высветлілася шмат праблем, якія тычаць, па-першае, пісьмовай і маўленчай практыкі, што мае адлюстраванне ў нашым паўсядзённым жыцці. А па-другое, кранаюць сутнасць мовазнаўства як навукі. Не стае аналітычных прац фундаментальнага характару. І на гэта ёсць свае прычыны. Калі ў практыкаарыентаваным мовазнаўстве вучоныя робяць пэўныя крокі, то ў фундаментальнай беларускай лінгвістыцы яўна адчуваецца заняпад, які доўжыцца апошнія два дзесяцігоддзі і асабліва нарастае ў апошні час. На сёння нам, як ніколі, неабходны аналітычныя працы, якія маглі б выявіць новыя напрамкі ў развіцці айчыннага мовазнаўства.

Айчыннай мовазнаўчай навуцы XX ст., асабліва акадэмічнай, была ўласціва традыцыя дэскрыптыўнай, г. зн. апісальнай, лінгвістыкі. Прычынай таму з'явілася метадалогія дыялекталагічнай школы: даследаванні беларускіх вучоных-дыялектолагаў трывала ўвайшлі ў скарбонку славянскага мовазнаўства. Моцнымі былі лексікалагічны і лексікаграфічны напрамкі. Назіральнік за моўнымі працэсамі і па сёння мае ўдзячную глебу для даследавання — беларускую мову ў яе гістарычным праяўленні. На фоне агульнага савецкага (ідэйна ўніфікаванага) мовазнаўства, дзе панавалі рускамоўныя даследаванні пра рускую мову, у нетрадыцыйным для таго часу напрамку пачала фарміравацца стылістыка тэксту — сімбіёз філалагічнай навукі, у якой арганічна спалучыліся набыткі лінгвістыкі і літаратуразнаўства.

Паступова ў беларускай філалогіі фарміруецца напрамак, які вынікае з наступнага пастулата: тэкст — гэта не простая лінгвістычная адзінка, а з'ява чалавечай дзейнасці, камунікацыі і пазнання. Адсюль стала важным паказаць механізмы дзейснай інтэрпрэтацыі тэксту ў сістэме рэальных сітуацый. Трэба дадаць, што ў сярэдзіне 1970-х гадоў у сусветнай лінгвістыцы тэкст пераасэнсоўваецца вучонымі як камунікатыўны працэс, таму лінгвістыка тэксту ад статыстычнага пераходзіць на так званы дынамічны, працэдурны падыход. Важную ролю ў гэтым пераходзе адыгралі працы па мадэляванні разумення і вытворчасці звязнага тэксту, выкананыя ў рамках штучнага інтэлекту (Р. Шэнк, ван Дэйк).

Вядомая польская даследчыца прафесар Кажанеўска-Берчынска (Joanna Korzeniewska-Berczynska) сваю кнігу «Вобраз чалавека ў кантынууме публіцыстыкі» пачынае характарыстычнымі словамі: «Чалавек на мяжы стагоддзяў апынуўся ў сітуацыі разгубленасці і поўнага недаўмення». Прыведзеныя словы з'яўляюцца партрэтным накідам на сучасніка постсавецкай прасторы, чалавека, каштоўнасныя намеры якога саступаюць дарогу іншым вартасцям, сягаюць у іншую тэкставую палітру жыцця. На жаль, гэтае недаўменне і разгубленасць ніяк не пакідае нас, хаця прайшло ўжо не так і мала часу.

XXI стагоддзе памяняла мовазнаўчую навуку, увёўшы ў кола даследаванняў іншыя параметры і падыходы, якія патрабуюць аналітычнага супастаўлення моўных фактаў, інтэрпрэтацыі іх у святле глабальных змен у інфармацыйна-камунікатыўным узаемадзеянні.

Што да тых слоў, пра якія вы спрачаецеся ў рэдакцыі, то шчыра казаць, мне больш падабаецца слова «адсоткі». Гэта ўдалы варыянт і словаўтваральная мадэль «празрыстая» — ад сотні. «Працэнты» — слова запазычанае. А вось «мапа» — слова, якое пашырана ў польскай мове. Мы вельмі часта любім гаварыць пра тое, як шырока паўплывала і ўплывае на наша маўленне руская мова. Аднак забываемся на даволі інтэнсіўную экспансію ў розныя часы польскай.

«Адыходзячы» і «адыходны» — гэта наша адвечная праблема, да яе трэба падыходзіць вельмі асцярожна. Сапраўды, для беларускай мовы дзеепрыметнікі з суфіксамі -ач-, -яч- як сведчанне прыналежнасці да кніжна-пісьмовай традыцыі нехарактэрныя. Беларуская і руская мовы грунтуюцца на абсалютна розных традыцыях. У рускай мове «алчущий», «жаждущий» — даніна кананічнай традыцыі. Але ж хачу адразу перасцерагчы: без дзеепрыметнікаў нам не абысціся. Дзеепрыметнік — гэта эканомная прагрэсіўная форма, якая ўтрымлівае ў сабе тую ж інфармацыю, што і даданая частка сказа. Гэта ж датычыцца і аддзеяслоўных назоўнікаў, якія вызначылі развіццё маўлення XX стагоддзя: *увод, праходжанне, падрыхтоўка, падпісанне, павелічэнне, паступленне, раздзяржаўленне, актывізаванне, выкарыстанне, наведванне, набліжэнне, пераўтварэнне, пераўладкаванне* і шмат іншых. Чаму гэтыя прагрэсіўныя формы ўзнікаюць? Таму што яны ёмкія, лаканічныя, фармальна спрошчаныя, хаця пры гэтым семантычна ўзбагачоныя. Вазьміце амаль любы дзеяслоў, і мы можам ад яго ўтварыць назоўнік. Чытаць — чытанне, бегаць — бег, беганне, глядзець — бачанне (супліетыўная форма). Якая іх функцыя? Мой калега, прафесар Пецярбургскага ўніверсітэта Уладзімір Канькоў, называе іх «згусткам энергіі, кандэнсатам сэнсу». Сапраўды, гэта так і ёсць. Мы павінны ашчадна ставіцца да такіх выпадкаў. Але канечне ж ужываць да месца, ведаць меру. Ды многія дзеепрыметнікі з -ач-, -яч- ці -уч-, -юч- ужо згубілі дзеепрыметную рысу, іх можна лёгка замяніць прыметнікамі: «гаючая» (жывая) вада. І можна нават прасачыць тэндэнцыю — калі словы з суфіксамі -уч-, -юч- лёгка замяніць словамі з суфіксам -н- (дзеючае — дзейнае заканадаўства), то дзеепрыметнік хутчэй за ўсё ўжо не дзеепрыметнік, а стаў прыметнікам.

— А як наконт супярэчнасцяў у арфаграфіі, граматыцы?

— Думаю, што з уступленнем у дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» арфаграфічных складанасцяў стане намнога менш. Хаця яны ніколі не могуць знікнуць цалкам, бо мова — жывая з'ява.

Перш за ўсё праблемы ўзнікаюць з фанетычным асваеннем запазычаных слоў.

У дзевяностыя гады мінулага стагоддзя ў нашу мову пранікла і пранікае зараз шмат лексічных запазычанняў. Тыя ж сродкі масавай інфармацыі пачалі называцца «медыямі». Адразу ж узнікае пытанне, як правільна пісаць новыя словы, ды і даўно вядомыя: трыё, трыо ці трыа? Таму ўзнікла патрэба прыгледзецца да працэсаў, што закранулі мову. Афіцыйнае прызнанне гэтай праблемы адбылося ў 1992 годзе, калі Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа Акадэміі навук правёў канферэнцыю, прысвечаную беларускаму правапісу. Дыскусія перакінулася ў прэсу. Адгукнуліся амаль усе беларускамоўныя кафедры. Уносіліся прапановы, заўвагі. У 1993 годзе пастановай нашага ўрада «Аб удакладненні правапісу беларускай літаратурнай мовы» была створана спецыяльная дзяржаўная камісія. Яна разгледзела агульныя праблемы і прызнала, што існуючыя правілы ў цэлым забяспечваюць функцыянаванне пісьмовай мовы і кардынальных змен не патрабуюць. Захаваць аснову і адрэагаваць на новыя з'явы ў мове — гэтыя патрабаванні і былі пакладзены ў аснову даручэння, якое было дадзена Акадэміі навук і Міністэрству адукацыі: падрыхтаваць новую рэдакцыю беларускай арфаграфіі і пунктуацыі.

Узгадаем, што больш за сто гадоў назад, дакладней кажучы, у 1905 годзе афіцыйна была знята забарона з беларускай мовы. Выйшла з падполля кнігадрукаванне, пачалі друкавацца па-беларуску газеты. Узнікла пільная патрэба ў граматыцы, якая б зафіксавала асноўныя асаблівасці функцыянавання мовы. І такія граматыкі з'явіліся. Іх было не дзве, не тры, а болей. Найбольш ужытковай, папулярнай, масавай стала граматыка, напісаная Браніславам Тарашкевічам. І яна адыграла важную ролю ў станаўленні беларускай літаратурнай мовы, таму што дала магчымасць стабілізаваць моўныя нормы. Гэтым Браніслаў Тарашкевіч унёс сваё імя ў гісторыю.

Трэба прызнаць, што змены ў правапісе — даволі далікатная рэч, бо датычаць кожнага носьбіта мовы. І як толькі штосьці ў ім мяняецца, то гэта не можа быць незаўважным для ўсяго грамадства. Трэба дадаць, што пытанне аб правапісе актуалізуецца, як правіла, падчас пэўных грамадскіх катаклізмаў, сацыяльных рэформ.

Напрыклад, дэкрэтамі Наркамасветы 1917 года і СНК 1918 года ўводзіўся новы рускі правапіс, у якім выключалася з алфавіта некалькі літар і ўводзіўся шэраг арфаграфічных норм па прынцыпе вымаўлення. Для прэсы і справаводства абавязковым стала пастанова прэзідыума Вышэйшага савета народнай гаспадаркі «Аб скасаванні са завароту агульных літар рускай мовы» (*і* было заменена на *и*, *ѣ* — на *е*, *ѳ* — на *ф*). Супраць гэтых змен выступала шмат людзей. Напрыклад, Іван Бунін выказаў сваё незадавальненне наступным чынам: «Па загадзе самога Архангела Міхаіла не прыму бальшавіцкага правапісу. Ужо хаця б па той прычыне, што чалавечая рука не пісала нічога падобнага да таго, што пішацца цяпер па гэтым правапісе». Або вядомы для таго часу філолаг Мікалай Трубяцкой пісаў у лісце да Якабсона: «Па-мойму, пакойны Шахматаў вялікі грэх на душу ўзяў, што асвяціў сваім аўтарытэтам новую арфаграфію». Такога тыпу выказванняў можна знайсці безліч. Аднак прайшоў час, і рэфармаваныя арфаграфія і азбука трывала ўвайшлі ва ўжытак. Праўда, за мяжой перасталі выкарыстоўваць старыя рускі правапіс толькі ў 50-я. Хаця дзе-нідзе карыстаюцца ім і зараз. Тое самае можам назіраць і з выкарыстаннем беларускага правапісу да 1933-га.

Пакаленні беларусаў, выхаваныя на творах Уладзіміра Караткевіча, Івана Шамякіна, Янкі Брыля, Івана Навуменкі, Сяргея Грахоўскага і іншых сучаснікаў, увабралі крынічную чысціню беларускага слова, выпаставалі ў сабе моўны густ, засвоілі законы пісьма. І адмовіцца ад гэтага мы проста не маем права. Калі не дзеля сябе, дык дзеля будучыні...

— Супярэчнасці больш за ўсё, відаць, датычыліся ў перадачы акання?

— Так. Але не толькі. У беларускай мове паводле традыцыі акання (недысімілятыўнае) фіксуецца на пісьме. Гэтым наша мова адрозніваецца ад дзвюх усходнеславянскіх сясцёр-суседак — рускай і ўкраінскай. Параўнаем: молоко (рус.), молоко (укр.) і малако (бел.). Чаму так сталася? Мы амаль не маем рэдукаванасці галосных о, э, г. зн. іх своеасаблівага скарачэння не ў націскных пазіцыях: воды — вада, рэкі — рака. Тады калі ў рускай мове рэдукцыя — з'ява распаўсюджаная і нават вызначае традыцыю вымаўлення. Мы акаем, і «татальнае» аканне — гэта прыкмета нашай мовы. І ад яго нікуды не падзенешся. Сваім студэнтам, будучым журналістам радыё і тэлебачання, гавару: «Не лянуйцеся раскрываць рот, бо наша а — шчырае, адкрытае». Гэтае а і вылучае беларусаў. Калі мы нават навучымся вымаўляць мяккія *р, т* і *ч*, то нас усё роўна пазнаюць па аканні.

Калі не зважаць на невялікую групу слоў, то і сёння можна пачуць: у беларускай мове О пішацца толькі пад націскам. Але ў існуючым правапісе маюцца выключэнні: трыо, адажыо, партфоліо і інш. Як бачым, перад намі запазычанні. Такіх слоў набярэцца няшмат. Каб ліквідаваць разнабой было ўдасканалена старое правіла: 1. Літара *о* пішацца толькі пад націскам: *год, кот, скрозь, шоўк, колас, мова, дарога, посуд, арол, шолах, плячо, дарога, разгортваць, дапамога, дадаткова, жніво, дзіво, водар, оканне, ода, оптам, ордэн, офіс, опера, Об, Орша, Омск, Обнінск, Осла, Оксфард, Орск, Токіа, Ватэрлоа.* Амаль нічога новага, акрамя двух апошніх слоў. Заўважу, што гаворка ідзе не пра складаныя словы, а простыя. У складаных і складанаскарочаных словах сітуацыя крыху іншая, пра што пагаворым пазней.

Напісанне слоў тыпу *адажыа, арпеджыа, дызажыа, капрычыа, імпрэсарыа, сальфеджыа* выклікала шмат дыскусій. Прапаноўвалася на канцы такіх слоў пісаць **ё** на манер слова *радыё*. Сапраўды, слова радыё з'яўляецца выключэннем, але яно мае сваю гісторыю. У свой час радыё як СМІ маланкава распаўсюдзілася па савецкай краіне, у Беларусі яго называлі і радыва, і радзіва, і радыё. З-за вельмі шпаркага распаўсюджання дыялектнае слова патрапіла ў літаратурную мову, стаўшы выключэннем. Але ж хіба можна з-за аднаго выпадку рабіць выключэннем цэлую групу слоў? Было прынята падстаўнае рашэнне пашырыць прынцып перадачы акання ў словах іншамоўнага паходжання. Паводле новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» трэба пісаць *Антарыа, Антоніа, Байляньцзяа, Баа, Барнеа, Більбаа, Ваяа, Галілеа, Гаа, Даа, Лаа, Леа, Ляа, Мантэвідэа, Маа, Міданаа, Мяа, Рамэа, Сяа, Таа, Цаа, Цічаа, Цындаа, Цяа, Чаа, Чжаа, Чжаадаа, Чырчэа, Яншаа.* Для большага ўяўлення, пра якія словы ідзе гаворка, працягнем гэты шэраг: *Асорыа, Бакачыа, Бенволіа, Біа-Біа, Валенцыа, Грэгорыа, Д'Анунцыа, Еўстахіа, Капіа, Кастэліа, Кіа, Кліа, Лючэнцыа, Мазачыа, Меркуцыа, Нунцыа, Паладыа, Петручыа, Пінокіа, Тэлезіа, Фульвіа* і інш.

Ёсць запазычаныя словы, у якіх канцавы галосны служыць своеасаблівым распазнавальнікам родавай прыналежнасці імя. Напрыклад, па існуючым правіле імя Атавіо пазначае асобу мужчынскага полу, а Атавія — жаночага. Паводле новага правіла, акцэнты зменяцца: *Атавіа (ён)-Атавія (яна)*. Тое ж будзем назіраць у імёнах; *Аўрэліа-Аўрэлія; Базіліа-Базілія; Эміліа-Эмілія; Эўгеніа-Эўгенія; Фабрыцыа-Фабрыцыя; Лючыа-Лючыя; Марыа-Марыя; Маурыцыа-Маурыцыя; Разарыа-Разарыя, Сільвіа-Сільвія* і г.д..

Гэтай адной з сотняў ілюстрацый хацеў прадэманстраваць, што правапісныя пытанні ў нас больш-менш вырашаныя.

— Так шмат змен?

— Дык я ж зараз гавару пра ілюстрацыі,

ХВАЛЮЕЦЕСЯ ПЕРАД ЭКЗАМЕНАМ? ГЭТА НАРМАЛЬНА!

Канец вясны і першыя летнія месяцы — час сесій, бясконцых выпускных і ўступных экзаменаў, гарачая пара для абітурыентаў і іх бацькоў. Нярэдка нервовае напружанне такое моцнае — рукі трасуцца, у галаве кавардак — што справіцца з ім ніяк не ўдаецца. Знайдзіце свой спосаб барацьбы з хваляваннем.

Нашы эмоцыі разнапланавыя. І калі пазітыўныя (радасць, захапленне) мы імкнёмся працягнуць як мага даўжэй, то негатыўныя (раздражненне, адчуванне бездапаможнасці, смутак і г. д.) называем дэпрэсіяй, якую ўсяляк падаўляем і заглушаем. Між тым, дэпрэсія — гэта медыцынскі дыягназ, прычым не такі ўжо распаўсюджаны: са 100 чалавек, якія перажываюць неўратычную рэакцыю, толькі 4 сапраўды пакутуюць ад дэпрэсіі, а 96 адчуваюць часовы эмацыянальны дыскамфорт. Калі вы на працягу некалькіх дзён знаходзіцеся ў стане «мне сумна» або «я нервуюся», то медыкаментознае лячэнне вам не патрэбнае. Урачы сцвярджаюць, што аб дэпрэсіі можна гаварыць, калі чалавек адчувае нуду і адчай, знаходзіцца ў прыгнечаным стане на працягу аднаго месяца і больш.

А што ж рабіць з «часовым эмацыянальным дыскамфортам», бо ён, хоць і не з'яўляецца хваробай, здольны моцна сапсаваць жыццё. Скарыстайце папулярныя сёння мяккія седатыўныя прэпараты на аснове раслінных экстрактаў (звычайна ў іх склад уваходзяць: корань валяр'яну, мята, меліса, півоня, сардэчнік). Іх можна набыць у аптэцы без рэцэпта. Фітакампаненты, якія ўтрымліваюцца ў гэтых прэпаратах, аказваюць агульнаўмацавальнае дзеянне, не наносячы пры гэтым «прыцэльнага» ўдару па нейрамедыятарных рэцэптарах.

І ўсё ж памятайце: падобныя прэпараты — не панацэя, яны ніякім чынам не садзейнічаюць вырашэнню праблемы. Але калі псіхаэмацыянальнае напружанне зашкальвае, раслінныя седатыўныя сродкі дапамагаюць зняць вастрыню перажыванняў, павышаюць канцэнтрацыю ўвагі, наладжваюць сон. Успрымальнасць да стрэсу знікаецца, а чалавек, адолеўшы хваляванне і трывогу, набывае здольнасць мысліць цвяроза і прымаць адэкватныя рашэнні. Пры гэтым «валяр'янка перад экзаменам» не павінна станавіцца нормай. Бо стрэс, які пастаянна заглушаецца падобным чынам, насамрэч ніколькі не знікае, а толькі заганяецца ўглыб. Непражытыя, неадрэагаваныя перажыванні рана ці позна выявяцца ў выглядзе неўрозу, істэрыкі, парушэння сну і г. д.

Хваляванне — натуральная рэакцыя

Любыя напружаныя перыяды (напрыклад, сесія) суправаджаюцца пэўнымі негатыўнымі перажываннямі — і гэта абсалютна натуральна! Увагу псіхолага хутчэй прыцягне чалавек, які ў любы момант свайго жыцця застаецца спакойным нібы сфінкс. Мы — жывыя людзі, таму цалкам нармальна, калі ў нейкія моманты нам хочацца «рвать и метать», плакаць наўзрыд або гучна крычаць. Больш за тое, падобныя праявы якраз і садзейнічаюць пражыванню негатыўных эмоцый і, у рэшце рэшт, вызваленню ад іх.

Ноч перад экзаменам

Думаючы пра іспыты, вы баіцеся, што ў самы адказны момант ад хвалявання з галавы «вылецяць» усе веды? Праверараныя практыкай парады псіхолагаў дапамогуць вам узяць сябе ў рукі. Зрэшты, гэтыя прыёмы спрацоўваюць у любой «хвалюючай» сітуацыі — ці гэта будзе экзамен, ці прыход на новую працу.

■ «Ідэі ў запас». Ставячы перад сабой адну глабальную мэту (напрыклад, тое ж паступленне ў інстытут), добра мець «у запас» некалькі дробных задач, якія адносна лёгка рэалізаваць (падпрацоўка ў час канікулаў, паход з сябрамі). Тады, нават калі не атрымаецца штосьці адно, заўсёды можна будзе пераключыць увагу на іншае.

■ «Самае страшнае». Перад адказным мерапрыемствам каленкі трасуцца ад хвалявання? Паспрабуйце такое практыкаванне. Уявіце, што адбылося самае горшае, напрыклад, вы не паступілі ў інстытут. І што далей? Мадэлюючы сітуацыю, вы зразумееце, што выйсце (падача дакументаў у іншую ВНУ або паступленне ў наступным годзе) заўсёды знойдзецца. Гэты прыём дапамагае не тое каб зменшыць значнасць мэты — хутчэй, ацаніць яе аб'ектыўна.

■ «У вас няўдача, але вы не сталі горшымі». Да памылак можна ставіцца як да катастрофы, а можна як да каштоўнага вопыту. Так, няўдача можа здарыцца з усімі, і з вамі ў тым ліку, але вы не сталі ад гэтага менш разумнымі, прыгожымі і г.д.

■ Не захапляйцеся стымулятарамі! Прасядзеўшы паўночы за падручнікамі, раніцай вы ўпэўненыя: без кубка моцнай кавы не абысціся. Аднак штучнае ўзбуджэнне нервовай сістэмы толькі знясільвае яе. Таму выпіце лепш шклянку мінеральнай вады, соку або зялёнай гарбаты з мёдам — гэтыя напоі значна лепш асвяжаюць галаву.

■ Фізічныя практыкаванні. Немагчыма адначасова танцаваць (бегаць, падымаць штангу) і знемагаць ад хвалявання па прычыне блізкай сесіі. Даказана, што ўсяго 20—25 хвілін інтэнсіўнай фізічнай нагрузкі здольныя зняць нервовае напружанне, якое накапілася за цэлы дзень. Да таго ж, падчас заняткаў спортам выпрацоўваюцца эндарфіны — «гармоны шчасця». Таму перад іспытам не карпейце над кнігамі (усё роўна за адну ноч навярстаць упушчанае не атрымаецца!), а, напрыклад, схадзіце ў басейн. І ў галаве праясніцца, і прыемная стомленасць у целе з'явіцца (а значыць, сон будзе моцным і асвяжальным). У выніку шанцы паспяхова справіцца з задачай істотна ўзрастуць!

■ Многія псіхолагі раяць рабіць дыхальныя практыкаванні, якія дапамагаюць супакоіцца і засяродзіцца. Практыкаванне такое: неабходна глыбока, праз нос, удыхнуць, затым павольна, праз рот, выдыхнуць. Паўтарыце яго некалькі разоў.

■ Перад тым, як зайсці ў кабінет, трэба настроіцца і сказаць самому сабе: «Я ўсё змагу», «У мяне абавязкова ўсё атрымаецца». Не варта хвалявацца, наадварот, старайцеся выглядаць упэўненым і смелым. Ваша ўпэўненасць пакажа выкладчыку, што вы гатовыя да экзамену і настроеныя толькі на выдатную адзнаку.

■ Добра, калі ў хвіліны нервовага ўзрушэння побач з вамі будзе блізкі чалавек, якому вы давяраеце. Калі вам дрэнна і сумна, не стрымлівайце эмоцый — наадварот, выплюхвайце іх на поўную. І пры гэтым агучвайце тое, што з вамі адбываецца. Менавіта прагаворванне і «праплакванне» свайго стану дапамагае адпусціць перажыванне і не «зацыкліваца» на ім далей. Тут вельмі важная асоба чалавека, якога вы выбераце на ролю суцяшальніка. Ён не павінен уціхамірваць вас, гаварыць «не плач», «усё, хопіць, супакойся». Суцяшэнне заключаецца ў падтрымцы, прызнанні важнасці вашых пачуццяў. Аднак няма чаго і «на пару» заліваца слязьмі. Вам стане лягчэй, нават калі вас проста патрымаюць за руку, скажуць: «Усё будзе добра, я з табой». Часам такая «хатняя» псіхатэрапія больш дзейсная, чым усе заспакаяльныя пілюлі, разам узятыя.

Вашы саюзнікі

Нават такія дробязі, як колер адзення або шакаладка, могуць стаць вашымі памагатымі ў барацьбе з неспакоем.

■ Акружыце сябе сонечнымі, жыццярадаснымі колерамі. Псіхолагі заўважылі, што аранжавыя і ярка-жоўтыя дэталі гардэроба настройваюць свайго гаспадара на пазітыўны лад. У той жа час ад «меланхалічных» чорных, карычневых і шэрых убораў лепш пакуль адмовіцца.

■ Паклапаціцеся аб вітамінах. Мозг спажывае значную частку ўсяго вітаміну С, які мы атрымліваем. Ёсць толькі адзін орган, у якім канцэнтрацыя гэтага вітаміну вышэйшая, чым у мозгу. Гэта — надныračнікі, якія выпрацоўваюць гармоны стрэсу. Таму ў перыяды сур'ёзных нагрузак карысна піць моцны настой шыпшыны, сокі цытрусавых, кісель з чорных парэчак.

■ Пры зніжэнні працаздольнасці неабходна папоўніць запасы магнію і вітамінаў групы В. Ешце мюслі, рыбу, мяса птушкі, ялавічную печань, а таксама арэхі, фінікі і горкі шакалад — гэтыя прадукты ўзмацняюць канцэнтрацыю ўвагі і паляпшаюць запамінанне інфармацыі.

■ Дабратворна ўплывае на эмацыянальны стан, узбадзёрвае, уздымае настрой язмінавы чай. Спосаб прыгатавання: 2 ч. лыжкі сухіх кветак язміну, 4 ч. лыжкі чорнага або зялёнага чаю заліце крутым кіпенем і настойвайце 2-4 хвіліны.

Вучыцеся адпачываць!

Ёсць людзі, якія месяцамі і гадамі не даюць магчымасці свайму арганізму аднавіць сілы, лічачы адпачынак марнай тратай часу. А між тым, «аднаўляльныя працэдуры» патрэбныя ў роўнай ступені і вашаму целу, і вашай душы. Не захламляйце яе неадрэагаванымі перажываннямі. Прывычыце сябе засынаць з лёгкім сэрцам. Калі дзень выдаўся цяжкім, абавязкова «змыйце» з сябе ўвесь негатыў пад душам. Зрабіце цёплую ванначку для ног з марской соллю, а затым масаж ступняў.

Дарэчы, у карэкцыі псіхалагічнага стану вялізную ролю адыгрываюць пахі. Найбольш прыемнымі і заспакаяльнымі водарамі прызнаныя герань, бергамот, іланг-іланг, лаванда, міра, ружа. Цудоўна супакойвае ваніль. Ну а калі і яны не сцешылі вас, паспрабуйце ўцерці ў скроні 5-10 кропляў алею з апельсінавай лупіны. Спадзяёмся, пасля гэтых прыемных працэдур вашы думкі чароўным чынам праясняцца.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Краіна здароўя

Выпуск № 17 (131)

5 ЗВЯЗДА 2 чэрвеня 2009 г.

Доктар адкажа

На гэтым тыдні дзяжурыць на «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

2 чэрвеня — галоўны ўрач дзіцячай гарадской інфекцыйнай клінічнай бальніцы г. Мінска Вольга Уладзіміраўна ГРЫНЕВІЧ.

3 чэрвеня — галоўны ўрач 2-й дзіцячай гарадской клінічнай бальніцы Мінска Ларыса Пятроўна СЯЧКО.

4 чэрвеня — галоўны ўрач 10-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Аляксандр Васільевіч БАЛАКІРАЎ.

5 чэрвеня — галоўны ўрач 11-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска Віталь Адамавіч ЛУНЕЎСКІ.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзіцячы прыём

Рыхтуемся да адпачынку. Страхуемся ад хваробаў

Лета — доўгачаканы час для дзяцей, таму што гэта сонца, пляжы, грыбы, ягады і безліч вольнага часу. І няважна, дзе будуць адпачываць хлопчыкі і дзяўчаткі: з бацькамі на дачы ці ў бабулі ў вёсцы, у летніку ці на экзатычным поўдні, важна, каб былі яны здаровыя і не правялі частку канікулаў на бальнічным ложку. Пра тое, якія хваробы характэрныя для летняга сезона і як іх пазбегнуць, нам расказала асістэнт кафедры дзіцячых інфекцыйных захворванняў БДМУ, урач вышэйшай катэгорыі, кансультант 5-га аддзялення дзіцячай інфекцыйнай бальніцы г. Мінска Галіна ЛАГІР.

— У летнія месяцы найбольш актуальныя кішэчныя інфекцыі. Сярод іх іерсініёз, сальманелёз, дызентэрыя, ротавірусныя і энтэравірусныя інфекцыі. Таксама можа заявіць аб сабе лаймбаррэліёз — інфекцыя, якую пераносяць кляшчы.

Пачынаючы з мая і на працягу ўсяго лета, бацькі з дзецьмі выязджаюць у лес па грыбы, ягады, на пікнікі або наведваюць лесапаркавую зону. Там іх падпільноўваюць небяспечныя сустрэчы з кляшчамі. Таму неабходна максімальна закрываць адкрытыя ўчасткі скуры, выкарыстоўваць галаўныя уборы, хусткі.

Калі вы ўбачылі кляшча, які прысмактаўся, трэба паспрабаваць яго выдаліць. Для гэтага на месца ўкусу заліваецца алей ці вазелінавае масла. Праз 10-15 хвілін крывасмок павінен адваліцца. Калі самастойна выдаліць кляшча не ўдаецца, варта звярнуцца да дзіцячага хірурга. Кляшча пажадана даставіць у бліжэйшы цэнтр гігіены і эпідэміялогіі для даследавання на інфіцыраванасць, каб ведаць, якія лячэбныя мерапрыемствы праводзіць з пацярпелым. Аднак, не чакаючы вынікаў даследавання, можна пачаць прафілактычнае лячэнне антыбіётыкамі. Для гэтага трэба звярнуцца да ўрача.

Пры кішэчных інфекцыях з'яўляецца ліхаманка, рвота, бывае млявасць ці, наадварот, узбудлівасць, потым можа дадацца дыярэя. Гэта павінна насцярожыць бацькоў і лепш за ўсё ў такіх выпадках звярнуцца да доктара. Бо кішэчныя інфекцыі небяспечныя тым, што яны могуць прывесці да выражанага абязводжвання арганізма, пры гэтым змяняюцца функцыі нырак, сэрца, іншых органаў.

— А якімі павінны быць першыя дзеянні бацькоў да прыезду ўрача?

— Калі ёсць рвота, дзіця не трэба карміць. Паіць можна вельмі маленькімі порцыямі вадкасці. Пры вадкім стуле даць прэпараты, якія прымяняюцца пры дыярэйным сіндроме (смекта, актываваны вугаль).

— Што трэба рабіць для прафілактыкі кішэчных інфекцый у дзяцей?

— Вядома, што кішэчныя інфекцыі — гэта хвароба брудных рук. Таму важна сачыць за тым, каб дзіця рэгулярна мыла рукі. Але яшчэ важна, якая вада пры гэтым выкарыстоўваецца. Напрыклад, у сельскай мясцовасці ваду нярэдка бяруць з калодзежа, а яна часта там бывае інфіцыраваная. Таму я параіла б браць з сабой запас вады з горада ці кіпяціць ваду з калодзежа.

Яшчэ адзін момант. У зімовы час у вясковых і дачных дамах часта пасяляюцца мышы. Прадукты ж іх жыццядзейнасці могуць быць крыніцай заражэння іерсініёзам. Таму варта старанна, з пральным парашком вымыць усё ў доме. Мышы могуць інфіцыраваць прадукты, якія захоўваюцца ў кладоўках, гаражах і ўжываюцца ў сырым выглядзе (яблыкі, морква, капуста, рэпчатая цыбуля і інш.). Іх трэба старанна мыць перад ужываннем.

Ужо з'яўляецца першая зеляніна. Не дазваляйце дзецям есці яе прама з градкі ў нямытым выглядзе.

Небяспечнае купанне ў закрытых вадаёмах. Вада ў іх можа ўтрымліваць вірусы гепатыту А, энтэравірусы, дызентэрыйныя палачкі. А купаючыся, дзіця заглытвае гэту інфіцыраваную ваду.

Што датычыцца адпачынку ў летніках. Бацькі павінны разумець: дзецям нельга прывозіць гасцінцы ў вялікай колькасці, асабліва прадукты, якія хутка псуюцца. Бо ўсё гэта адразу не з'ядаецца, захоўваецца ў тумбачцы. Вось вам і яшчэ адна крыніца інфіцыравання.

— Якія харчовыя прадукты найбольш небяспечныя ў летні час?

— У першую чаргу для дзяцей гэта малочныя прадукты. Нельга купляць малако, творагі уздоўж дарог у мясцовых жыхароў, нельга захоўваць малочныя прадукты пры пакаёвай тэмпературы. Вось нядаўні выпадак. Сям'я ў складзе бацькоў і дваіх дзяцей па дарозе на дачу купілі трохлітровы слоік малака. Прыехалі на месца і паласаваліся гэтым малаком, нават не пракіпяціўшы яго. А праз 12 гадзін ва ўсіх з'явілася рвота, дыярэя, ліхаманка. Добра яшчэ, што ў таты хапіла моцы пасадзіць дзяцей у машыну і прывезці ў нашу інфекцыйную бальніцу. Стан хворых быў дастаткова цяжкім, у дзяцей была выяўлена дызентэрыйная палачка. Малым давялося прамываць страўнік, ставіць кропельніцу, прымяняць антыбіётыкі. На бальнічным ложку дзеці правялі 10 дзён.

Асцярожнымі трэба быць і з ужываннем садавіны. Яе нельга есці нямытай. Нават бананы, мандарыны, апельсіны варта абавязкова памыць. Старанна трэба мыць перад ужываннем і клубніцы, якія могуць быць інфіцыраваныя дызентэрыйнымі ўзбуджальнікамі і яйкамі глістоў. Не раю купляць разрэзаныя кавуны ў цэлафанавай упакоўцы. Невядома, ці чыстым нажом іх рэзалі, акрамя таго, абалонка ягады можа быць забруджана. А захоўванне на сонцы ў цэлафане спрыяе вельмі хуткаму размнажэнню мікробаў.

Трэба ведаць, што вінаград вельмі дрэнна прамываецца пад праточнай вадой. Таму перш чым даць яго дзіцяці, трэба гронку падзяліць на асобныя ягады, прамыць і абдаць гатаванай вадой.

— Якіх правілаў трэба прытрымлівацца, адпачываючы з дзецьмі на блізкім і далёкім поўдні?

— Перш за ўсё трэба быць вельмі асцярожнымі з вадой. У тых жа Турцыі, Егіпце, Крыме, Адэсе нават водаправодная вада не заўсёды бывае якаснай. Яе абавязкова трэба кіпяціць, але лепш выкарыстоўваць толькі бутыляваную пітную ваду.

Трэба памятаць, што ў мясцінах, далёкіх ад прывычнага месца жыхарства, і ежа можа быць зусім іншай. А гэта не выключае расстройстваў страўнікава-кішачнага тракта, якія звязаны з ужываннем нейкіх новых прадуктаў. Напрыклад, морапрадуктаў: малюскаў, крабаў, крэветак. Нярэдка яны з'яўляюцца крыніцай заражэння даволі новай для Беларусі інфекцыяй — норавіруснай. Яна суправаджаецца рвотай, ліхаманкай, дыярэяй.

Яшчэ. Ні ў якім разе нельга купляць і даваць дзецям прадукты, якія часта мясцовае насельніцтва прапануе на пляжы: кукурузу, семкі, ласункі. Невядома, якімі рукамі гэта прыгатавана і ў якой ёмістасці захоўвалася.

— Галіна Міхайлаўна, што б вы параілі бацькам пакласці ў аптэчку, ад'язджаючы на адпачынак з дзецьмі?

— У аптэчку трэба пакласці перш за ўсё прэпараты, якія зніжаюць тэмпературу, напрыклад, парацэтамол ці ібупрафен або ібуклін. Пажадана ўзяць лекі, якія дапамагаюць змагацца з кішэчнымі інфекцыямі ці харчовымі атручэннямі: смекту, актываваны вугаль. Іх можна пачынаць прымаць як мага раней, нават у мэтах профілактыкі, калі ў сям'і ўжо нехта захварэў. Гэта дапаможа палегчыць цячэнне хваробы, калі дзіця захварэе, ці ўвогуле прадухіліць хваробу. Абавязкова трэба браць з сабой пакецікі рэгідрону — гэта глюкозна-салявыя растворы, якія дапамогуць папоўніць страты электралітаў. Пакецік растварэцца ў 1 літры вады і выкарыстоўваецца для піцця.

У аптэчцы павінны быць антыдыярэйныя прэпараты (лаперамід, імодыум), якія прымяняюцца для лячэння вадзяністай дыярэі ў старэйшых дзяцей. Таксама трэба мець стартавыя прэпараты (ніфураксазіт, налідзіксавая кіслата), якія прымяняюцца ў пачатку хваробы, калі ў стуле ёсць прымесі слізі і крыві.

Могуць спатрэбіцца і антыбіётыкі ў выпадку развіцця ангіны ці атыту (амаксіцылін ці аугментын). Нярэдка пад уздзеяннем сонечных прамянёў адбываецца актывізацыя вірусу простага герпесу, што суправаджаецца высыпкамі на вуснах і крылах носа. У аптэчцы трэба мець і супрацьгерпесныя мазі (герпевір, ацыклавір).

Калі дзіця мае схільнасць да алергіі, магчыма, спатрэбіцца супрасцін, кларыцін.

Жадаю ўсім доўгага адпачынку і не хварэць.

Вольга ШАЎКО.

АХВЯРЫ ВЫТАНЧАНЫХ ФІГУР ЗАПУСКАЮЦЬ ПРАГРАМУ САМАЗНІШЧЭННЯ

Сок паловы агурка, дзясятая частка стаграмовай горкай шакаладкі і 125 грамаў абястлушчанага ёгурту ў дзень — вось чым харчавалася на працягу некалькіх гадоў да паступлення ў стацыянар Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра псіхічнага здароўя адна з яго пацыентак. Рацыён другой ахвяры фігуры мадэльных параметраў складаў... 90 таблетак бісакадзілу ў дзень. Медыкі прызнаюцца, што нават і не ведаюць, на чым трымаўся арганізм гэтай дзяўчыны, хіба толькі «сілкаваўся» жэлацінам, які ўтрымліваўся ў лекавым сродку...

Дыягназ «нервовая анарэксія», на жаль, даўно перастаў быць экзотыкай. Больш за тое, нервовую анарэксію ўжо называюць бізуном XXI стагоддзя. «Нервовая анарэксія» — гучыць прыгожа і нават высакародна, але пад гэтым дыягназам хаваецца сур'ёзнае парушэнне харчовых паводзінаў, якое характарызуецца мэтанакіраваным адмаўленнем ад ежы і небяспечна нізкай вагой. Пры росце 170 сантыметраў ахвяры нервовай анарэксіі могуць важыць 25-40 кілаграмаў, быць падобнымі на шкілет, абцягнуты скурай, і пры гэтым лічыць, што яны яшчэ недастаткова «пахудзелі».

— Парушэнні харчовых паводзінаў — гэта вельмі спецыфічнае псіхічнае расстройства, якое кідае выклік усім урачам: «А паспрабуй мяне палячыць», — дзеліцца сваімі думкамі **загадчык кафедры псіхіятрыі і медыцынскай псіхалогіі Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта доктар медыцынскіх навук Алег СКУГАРЭЎСКІ.** — І выстаяць у гэтай барацьбе вельмі складана. Пацыенткі з нервовай анарэксіяй, як правіла, адмаўляюцца супрацоўнічаць з медыкамі і ўпарта працягваюць рэалізоўваць праграму самазнішчэння. Да таго, як трапіць у поле зроку псіхіятраў, яны доўгі час беспаспяхова лечацца ў тэрапеўтаў, педыятраў, эндакрынолагаў, гастраэнтэролагаў, гінеколагаў, якія ставяць ім розныя дыягназы. Але сапраўдная прычына ўсіх саматычных захворванняў і празрыстай худзізны застаецца па-за кадрам. Самае небяспечнае, што ў любы момант такія пацыенткі могуць памерці. Паказчык лятальнасці пры нервовай анарэксіі даходзіць да 20 працэнтаў — гэта самы высокі паказчык сярод усіх псіхічных захворванняў і ўвогуле надзвычай высокі паказчык лятальнасці для любога захворвання. Яго можна супаставіць толькі са смяротнасцю ад алкагалізму ці наркаманіі. Дарэчы, парушэнні харчовых паводзінаў, як і алкагалізм, і наркаманія, з'яўляюцца формай залежнасці.

Нервовую анарэксію называюць яшчэ «хваробай юных» або «хваробай выдатніц». Фарміруецца яна, як правіла, у падлеткавым узросце, калі ў маладых людзей з'яўляецца ўстойлівая незадаволенасць уласным целам і ўспрыманнем сябе ў люстэрку. Прычынай цяжкіх псіхатраўміруючых сітуацый могуць стаць як насмешкі равеснікаў, накшталт «таўстушка», «пончык», так і неасцярожнасць школьных педагогаў або ўрачоў, якія нярэдка раздаюць у прысутнасці іншых падлеткаў парады пахудзець, ці нават крытычныя заўвагі ўласных бацькоў. Як правіла, гэтым грашаць маці дзяўчат, якія крытычна ставяцца да таго, як харчуюцца іх дочкі...

— Да асноўных фактараў рызыкі развіцця парушэнняў харчовых паводзінаў адносіцца нізкая самаацэнка і пачуццё ўласнай непаўнацэннасці, — распавядае **псіхолаг медыцынскага цэнтра «Антэс Мед» Вольга ІЛЬЧЫК.** — Мае пацыенткі нярэдка маюць некалькі дыпломаў аб вышэйшай адукацыі, палова з іх валодаюць замежнымі мовамі і нават не адной, добра разбіраюцца ў камп'ютарах, ездзяць у заходнія краіны на стажыроўкі і ўсё гэта... не перашкаджае ім хварэць. Часцей за ўсё да нас трапляюць прыгожыя дзяўчыны. І ўсё ж пры знешняй сацыяльнай паспяховасці яны маюць вельмі нізкую самаацэнку і незадаволеныя сабой. А адмова ад харчавання — гэта не капрыз, на сутнасці дзяўчаты «падсаджваюцца» на адмову ад харчавання, на кантроль сваёй вагі як на наркотыкі і гатовыя на самакатаванне, толькі б пазбавіцца ад «лішняй вагі». Нервовая анарэксія — гэта хвароба кантролю і адаптацыі, скажонага ўспрымання сябе, свету і свайго месца ў ім. Атрымліваецца, што акрамя свайго рацыёну харчавання дзяўчаты нічога ў сваім жыцці больш не могуць кантраляваць. Яны звышпатрабавальныя да сябе і вельмі баяцца ацэнкі іншых. Калі мы пачынаем працаваць з сям'ёй пацыенткі, то пераконваемся ў адсутнасці ў такіх сем'ях даверлівых адносінаў і існаванні нябачных канфліктаў. Маці нашых пацыентак — гэта нярэдка дэспатычныя жанчыны, якія стымулююць сваіх дзяцей на дасягненні, але абсалютна ўсё кантралююць і падаўляюць іх волю.

Вельмі важны фактар рызыкі — наяўнасць у сваякоў залежнасцяў (харчовых, алкагольных ці наркатычных) і выкарыстанне дыет. Заўважана, што калі дзяўчаты прыбягаюць да ўмераных дыетычных абмежаванняў, то верагоднасць развіцця нервовай анарэксіі павялічваецца ў іх у 5 разоў, а калі яны захапляюцца жорсткімі дыетамі, то рызыка ўзрастае ўжо ў 18 разоў. Нярэдка дзяўчаты, якія ўжо лячыліся ад нервовай анарэксіі, «раптам» становяцца вельмі рэлігійнымі і садзяцца на жорсткі пост. Але насамрэч яны проста знаходзяць сваім паводзінам новае тлумачэнне. Бацькі хворых на анарэксію дзяўчат таксама вельмі неахвотна прызнаюць існаванне праблемы і перашкаджаюць таму, каб на іх «псіхічна здаровае» дзіця вешалі ярлык. А хвароба тым часам працягвае «паядаць» сваю ахвяру. Кожныя дадатковыя 100 грамаў вагі ўспрымаюцца імі як паражэнне.

СІГНАЛЫ РАЗВІЦЦЯ АНАРЭКСІІ:

— празмерная заклапочанасць сваёй фігурай, захапленне дыетамі, падлікам калорый, якія суправаджаюцца рэзкай стратай вагі;

● навязлівы страх перад атлусценнем;

● пазбяганне любых сітуацый, у якіх давядзецца харчавацца;

● празмерныя фізічныя нагрузкі.

Таму захаванне жорсткіх дыет спалучаецца з празмернымі фізічнымі нагрузкамі і ачышчэннем арганізма ад ежы з дапамогай штучна справакаваных ванітаў, прыняцця мачагонных і слабіцельных сродкаў. Са стажам хваробы ў хворых назіраюцца ўжо самаадвольныя ванітыы. У некаторых рвотных рэфлексы настолькі моцныя, што ім дастаткова толькі падумаць, што трэба пазбавіцца ад ежы, як ваніты ўзнікнуць самі сабой і зусім неабавязкова выкарыстоўваць для гэтага рукі. У ход ідуць таксама і прэпараты, якія падаўляюць апетыт.

Хвароба прагрэсуе ў тры этапы. На першым дзяўчына прыходзіць да высновы аб уласнай непаўнацэннасці, тлумачачы яе сваёй паўнатой. Для гэтага этапа ўласцівыя падаўлены настрой і спробы абмежаваць сябе ў харчаванні. Другі этап суправаджаецца ўжо галаданнем. Поспехі ў зніжэнні вагі выклікаюць імкненне замацаваць іх яшчэ больш жорсткай дыетай, каб яшчэ больш моцна пахудзець. У гэты час ужо распачынаецца актыўны распад тканак, які яшчэ больш зніжае апетыт. Маладая і пругкая скура страчвае сваю эластычнасць, назіраюцца частыя крывацёкі з носа, страта прытомнасці, арытмія, мышачныя спазмы. Становяцца нерэгулярнымі ці ўвогуле знікаюць менструацыі. А на трэцім этапе настае незваротная дыстрафія ўнутраных органаў. Зразумела, што калі цела доўгі час не сілкаваць, то яно пачынае «сілкавацца» ўласнымі мышцамі, а сэрца — гэта таксама мышца, і яна «з'ядаецца» ў працэсе галадання. Дэфіцыт масы цела можа дасягаць 50 працэнтаў. Стан хворых характарызуецца парушэннямі дзейнасці страўнікава-кішачнага тракта, метабалічнымі парушэннямі, вытанчэннем міякарда, брадыкардыяй, тахікардыяй, дыстрафічнымі змяненнямі скуры аж да язваў і трэшчын у месцах натуральных згібаў. Пролежні на скуры могуць утварацца нават ад ніжняй бялізны, якая даволі свабодна прылягае да цела. У хворых выпадаюць валасы і крышацца зубы. Яны пастаянна мерзнуць, таму спрабуюць сагрэцца з дапамогай грэлкі ці ў гарачай ванне. Але адчувальнасць скуры ў іх значна зніжаецца, таму яны не адчуваюць ні болю, ні гарачай вады, і могуць атрымаць цяжкія апёкі. Ёсць яшчэ адна асаблівасць, якой цяжка знайсці тлумачэнне: пры крытычным дэфіцыце масы цела хворыя на анарэксію захоўваюць унікальную ўстойлівасць да інфекцый і не хварэюць, скажам, на грып, ахвярамі якога могуць стаць пацыентаў, 20 працэнтаў хворых паміраюць і ў 30 працэнтаў праблема застаецца хранічнай.

90-95 працэнтаў хворых на нервовую анарэксію — гэта дзяўчаты і маладыя жанчыны.

Па звестках Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, парушэнні харчовых паводзінаў маюць больш як 13 працэнтаў беларусак: абмежавальныя стэрэатыпы харчавання выяўлены ў 5,5 працэнта, а булімічная сімптаматыка і пераяданне — больш чым у 7 працэнтаў школьніц, студэнтак ВНУ і тэхнікумаў, якія былі ахоплены даследаваннем. Усяго ў даследаванні ўдзельнічалі 860 чалавек.

— Я ведаю выпадкі, калі спачатку лячылася ад нервовай анарэксіі старэйшая сястра, а затым і малодшая, ці маці, а затым дачка, — расказала Святлана Мяльгуй. — Увогуле, абмежавальныя стэрэатыпы паводзінаў перадаюцца ў спадчыну ў 50 працэнтах выпадкаў. І калі маці спрабавала кантраляваць сваю знешнасць з дапамогай дыет ці выключэння ванітаў, то верагоднасць, што і дачка будзе прыбягаць да аналагічных спосабаў, вельмі высокая.

Пры лячэнні анарэксікаў выкарыстоўваецца біяпсіхасацыяльны падыход. Абавязкова заключаецца вусны кантракт з пацыенткай і яе бацькамі аб мэтах і метадах лячэння. Далучэнне да працэсу лячэння бацькоў мае выключнае значэнне, паколькі дапамога патрабуецца ўсёй сям'і, да таго ж і адказнасць за папраўку павінна быць падзеленая паміж сям'ёй і медыцынскімі работнікамі. Аснову тэрапіі парушэнняў харчовых паводзінаў складае псіхатэрапеўтычная работа (групавая і індывідуальная). Сямейная псіхатэрапія праводзіцца два разы ў месяц. І персаналам, і пацыенткамі вядуцца дзённікі харчавання. Праўда, у дзённіках пацыентак фігуруе, для прыкладу, не палова порцыі баршчу, а цэлая тона. За харчаваннем наладжаны строгі кантроль. Дзейнічае таксама сістэма заахвочвання і пакарання (тэрапія паводзінаў): зялёныя карткі прызначаны для заахвочвання, а чырвоныя — для пакарання. Збіраючы ўмоўныя грошы, пацыенткі атрымліваюць магчымасць індывідуальнай псіхакарэкцыі, права на спатканне з роднымі, магчымасць выходных званкоў. У людзей, якія не мелі стасункаў з хворымі на анарэксію, можа паўстаць заканамернае пытанне: «А ці не занадта жорстка з імі абыходзяцца? Ці не ўшчамляюцца такім чынам іх свабода і чалавечая годнасць?» Але ўрачы ўпэўненыя, што больш жорстка, чым дзяўчаты ставяцца самі да сябе, ніхто да іх ставіцца ўжо не зможа. Да таго ж уваходныя званкі ніхто не забараняе.

Міжнародныя стандарты эфектыўнасці аказання дапамогі такому кантынгенту — гэта набор у стацыянарных умовах 1-1,5 кілаграма вагі на працягу тыдня, а ў амбулаторных умовах — 0,5-1 кілаграм. Калі пацыентка зможа даказаць, што яна здольная самастойна набіраць вагу, то лячэнне можа працягвацца ў амбулаторных умовах.

— Вышэйшае наша дасягненне — калі пацыентка прызнае, што яна хворая і што ёй трэба лячыцца, — падкрэсліла Святлана Мяльгуй. — І калі ў аддзяленні ёсць дзяўчаты, якія ўжо ідуць на папраўку, то яны і ўсіх астатніх цягнуць за сабой...

Надзея НІКАЛАЕВА.

Французскія навукоўцы прыйшлі да высновы, што пры прывыканні да пачуцця голаду чалавек атрымлівае пры галаданні такое ж задавальненне, як пры прыёме экстазі.

Абарона супраць коклюшу без процітаказанняў

На базе мінскага гарадскога цэнтра вакцынапрафілактыкі распачынаецца правядзенне імунізацыі супраць коклюшу з выкарыстаннем бясклетачнай вакцыны.

Як патлумачылі спецыялісты аддзела імунапрафілактыкі Мінскага гарадскога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, коклюш — гэта цяжкае інфекцыйнае захворванне, але найбольш небяспечныя яго ўскладненні. Адзначаюцца і смяротныя выпадкі, асабліва ў непрышчэпленых дзяцей ва ўзросце да 6 месяцаў.

Для фарміравання абароны супраць коклюшу могуць выкарыстоўвацца два віды вакцыны: цэльнаклетачныя і бясклетачныя (ацэлюлярныя). Абодва віды вакцын забяспечваюць стварэнне эфектыўнай абароны, аднак пералік супрацьпаказанняў да ўвядзення цэльнаклетачных вакцын больш шырокі ў параўнанні з бясклетачнымі. На сёння сярод маленькіх мінчан каля 3 тысяч дзетак не прышчэпленыя супраць коклюшу па прычыне наяўнасці ў іх супрацьпаказанняў да ўвядзення цэльнаклетачнага коклюшнага кампанента і па некаторых іншых прычынах. Цяпер жа і гэтыя дзеці будуць абароненыя супраць небяспечнай інфекцыі з дапамогай вакцынацыі.

Для іх імунізацыі плануецца выкарыстанне французскай вакцыны «Тэтраксім». Практыка прымянення вакцыны «Тэтраксім» сведчыць аб яе высокай эфектыўнасці і добрай пераноснасці дзецьмі, у тым ліку і тымі, што

Кватэрнае пытанне

Можна выбраць паверх. І дом

Мой сын — інвалід I групы з дзяцінства, стаім у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Патлумачце, ці прадугледжаны законам нейкія спецыяльныя нормы пры прадастаўленні жылля інвалідам?

В. А., *Мінск*

Такія нормы прадугледжаны. Напрыклад, артыкулам 55 Жыллёвага кодэкса Рэспублікі Беларусь вызначана, што пажылым грамадзянам і інвалідам па іх просьбе прадастаўляюцца жылыя памяшканні на ніжніх паверхах або ў дамах, якія маюць ліфты.

Названая норма павінна прымяняцца як пры забеспячэнні жылымі памяшканнямі сацыяльнага карыстання асобных катэгорый грамадзян (якія маюць права на атрыманне такога жылля), так і пры будаўніцтве названымі ў артыкуле 55 ЖК асобамі жылых памяшканняў у складзе арганізацый-забудоўшчыкаў або па дагаворах долевага ўдзелу, і ў іншых выпадках забеспячэння грамадзян жылымі памяшканнямі.

Права інвалідаў (незалежна ад групы) на атрыманне кватэры на ніжнім паверсе або ў доме з ліфтам вызначаецца ўрачэбна-кансультацыйнай камісіяй (УКК) адпаведнай лячэбна-прафілактычнай установы ў парадку, які вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя.

Прымяненне нормы з артыкула 55 ЖК не залежыць ад таго, хто падаваў заяву аб пастаноўцы на кватэрны ўлік, — непасрэдна чалавек, які мае патрэбу з прычыны ўзросту або здароўя ў пражыванні на ніжніх паверхах або ў доме з ліфтам, або хто-небудзь з членаў сям'і, у складзе якой гэты чалавек прыняты на ўлік.

Разам з тым, наяўнасць нормы аб выдзяленні кватэр на ніжніх паверхах або ў дамах з ліфтам па просьбе пажылых грамадзян і інвалідаў зусім не азначае, што яны (па іх жаданні або пры адсутнасці пярэчанняў з іх боку) не могуць атрымаць кватэры на верхніх паверхах, а таксама ў дамах, не абсталяваных ліфтамі.

Ёсць магчымасць застацца

Мы, сям'я з 4 чалавек, жывём у службовай кватэры, 19 гадоў стаім на кватэрным уліку (поўнагадовы сын — самастойна). Цяпер бацьку па месцы працы прапануюць будаваць новае жыллё пры ўмове, што службовае вызваліць уся сям'я. Сын адмаўляецца пераязджаць разам з намі, хоча па сваёй чарзе пабудаваць асобную кватэру. Напішыце, на што мы ўсе маем права, а на што — не.

Л. Ш., *г. Мінск.*

Пры разглядзе гэтага пытання неабходна мець на ўвазе, што ў адпаведнасці з пунктам 77 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўленне жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565), высяленню са службовага жылога памяшкання з усімі грамадзянамі, якія з імі пражываюць, у адпаведнасці з заканадаўствам у судовым парадку падлягаюць работнікі, якія спынілі працоўныя (службовыя) адносіны з дзяржаўным органам або іншай дзяржаўнай арганізацыяй, у гаспадарчым распараджэнні або аператыўным кіраванні якіх знаходзяцца службовыя жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду.

Акрамя таго, дагавор найму службовага жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду скасоўваецца, а грамадзяне, якія пражываюць у гэтым памяшканні, падлягаюць высяленню ў судовым парадку ў выпадку атрымання (набыцця) найманнікам службовага жылога памяшкання ў гэтым населеным пункце жылога памяшкання агульнай плошчай больш за 15 кв. метраў на аднаго чалавека, якое адпавядае вызначаным для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням.

Калі адзін з поўнагадовых членаў сям'і наймальніка знаходзіцца ў працоўных (службовых) адносінах з наймадаўцам і па характары працы ён можа быць забяспечаны службовым жылым памяшканнем, то з ім заключаецца дагавор найму службовага жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду.

Віктар САВІЦКІ.

Прызы «Звязды» — юным лёгкаатлетам

Таццяна Зазнова з Віцебшчыны і выхадзец з Брэсцкай вобласці Аляксей Спірын, які цяпер трэніруецца ў Гомелі, будуць звяраць час па «звяздоўскіх» гадзінніках. Яны былі прызнаныя лепшымі спартсменамі (на здымку) на спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы «Алімпійскія дні моладзі Рэспублікі Беларусь на прызы газеты «Звязда».

Гэтыя спаборніцтвы па традыцыі праходзілі ў гродзенскім спарткомплексе «Нёман» і сабралі каля 250 юнакоў і дзяўчат 1992-1993 гадоў нараджэння з усіх абласцей і сталіцы нашай краіны. Паводле ацэнкі старшага трэнера нацыянальнай каманды па лёгкай атлетыцы па рэзерве Юрыя Майсяевіча, многія з іх паказалі даволі высокія вынікі і з'яўляюцца надзеяй Беларусі на Алімпійскія гульні 2016 года — Канстанцін Карпаў (Віцебск, скачкі ў вышыню), Алена Наўгародская (Гродзенская вобласць, кіданне молата), Дыяна Пажарніцкая (Мінск, кіданне молата), Вікторыя Нікіціна (Гомель, кіданне дыска), Яўген Іваноў (Віцебск, кіданне молата) і іншыя. Асабліва ж вызначыліся Таццяна Зазнова (скачкі ў вышыню), якую трэніруе заслужаны трэнер Беларусі Міхаіл Шур, і Аляксей Спірын у васьмібор'і, чыім настаўнікам з'яўляецца заслужаны трэнер Беларусі Іван Гардзіенка — менавіта сярод яго вучняў і Андрэй Краўчанка, сярэбраны прызёр Алімпійскіх гульняў у Пекіне ў дзесяцібор'і.

Спаборніцтвы ў Гродне сталі заключным этапам адбору на тры найбуйнейшыя міжнародныя чэмпіянаты ў гэтым годзе — чэмпіянат свету па лёгкай атлетыцы сярод юнакоў у Італіі, еўрапейскія спаборніцтвы моладзі ў Фінляндыі і Балтыйскія гульні ў Польшчы. Мяркуецца, што на міжнародным узроўні будзе задзейнічана каля пяцідзесяці юных спартсменаў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.
Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

«ШТО Ў ВАС ДОБРАГА?»

маё хобі. Па тэлебачанні падабаецца глядзець пазнавальныя праграмы. Што яшчэ ў мяне добрага (*смяецца*)? Ну, вось вы патэлефанавалі з пытаннем... Як бы вам сказаць... Так, крыху дзіўным для мяне (*смяецца*).

Аляксандр МАРЦУЛЬ, ваенны пенсіянер, вёска Рэзы Шчучынскага раёна:

— А я ўсім задаволены! Тое, што ў краіне крызіс, як жыву ў гаворыць, не адчуваю. Я жыву ў вёсачцы, на сваёй радзіме, люблю чытаць беларускія газеты, вось і вам дзякую за размову на роднай мове. Рады, што жывыя бацькі, сумна толькі, што ўзрост ужо ў іх... Была ў мяне мара, каб жонка паступіла ў ВНУ, атрымала вышэйшую адукацыю. Вось, ужо другі год вучыцца — завочна паступіла ў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, паехала на сесію. Я з дачкой Машай застаўся, яна сёлета ў гімназію паступае. Хвалюемся і рыхтуемся — да выпускнога балю ў школе, да будучых экзаменаў. Але гэта прыемныя хваляванні. (*Смяецца.*) Я люблю працу па гаспадарцы, люблю зямлю: і ў нас агародзік, і ў бацькоў. Зрабіў вось лазню! Усе задаволены — і дачка, і жонка, і бацькі, і ўсе, хто прыходзіць да нас. Як ваенны пенсіянер — а я служыў у Расіі — атрымліваю адтуль пенсію. Не такую, магчыма, вялікую, але плюс заробак жонкі, што працуе выхавальніцай у дзіцячым садку — і нам хапае...

Дальвіна КАРАЛЁВА, пенсіянерка, г. Слуцк:

— Ведаеце, калі ў мяне пытаюцца, маўляў, Паўлаўна, як маешся, я звычайна адказваю: як і ўсе — дзень пражыла, і дзякую Богу. На жаль, здароўе ўжо не тое... Люблю пацешыць сваіх блізкіх піражкамі, яны іх вельмі паважаюць, прычым з любым начыннем. Чытаць люблю, асабліва гістарычную літаратуру — можна сказаць, што гэта (*смяецца*). Ну, вось вы патэлефанавалі з пытаннем... Як бы вам сказаць... Так, крыху дзіўным для мяне (*смяецца*).

Рыгор МІСКОВІЧ, галоўны інжынер Кобрынскага мясакамбіната:

— Тое, што сёлета сын заканчвае школу! Марыць атрымаць эканамічную спецыяльнасць, магчыма, будзе спрабаваць паступаць у Пінску ў Палескі дзяржаўны ўніверсітэт. Дарэчы, я сам там атрымліваю эканамічную адукацыю. Летась завочна паступіў, у наступным годзе павінен буду скончыць. Дык, калі што, будзем разам з сынам у адным універсітэце вучыцца (*смяецца*). Паступіў, праверыў — добрая навучальная ўстанова, хоць і маладая (*смяецца*)! Калі ж гаварыць адносна працы, дык абнаўляем асартымент прадукцыі, пакрысе павялічваем аб'ёмы вытворчасці. З аднаго боку, прасцей было б у Расіі прадаваць яе, але, з іншага боку, унутры краіны — зручней, ды і айчыннага спажыўца хацелася б накарміць вырабамі, па смаку і якасці набліжанымі да хатніх, пацешыць яго яшчэ большым асартыментам. Паколькі чалавек большую частку часу праводзіць на працы, вось гэтыя намаганні калектыву і вынік яго працы сапраўды радуюць, прыносяць задавальненне. Вось рыхтуемся да мадэрнізацыі абсталявання, якое маральна састарэла. Не забываемся і пра людзей: правялі першую чаргу рэканструкцыі бытовак, плануем другую, магчыма, нават трэнажорная зала будзе.

Сяргей СТАРЫНАЎ.

Рэзананс

«Спадарыня... Дазвольце ёй застацца!»
«Звязда», 8 красавіка 2009 г.

Замарудзіць — можна. Назад павярнуць — ужо не!

Выразкі са «Звязды» я збіраю ўжо больш за трыццаць гадоў. 8 красавіка гэтыя папкі дастойна папоўніў артыкул «Спадарыня... Дазвольце ёй застацца!». У ім я асабіста гатовы падпісацца пад кожным радком. Бо прыкладна тое ж назіраў, пра тое ж думаў.

Зусім нядаўна, здаецца, у нашы галовы ўбівалі — і на поўным сур'ёзе — што хутка ўсе нацыі адной шостай сушы Зямлі сальюцца ў «невиданную доселе общность людей — советский человек» з адной мовай — рускай.

Ва ўніверсітэце я старанна канспектаваў гэтую лухту з вуснаў доктара філасофскіх навук і, не маючы альтэрнатыўнай інфармацыі, верыў. Больш за тое, падчас камандзіровак у Літву нават хацеў пераканаць тамтэйшых калег, што «единая нация с единым языком» будзе — вось паглядзіце!

Яны мяне шчыра шкадавалі, казалі, што нельга з варон, салаўёў і жаўрукоў стварыць гібрыд, а, значыць, ніколі не атрымаецца «невиданной доселе общности птиц», яны даказвалі (не аддавалі дзяцей у рускамоўныя садкі), што ніколі не адракуцца ад роднай мовы...

Каюся: я лічыў іх кансерватарамі, злоснымі нацыяналістамі, я не разумеў тое, што цудоўна разумелі яны: нельга быць чалавекам без роду і племені.

Цяпер, калі гэта «дайшло» (і, дзякуй Богу, не ўчора), лічу, што людзі, якія толькі стогнуць пра гібель мовы і нічога не робяць для яе выратавання — проста дэмагогі.

Я не кажу, што трэба ісці на барыкады — трэба, помнячы, што нарадзіла нас, поіць і корміць беларуская зямелька, што за яе пралівалі кроў нашы продкі, проста размаўляць па-беларуску — на працы, на вуліцах, у крамах, трэба навучыцца выціскаць з сябе рабоў.

Ніколі не забудуся: у сярэдзіне дзевяностых я працаваў у камітэце па ахове прыроды. Справаздачу аб работе за квартал было загадана (было!) пісаць па-беларуску. Няпроста гэта далося, але мы з калегамі выканалі заданне, пераклалі ўсе спецыяльныя тэрміны.

На візу аднаму з чыноўнікаў паперы панёс я. Той паглядзеў у іх і аж закалаціўся — пасінеў, потым збялеў ад злосці, пакрыўся чырвонымі плямамі, завішчаў:

— Что за белеберда?! Что за тарабарщина?! На каком языке это написано?! Пишите на правильном...

Мне было вельмі балюча, вельмі сорамна за гэтага кіраўніка. Але ўсе яго выпады я, тутэйшы, цяпер ліва знёс, аб чым цяперака вельмі шкадую.

А наогул... Мне асабіста становішча з нашай мовай нагадвае сітуацыю з баршчэўнікам Сасноўскага. Ён, як вядома, даспадобы мядзведзям. Але ж нехта «разумны» рашыў, што нідзе не дзенуцца — з'ядуць і каровы... Таму пякучую, ядавітую, шкодную расліну завезлі ў Беларусь. Цяпер гэта страшнае пустазелле запаланіла тут вялізныя тэрыторыі, і калі мы дамо яму волю, ад мноства нашых прыгожых і карысных раслін не застанецца нічога: сімвал Беларусі — васілёк — стане для нашчадкаў забытай кветкай, як сталі для нас непрывычнымі і нават немілагучнымі многія словы — інтэлектуальная праца цэлых пакаленняў прашчураў.

Але ж Беларусь у апошні час стала праводзіць шматвектарную палітыку, стала бліжэй хінуцца да Еўропы. І моладзь краіны ведае ўжо, што нашу, беларускую гаворку ў многіх краінах добра разумеюць. Пісьменнік Яўген Хвалей, прынамсі, расказваў, як ляцеў да дачкі ў Іспанію, і ў Празе, дзе была перасадка рашыў нешта высветліць. Размаўляючы па-руску, ён нічога не дамогся, а перайшоў на беларускую і прагаварыў з людзьмі да раніцы: чэшская і беларуская мовы, канстатаваў пісьменнік — вельмі падобныя.

А значыць наша, родная і першая дзяржаўная, усім нам вельмі патрэбная — не толькі з патрыятычных, але яшчэ і з практычных меркаванняў...

Аднак жа ёсць людзі (нават сярод чытачоў «Звязды»?), якія сцвярджаюць, што «беларус па-беларуску ўжо не загаворыць». Што можна адказаць ім?

На Божы свет кожны глядзіць са сваёй званіцы, у залежнасці ад той долі страху, які засеў у яго душы. Гэты страх, як вядома, з'явіўся не сам па сабе. На працягу стагоддзяў нашых продкаў вешалі, крыжавалі, ссылалі на катаргу за тое, што яны хацелі быць незалежнымі ліцвінамі-беларусамі. І такі дасягнулі сваёй мэты — часткова. Але ж працэс нацыянальнага адраджэння — глабальны, яго можна замарудзіць, а назад павярнуць ужо не! Яўрэі праз дзве тысячы гадоў адрадзілі іўрыт — ужо мёртвую мову. Дык няўжо мы, беларусы, дазволім загінуць жывой?

Уладзімір ШУЛЯКОЎСКІ,
г. Мінск.

Спецчацвёрка Гераяў Савецкага Саюза

Радавыя Перамогі

Дваццаць тры чэкісцкія атрады і спецгрупы дзейнічалі падчас Вялікай Айчыннай у Мінскай вобласці. Сярод згаданых байцоў, якіх больш за тысячу, — чацвёра Гераяў Савецкага Саюза. Алег Бычак, Барыс Галушкін, Фёдар Азміцель і Пётр Лапацін удастоеныя высокага звання ў 1944 годзе, прычым трое — пасмяротна...

Выпускнік Буйнакскага пяхотнага вучылішча **Алег БЫЧАК** быў залічаны ў атрад спецыяльнага прызначэння НКУС СССР у чэрвені 1941 года. Пасля некалькіх месяцаў падрыхтоўкі атрад, куды ўваходзіў Бычак, перайшоў лінію фронту ў раёне Смаленска, дзе граміў невялікія гарнізоны, узрываў масты і камунікацыі праціўніка. У снежні чэкісты вярнуліся на Вялікую зямлю. За рашучыя і смелыя дзеянні ў тыле ворага Алег Бычак быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Хутка пасля таго, як Чырвоная Армія адкінула ворага ад Масквы, Бычака прызначаюць камісарам атрада «Трэція», які рыхтуецца да закіду на тэрыторыю Міншчыны. У красавіку 1942-га атрад з 50 байцоў перайшоў лінію фронту і прыступіў да правядзення дыверсій на камунікацыях праціўніка, разбурэння ліній сувязі, фарміравання новых партызанскіх атрадаў з мясцовых патрыётаў. Чэкісты навучалі іх мінна-падрыўной справе, уменню выяўляць у сваіх шэрагах агентаў СД і Абвера, весці разведку.

Непасрэдны ўдзельнік многіх акцый Алег Бычак у 1943 годзе ўзнагароджваецца другім ордэнам Чырвонага Сцяга, а потым становіцца камандзірам атрада. Да вясны 1944-га на рахунку атрада былі 113 разбітых і пашкоджаных цягнікоў, 752 вагоны, 49 аўтамашын і звыш 2,5 тысячы гітлераўцаў. Нездарма камендант станцыі Дрэтунь аб'явіў: «Хто даставіць камандзіра-камісара жывым ці мёртвым, атрымае вялікую грашовую прэмію».

Рыхтуючы аперацыю па вызваленні Беларусі, камандаванне савецкіх войскаў звярнулася да баявых груп у тыле праціўніка з просьбай максімальна актывізаваць дзейнасць, скіраваную супраць забеспячэння варожага фронту жывой сілай і тэхнікай. У ноч на 7 мая Бычак са сваімі людзьмі выйшаў на чарговую дыверсію. Алег закладваў міну, калі з засады прагучала аўтаматная чарга. Байцы адбілі атаку, але ўратаваць камандзіра не ўдалося.

Алега Сяргеевіча Бычака пахавалі на ўскрайку вёскі Ліпава Мядзельскага раёна, дзе на той момант размяшчаўся штаб атрада. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 5 лістапада 1944 года Алегу Бычаку пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У першыя дні вайны 22-гадовы студэнт **Барыс ГАЛУШКІН** звярнуўся ў ЦК камсамола з просьбай адправіць яго на фронт. Галушкіна залічылі ў 2-ю Ленінградскую апалчэнскую дывізію. У адным з баёў Барыс быў ранены, аднак не паспеў далячыцца, як вярнуўся ў часць, дзе адразу атрымаў новае заданне: дагнаць і вынішчыць роту нямецкіх дэсантнікаў. Усю ноч узвод гнаўся за праціўнікам, і ў жорсткім баі вынішчыў ворага. За гераізм байцы былі прадстаўлены да ўзнагарод, а сам Барыс атрымаў ордэн Чырвонага Сцяга. Праўда, доўгае знаходжанне ў халоднай вадзе і старая рана выклікалі цяжкую форму туберкулёзу, і Галушкіна звольнілі з арміі.

Праз нейкі час Барыс сустрэў аднакурснікаў, якія служылі ў асобнай шматсгралковай брыгадзе асобага прызначэння, рыхтаваліся да задання ў тыле ворага. Хутка Галушкін з атрадам апынуўся за лініяй фронту. На ўчастку Смаленск—Орша—Віцебск байцы пускалі пад адхон эшалоны, грамілі варожыя гарнізоны. Галушкін быў паўсюль, дзе разгараліся асабліва жорсткія баі. Яго паважалі за смеласць і рашучасць, за тое, што ніколі не кідаў таварышаў. Барыс атрымаў другі ордэн Чырвонага Сцяга за тое, што 120 кіламетраў разам з некалькімі таварышамі нёс цяжка параненага падрыўніка і даставіў яго ў шпіталь за лініяй фронту.

Вясной 1943 года гітлераўцы арганізавалі карныя акцыі супраць партызанскай рэспублікі «Дзядзькі Колі» — Пятра Лапаціна. У дапамогу былі падрыхтаваны і выкінуты з парашутаў штурмавыя групы «Дапамога» Барыса Галушкіна і «Гром» Фёдара Азміцеля. У баях Галушкін праявіў сябе рэдкім майстрам кароткага бою, засад, раптоўных налётаў. Неяк, калі атрад вырваўся з акружэння, Барыс Галушкін сказаў: «Калі вырашаецца лёс цэлага атрада, варта пайсці на любую рызыку. Нават калі б мне давялося загінуць...».

У чэрвені 1944 года гітлераўцы акружылі ў раёне возера Палік Барысаўскага раёна некалькі партызанскіх атрадаў. У самыя напружаныя хвіліны бою Галушкін знаходзіўся там, дзе атрадам пагражала найбольшая небяспека. 15 чэрвеня партызанскія злучэнні вырваліся з акружэння. Гэта быў апошні бой чэкіста Галушкіна, які ўратаваў баявых таварышаў, але сам загінуў. Яго пахавалі ў брацкай магіле ў вёсцы Макаўе, непадалёк ад месца свайго апошняга бою. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 5 лістапада 1944 года лейтэнанту Барысу Лаўрэнцьевічу Галушкіну пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Службу ў Чырвонай Арміі **Фёдар АЗМІЦЕЛЬ** пачаў з 1938 года. Вайну сустрэў у баях на подступе да Масквы. А зімой 1942-га лейтэнант Азміцель са сваім разведка-дыверсійным атрадам «Грозны» быў накіраваны ў раён Орша—Віцебск—Смаленск і прыступіў да актыўных баявых дзеянняў.

Разведка паведаміла, што гітлераўцы маюць намер правесці супраць атрада аперацыю «Грэйф». У адзін жнівеньскі дзень вораг пачаў ахопліваць лес з двух бакоў. Можна было незаўважна выйсці з акружэння, але пад ударам апынуліся б іншыя партызанскія брыгады. Каб затрымаць праціўніка і даць магчымасць таварышам падрыхтавацца да сустрэчы з карнікамі, Азміцель загадаў пачаць бой. Змагаліся два дні. Гітлераўцы пусцілі ў ход авіяцыю і артылерыю. У рэшце рэшт Азміцель вывеў байцоў у іншы лес.

Азміцель вяртаецца ў Маскву, фарміруе атрад «Гром» і вясной 1943-га разам з атрадам «Дапамога» Барыса Галушкіна дэсантуецца на Міншчыне, на базе брыгады «Дзядзькі Колі». Летам 1944-га толькі група Азміцеля падарвала 18 воінскіх эшалонаў праціўніка, вынішчыла 45 грузавых аўтамашын, 6 танкаў, 3 масты на аўтамагістралі Масква—Мінск, 8 складоў праціўніка, былі забіты звыш 2,5 тысячы нямецкіх салдатаў. У адказ буйныя нямецкія часці акружылі ў раёне возера Палік звыш 20 партызанскіх брыгад, у тым ліку групу «Гром». Фёдар Азміцель аб'яднаў некалькі партызанскіх атрадаў і павёў іх на прарыў блакады. Большая частка байцоў прарвалася з акружэння, але Азміцелю гэта не ўдалося. Каб не трапіць у палон, ён падарваў сябе гранатай і пазбавіў жыцця звыш дзясятка фашыстаў.

Фёдар Фёдаравіч Азміцель і Барыс Лаўрэнцьевіч Галушкін геройскі загінулі ў адзін дзень. Званне Героя Савецкага Саюза ім прысвоена адным указам. Пахаваны ў адной брацкай магіле ў вёсцы Макаўе Барысаўскага раёна.

Камандзір знакамітай партызанскай брыгады «Дзядзькі Колі» **Пётр ЛАПАЦІН** прыбыў ваяваць на пачатку 1942 года як камандзір разведка-дыверсійнага атрада НКДБ «Бывалыя». Сфарміраваў атрад з таварышаў, з якімі ў самым пачатку вайны ваяваў на акупаванай Браншчыне і Магілёўшчыне. У 1942 годзе кіраўніцтва даручыла Лапаціну стварыць сваю групу. Да жніўня атрад вырас у брыгаду «Дзядзькі Колі». Вось адзін, але досыць значны эпізод работы лапацінцаў. Падчас выканання аднаго задання — па выяўленні найноўшага ўзору процівагаза — агент звярнула ўвагу на лаяльнасць Карала Круга, оберлейтэнанта штаба ваенна-паветраных сілаў групы армій «Цэнтр». У выніку праведзенай работы Круг перайшоў на бок партызанаў і захапіў пры гэтым узор новага афіцэрскага процівагаза, карты 32 дзейных і будучых аэрадромаў, сістэмы іх аховы, інструкцыі радыётэлеграфнай службы авіяцыі, звесткі аб прымяненні хімічнай зброі, і галоўнае — аб наступленні ворага на Курскай дузе.

15 жніўня 1944 года Пятру Лапаціну было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пасля вайны Пётр Рыгоравіч застаўся ў Барысаве, працаваў намеснікам старшыні гарвыканкама, потым райвыканкама. Памёр у 1974 годзе, завяршаў пахаваць сябе ў Будзянічах, непадалёк ад брацкай магілы байцоў брыгады «Дзядзькі Колі».

Святлана БАРЫСЕНКА.

Хто каго?

«А НА ШЫЮ ЖОНКА СЯДЗЕ — І НЕ СКІНЕШ — НЕ ДРУЖБАК»

МЯРКУЮЧЫ па рэдакцыйнай пошце ды тэлефонных званках, многім чытачам спадабаўся ліст спадара Нефідовіча з Лунінеччыны («Звязда», 12 мая) пра наша, беларускае вяселле — са свацьбо́й, заручынамі-запоінамі і шлюбам (а не «бракам»), са спаконвечным абсыпаннем маладых жытам (жыцейкам) — каб шчаслівым было іх жыццё!.. Гэта — важна! Нават надзвычай важна, бо (не вам казаць) будуць шчаслівымі яны — будзе добра іх бацькам, бабулям і дзядулям, сёстрам і братам, будзе надзейна і ўтульна іх дзецям, а далей-болей — радасна сябрам і сяброўкам, суседзям, супрацоўнікам...
Калі, зразумела, іх жаба не задушыць.
Зрэшты, пра яе, пра жабу (тутэйшая, балотная жывёлінка) мы, напэўна, пагаворым у іншы раз, цяпер — ёсць нагода — пра пошукі сваёй палавінкі, пра нялёгкі, як правіла, выбар і новыя ў ім тэндэнцыі, пра адказнасць і падрыхтоўку да сямейнага жыцця, пра яго надзвычай цікавы і прыгожы пачатак:

На вяселлі — шмат абдымкаў,
Жартаў, смеху — о-го-го!
І... бясконца ж тэм для здымкаў
У раздзельчык «Хто каго?»? — мяркуюць сужэнцы Астроўскія з Мінска. Бо даўно ўжо ўдзельнічаюць у звяздоўскім конкурсе і наперад ведаюць, што іх, гэтыя тэмы, сябры па пяру спачатку неяк вы**л**учаць, а потым — паспрабуюць яшчэ і «вы**в**учыць», падзяліцца думкамі. Нават відавочнымі:
Калі ў шлюб, брат, уступаеш,
То, вядома, ужо знаеш,
Што, узяўшыся за гуж,
Не раскажаш, што не дуж? —
на ўсялякі выпадак рашыла ўдакладніць у жаніха Зоя Пятроўна Янучок з вёскі Нагорнае Клецкага раёна. А ён, жаніх (трэба разумець у чорным?), ну не тое, каб адказвае, але ж зразумець дае, што рыхтаваўся да новага жыцця — загадзя і вельмі сур'ёзна. А ў выніку (меркаванне Раісы Сцяпанаўны Васільевай з Гомеля) —
Сябрука падняў ён лоўка —
Вось і ўсё, па трэніроўках...
Бо нявеста маладая
Ужо сукенку апранае:
Зараз, пад наглядам цесця,
Трэба з хаты яе несці.

А можа, усё ж у хату?... І не зараз, а трошкі пазней — ужо законнай жонкаю?

Тут, як сведчыць пошта, што ні край, то звычай. На маёй радзіме, у Чавусах, паведамляе, прынамсі, спадар Гаўрыш з вёскі Навасёлкі Пастаўскага раёна, ужо каторы гадок вясельныя картэжы едуць да рэчкі Басі. Там малады на рукі бярэ маладую і нясе з аднаго канца моста ў другі — не меней за 100 метраў. «Добра як нявеста мініцюрная!», — спагадае землякам Валерый Мікалаевіч.

Але згодны з ім далёка не ўсе. І думкі іх, узгадаўшы вядомую песню, досыць удала агучвае спадар Старых з Гомеля:
Не патрэбна Канстанціну
Працавітая Яніна.
Пакахаў ён Станіславу,
Што займае ўсю лаву...
Пасля года трэніроўкі
Хлопец дужы стаў і лоўкі:
Маладую ў сем пудоў
На руках насіць — гатоў!

Што тут скажаш — малайчына... Што ў пошуках шчасця не стаў кіравацца вядомым стэрэатыпам 90х60х90, што, пакахаўшы, не адступіўся, што адказна паставіўся да сваёй будучай ношы — праз мост, праз парог хаты ці па жыцці наогул...

Хоць спадар Сітнік з вёскі Палажэвічы Старадарожскага раёна лічыць, што на здымку ўсё — якраз наадварот:
Ну не вытрымаў ён тэста...
А не слабы ж быў жаніх?!
Ды... цяжарная нявеста —
Кілаграмаў сто жывых!

Як сведчыць жыццёвы досвед практыка і шматлікія цяпер серыялы, пакінуць яе ў такім вось «непад'ёмным» становішчы, пашукаць сабе ношку лягчэйшую, — ахвотных шмат. Ва ўсе часы і ва ўсіх краінах. Што балюча — нават у нашай. Прынамсі, у Аўцюках ці то жартам ці ўсур'ёз (так не разбярэшся) распавядаюць гісторыю пра тое, як адна кабета сына жаніць рашыла.

— А каго ж мне браць? — пытаецца ён.

— Ну хоць бы Маню суседчыну...

Бацька пра гэту параду пачуў, — адразу ж выманіў хлопца ў сенцы і даверліва так гаворыць:

— Слухай: Маню не бяры. Яна, мусі быць, сястра табе.

Пержагнуўся хлопец і, зразумела ж, не ажаніўся, не ўзяў. Маці — колькі там часу прайшло — зноў сваю «пласцінку» заводзіць: жаніся ды жаніся — ну хоць Алёнку ўдавіну бяры!

Бацька зноўку сына ў сенцы выводзіць і на вуха яму:

— Не бяры, яна дакладна твая сястра.

Прачула маці пра іхнія таемныя размовы і кажа:

— Сынок, жаніся! І тут, у ваколіцах, — з кім толькі хочаш!.. Я табе таксама адкрыюся: гэты ёлупень не бацька табе.

Во! Адчуваеце, як (свят-свят!) можа ўсё заблытацца ! А што самае балючае — не само, а за дурной галавою, як кажуць. Як мужчынскай, так і жаночай.

А разумную цяпер дзе знайсці? Вось, паглядзеўшы на здымак, спадар Сільчанка з Гомеля і выдаў:
Я такі прыдумаў тэкст:
Колісь — «тырылі» нявест.
А як новы век прыйшоў, —
Сталі красці ўжо мужоў...
Не дзівіцесь, не судзіце —
Добры хлопцы ў дэфіцыце.

Значыць, вось гэтага, у светлай сарочцы, зараз у машыну і ў ЗАГС (раз яна адпаведна прыбраная). А што — хоць так, калі **не хоча** падабраму.

Ёсць, аднак, меркаванне (у Вольгі Паўлаўны Лабажэвіч з Клецка), што не можа ён:
Падвярнуў хлапец нагу:
Ой, жаніцца не магу...
Не бяда, — сказаў другі, —
Пераб'ёмся без нагі...
Калі добры ён сябрук, —
Жаніха не спусціць з рук.

Чытайце — данясе, давязе і здасць... «У эксплуатацыю»... Жонцы. А зрэшты —
Век такі і час такі...
Што ўжо тут здзіўляцца:
У загс ідуць і мужыкі —
Зарэгістравацца, —
уздыхае Наталля Пастэрнак з Вілейкі.

Праўда, не ў нас... Што заўважылі многія чытачы і спадар Гарачоў з вёскі Даўнары Іўеўскага раёна ў прыватнасці:
Пакахаў Мікола Васю
(Тут — без каментарыяў)...
Каб жылі яны ў Тэхасе, —
Іх прызналі б параю.

А з чаго ў іх раман мог пачацца, ведае ці здагадваецца Уладзімір Томкавіч з Вілейкі:
Сышліся раз на небе зоркі:
Ім нейкі дурань крыкнуў: «Горка!..»
Пабіць падлюку за абразу?
Ці па жыцці пакрочыць разам? — думаюць цяпер героі здымка — вагаюцца. Але ж рашэнне можа залежаць не столькі ад уласнага жадання, колькі (на думку спадарыні Чыгрынавай з вёскі Забалацце Вілейскага раёна) ад абставінаў:
Божа-божачка, свят-свят!
Ці ж няма вакол дзяўчат?
Ды, як продкі загадалі,
Ў жаніха — нявесту скралі:
Яго ж дружкі, а не бандыты...
На выкуп
банк
не даў крэдыту...

Вось якое гора — крызіс. Эканамічны. «Толькі б не крызіс сям'і! — хвалюецца спадарыня Лабажэвіч, бо
Здымак зроблены ўдалы
На вяселлі ў нефармалаў...
А душа — душа баліць:
Ці ж такому шлюбу быць?

А тым больш, калі навокал столькі дзяўчат, столькі нявестаў — у тым ліку і падрастаючых. Глафіра Ільінічна Малевіч з в. Старына Мядзельскага раёна паглядзела сама на дзяўчынку, што побач стаіць, і ўсім іншым раіць, бо спінка ў яе роўненькая, блузачка белая... Пазірае вось на жаніха і думае:
Мілы дружа мой, Сярожа,
Падымаць хлапца — нягожа!
Лепш на рукі ўзяць мяне —
Бач — стаю ў старане...

Зрэшты, у 10 гадоў гэта, мо і не так яшчэ крыўдна, як у 20 (а тым больш — 30, 40, 50...).

Але ж яе, гэтую крыўду, сужэнцы Астроўскія згледзелі і ў вачах жаніха:
Сум у хлопца у паглядзе,
Уяўляе ён, бядак,
Як на шыю жонка сядзе...
І не скінеш — не дружбак.

Прыйдзецца несці. Прычым, па меркаванні спадара Гаўрыша з вёскі Навасёлкі Пастаўскага раёна, чаго б гэта ні каштавала, бо
Не слабак, ды будзе ж жах,
Калі ў цесця на вачах
Не ўтрымае яго «чадо».
І... бывай тады пасаг,
Дом пад Мінскам і пасада.

Такую вось перамену лёсу і насамрэч вытрымаць можа не кожны! Таму і трэніруецца. Гэтай тэме, дарэчы, прысвечана абсалютная большасць подпісаў... А можна ж убачыць і іншае:
Я пра гэтае здарэнне
Маю дужа версій.
Першая, што маладая —
У шыкоўным «мерсе».
Малады ж, як мне відаць,
Бы дзіцятка з цацкаю
І нясе ён выкідаць
Долю халасцяцкую, —
лічыць спадар Гарачоў з Іўеўшчыны. Яна, гэтая «доля», ну відавочна ж, сама ўскочыла яму на рукі перад аб'ектывам фатографа. І цяпер — пазіруе, усміхаецца. А магла б, па меркаванні таго ж спадара Гарачова, і плакаць:
Пахне, пахне тут калымам...
Нават небараку...
Толькі вось, каб скочыў міма,
То пабіў бы...

Што канкрэтна — ведаеце самі, прамаўляць не будзем, бо неяк не прынята — як быццам і слова такога няма... А месца ж ёсць — без сумневу! У тым ліку і з'яве, якую ўбачыла на здымку спадарыня Тарасік з Мінска:
Эх, жыццё маё, жыццё —
Уверх крутая лесвіца...
Дзе на людскае хлапчо
Абы што павесіцца.

Што ж, здараецца — і «павесіцца», і, асобным, пот

АДКАЗНАСЦЬ ЗА ЯКАСЦЬ — СВАІМ ТВАРАМ

Тавары радавых супрацоўнікаў ААТ «Спартак» зусім хутка з'явяцца на плакатах, якія рэкламуюць вядомыя беларускія цукеркі. Першы намеснік генеральнага дырэктара Аляксандр ДАНІЛАЎ лічыць, што такі маркетынгавы ход яшчэ больш павысіць давер да прадукцыі, якую і так нельга назваць не запатрабаванай.

— Высокая якасць, умераныя цэны і захаванне традыцыйных рэцэптур — гэта вельмі важна. Але ж у маркетынгавай палітыцы ёсць такі спосаб: прыцягненне сваіх работнікаў для прасоўвання прадукцыі прадпрыемства.

— Вы маеце на ўвазе твар вашага генеральнага дырэктара Алесі Самсонавай, які ўжо можна пабачыць на біг-бордах?

— Не толькі. У далейшым мы плануем, каб паўсюль — на рэкламных шчытах, у роліках, на біг-бордах — прысутнічалі выявы супрацоўнікаў прадпрыемства: свае, родныя, мясцовыя твары. Яны рэкламуюць прадукцыю, якую вырабляюць, і адказваюць за яе якасць. І, натуральна, генеральны дырэктар — яна ж у першую чаргу адказвае за ўсё. Таксама будуць людзі непасрэдна з вытворчасці — прадстаўнікі самых розных службаў. Тыя, хто шмат гадоў прапрацаваў на прадпрыемстве. Людзі ім больш давяраюць, чым замежным зоркам.

— Тым не менш, і Люся Лушчык таксама стала «тварам» «Спартака»?

— Яна вядучая аднаго з самых рэйтынгавых каналаў, яе кожны дзень бачаць мільёны беларусаў і ёй давяраюць. Для нас важна, каб чалавек быў «рэйтынгавы» — папулярны сярод насельніцтва.

— Вы не так даўно змянілі брэнды — гэта было выклікана цяжкасцямі з рэалізацыяй беларускіх цукерак на расійскім рынку, калі вядомыя назвы цукерак былі запатэнтаваны расійскімі вытворцамі. Аднак для многіх беларусаў гэта было незразумела.

— Так, «Konfetoff» і «Melanie» замянілі «Спартак» на расійскім рынку. «Konfetoff» цяпер мы пераарыентуем на самы нізкі цэнавы сегмент. У нас плануецца ўводзіць яшчэ больш танны, чым ёсць, цэнавы сегмент, гэта будуць шакаладныя цукеркі з рознай начынкай. І назва «Konfetoff» будзе для іх. Але ж гэта ідэя пакуль у стадыі разгляду. А «Melanie» планаваліся як цукеркі прэміум-класа, але мы зараз і іх пераарыентавалі. «Melanie» — гэта цукеркі з новай тэхналагічнай лініі італьянскай вытворчасці. Аналагаў такому абсталяванню ў Беларусі няма. Новая лінія дала нам і новую тэхналогію вытворчасці шакаладных вырабаў.

— Чым для вас як маркетолага прынцыпова адрозніваюцца беларускі і расійскі рынкі? Няўжо розныя патрабаванні ў нашага пакупніка і расійскага?

— Адрозніваецца. З вопыту і аналізу продажу мы бачым, што на расійскім дрэнна ідуць гандлёвыя маркі і назвы цукерак, шакаладу ці пячэння з нашымі беларускімі назвамі «Спадчына Беларусі», «Белавежскія зубры», «Белая Русь», «Дары Палесся». Яны ўвогуле не любяць любыя нацыянальныя адценні ў назве. Гэта датычыцца ўсё адно якой краіны — Нарвегіі, Кітая або Украіны. Расійскі пакупнік бярэ цукеркі з нейкімі больш абстрактнымі назвамі. Гэта толькі ў падарунак адсюль вязуць з нацыянальнымі назвамі — цукеркі з Беларусі. А калі самі расіяне купляюць у краме — нацыянальнаму не аддаюць перавагу.

— А якім назвам аддаюць перавагу? Англамоўным? Мы такім чынам падманваем пакупніка на ўзроўні падсвядомасці?

— Не, не падманваем. Проста мы гандлюем з 12 краінамі свету — таму на ўпакоўцы ўсё па-англійску ці нямецку. З канвеера адна каробка пайшла ў ЗША, другая — у Расію. Яны аднолькавыя. Адна і тая ж прадукцыя можа трапіць у Германію, а можа — у Хойніцкі раён. Сёння Расія ў аб'ёмах продажаў нашага прадпрыемства займае каля 10 %. Унутраны рынак — каля 80 %. І астатняе — іншыя краіны. Між тым, для прасоўвання сваёй прадукцыі мы ўсё больш выкарыстоўваем інтэрнэт. Гэта і больш танна, і больш эфектыўна. У асноўным выкарыстоўваем банэрную рэкламу і артыкулы на найбольш папулярных сайтах. Акрамя таго, праводзім акцыі па зніжэнні цаны і дэгустацыі — людзі гэта вельмі любяць. Чалавек не купіць, пакуль не каштуе, які ён, новы прадукт.

— Відаць, той жа мэце павінны садзейнічаць і акцыі па зніжэнні цаны. Але ж некаторыя людзі вельмі сумняваюцца, калі бачаць, што значна зніжана цана, і лічаць, што прадукцыя сапсаваная...

— Акцыі мы праводзім кожны месяц па ўсёй Беларусі — асабліва ў фірменным гандлі і гандлёвых сетках. Часам цану зніжаем ад 10 да 20 %, і крама накручвае не 30, а толькі 20 %. Ёсць практыка правядзення такіх акцый, калі тэрміны прыгоднасці падыходзяць да заканчэння — арганізуецца распродаж. І гэта правільна. Але ж мы гэта зараз робім па іншай прычыне. Мы бачым, што ўтварыліся нейкія запасы прадукцыі. Рэнтабельнасць нам дазваляе «скідваць» цану — у тым ліку для таго, каб прыцягнуць пакупніка, каб ён заходзіў у крамы і купляў менавіта нашы цукеркі. Так мы рэгулюем попыт. А залежаў прадукцыі ў нас няма.

— Такім чынам ваша прадпрыемства павольна выплывае з крызісу?

— Вядома ж, выплываем. Аптымізуем затраты. Мы не павялічваем складскія запасы, павялічваем продаж і скарачаем выдаткі. Гэта атрымліваецца за кошт новай лініі па вытворчасці цукерак, за кошт памяншэння энергаспажывання, за кошт пераходу на імпартазамяшчэнне.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

РЭЦЭПТ ДЛЯ ЗНІЖЭННЯ ІМПАРТУ

Зайдзіце ў любую краму, і вы ўбачыце шырокую разнастайнасць прадуктаў харчавання з усіх геаграфічных шыротаў свету. Тут вам грэчаскі ці італьянскі аліўкавы алей, клубнічны польскі канфіцюр, венгерскія леча і кітайскія марынаваныя грыбы-шампіньёны, іспанскія таматы і цытрусавыя, афрыканскія бананы, армянскія каньякі, грузінскія і малдаўскія віны, Хоць дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што, згодна са статыстыкай, 95 працэнтаў харчавога рынку краіны — гэта наша прадукцыя. Разам з айчыннай мяса-малочнай і сокавай прадукцыяй прадаюцца таксама расійскія каўбасы, малочныя прадукты, сокі і напоі.

Прынята Дзяржаўная праграма імпартазамяшчэння. Пра тое, як яна рэалізуецца ў харчовым сегменце, расказвае генеральны дырэктар Навукова-практычнага цэнтра па харчаванні НАН Беларусі, доктар тэхнічных навук, прафесар Зянон ЛОЎКІС.

— Зянон Валянцінавіч, як ваш цэнтр удзельнічае ў рэалізацыі праграмы?

— Галоўным прыярытэтам дзяржаўнай палітыкі ў галіне харчавання павінна стаць падтрымка і стымуляванне тэхналагічных распрацовак для эфектыўнага замяшчэння імпарту прадукцыяй айчыннай вытворчасці. Таму работа, якая праводзіцца нашымі спецыялістамі, арыентавана перш за ўсё на стварэнне і асваенне навукова-тэхнічных распрацовак, попыт на якія дыктуецца не толькі патрэбамі заказчыкаў і спажыўцоў, але і неабходнасцю абароны ўнутранага рынку і айчынных таваравытворцаў імпартазамяшчальнай прадукцыі.

На базе цэнтра створана Цэнтральная дэгустацыйная камісія, якая правярае якасць выпускаемай айчыннай прадукцыі, а таксама прадуктаў харчавання, якія завозяцца ў рэспубліку. І ў сувязі з гэтым функцыі яго значна пашыраны. На базе цэнтра і НДІ мяса-малочнай прамысловасці ствараецца рэспубліканскі даследчы комплекс, які сёлета плануецца ўвесці ў эксплуатацыю. Цяпер цэнтр можа даследаваць прадукты харчавання, якія завозяцца ў рэспубліку, на ўтрыманне ў іх генна-мадыфікаваных арганізмаў, для чаго створана адпаведная лабараторыя.

Лічу, што сёння галоўным рэцэптам для скарачэння імпарту харчавання павінна стаць свая якасная прадукцыя. І мы гатовыя прапанаваць вытворцам новыя рэцэптуры прадуктаў харчавання.

— Якім прадуктам харчавання ў рэалізацыі праграмы імпартазамяшчэння будзе аддадзены прыярытэт?

— Перш за ўсё тым, што выпрацоўваюцца з уласнай сыравіны — малака, мяса, бульбы і гародніны. Пагадзіцеся, што сёння няма асаблівай рацыі завозіць па імпарце цвёрдыя сыры, калі ўласнай прадукцыі выпускаецца больш за 250 найменняў, або закупляць вараную ці вэнджаную каўбасу з высокай доляй штучных напаўняльнікаў, калі свае вырабы значна лепшыя па якасці і нашмат смачнейшыя.

— Якія новыя прадукты харчавання з'явіліся ў Беларусі дзякуючы распрацоўкам вучоных вашага цэнтра?

— Цэнтрам распрацавана больш за 3 тыс. новых рэцэптур па розных кірунках. Улічваючы актуальнасць і важнасць вывучэння праблем рацыянальнага харчавання, створаны аддзел харчавання. Цяпер вучоныя цэнтра працуюць над стварэннем новых айчынных прадуктаў харчавання (на плодагароднінавай аснове, мясных, малочных і інш.), распрацоўваюць новыя тэхналогіі для прадпрыемстваў харчовай прамысловасці. Напрыклад, для таго, каб знізіць імпарт дзіцячага харчавання, распрацавана цэлая гама сухіх малочных сумесяў, якія адпавядаюць лепшым сусветным узорам. Укаранёныя ў вытворчасць кісламалочныя прадукты і малочныя сумесі з дабаўкамі, новыя віды кансерваў з дадатковым увядзеннем вітаміну С і бэтакаратіну, а таксама цынку, ёду, кальцыю, харчовых валокнаў.

У мэтах павышэння ўтрымання кальцыю распрацаваны асартымент кансерваў з дабаўленнем малочных прадуктаў (малака, вяршкоў, тварагу, ёгурту): пюрэ з яблыкаў і гарбуза з кукурузнымі крупамі, малаком і вітамінам; пюрэ з кабачкоў і чарніц з ёгуртам, жалезам і вітамінам С. Мы асабліва рэкамендуем выкарыстоўваць у харчаванні дзяцей прадукты, якія ўтрымліваюць харчовыя валокны.

Упершыню створана тэхналогія перапрацоўкі спаржавай і харчовай фасолі на КСУП «Брылёва». На прадпрыемстве ў 2008 годзе ўжо было выраблена 114,8 тыс. умоўных слоікаў кансерваў са спаржавай фасолі. Сёлета будзе выпушчана ў два разы больш, што дазволіць забяспечыць у поўным аб'ёме ўнутраны рынак гэтым відам прадукцыі. Так на справе і ажыццяўляецца праграма імпартазамяшчэння. Цяпер мы зможам самі пастаўляць на знешні рынак гэту прадукцыю. Хоць у 2007 годзе імпартавалася да 200 тыс. слоікаў фасолі.

Распрацаваны новыя віды кансерваў: фасоля кансерваваная, пікантная, у тамат-най заліўцы, з гародніной, «Фасолька смачная», «Асарці брылёўскае».

Упершыню ў Беларусі распрацавана тэхналогія вытворчасці новага віду цвёрдага сычужнага сыру кшталту «Эменталь», які па сваіх арганалептычных паказчыках не саступае імпартным аналагам сыроў швейцарскага тыпу. Гэты від сыру выпускаецца на Пастаўскім малочным заводзе пад гандлёвай маркай «Тызенгаўз». Нядаўна на Навагрудскім масларобным камбінаце пачалася прамысловая вытворчасць новага віду сыру з чэдэрызацыяй сырнай масы кшталту «Чэдэр» пад гандлёвай маркай «Чэдэр-Бел».

У 2008 годзе цэнтр па харчаванні пачаў работы па стварэнні айчыннага сухога бактэрыяльнага канцэнтрату балгарскай палачкі, якая выкарыстоўваецца пры вытворчасці ёгурту. Рынак ёгурту ў Беларусі шырока прапануе вырабы замежных кампаній. Штогод завозіцца па імпарце гэтай прадукцыі на $8—10 млн. Таму актуальнасць гэтай распрацоўкі таксама дастаткова відавочная.

Для забеспячэння алкагольнай прамысловасці высакаякаснай прадукцыяй, выкарыстаннем ягаднай сыравіны, плануецца распрацаваць тэхналогіі вытворчасці сідраў і кальвадосаў. Першы від сідру ўжо выпускае Мінскі завод вінаградных вінаў.

Створана больш за 60 рэцэптур хутказамарожаных прадуктаў з бульбы і гародніны. Гэта дазволіць знізіць імпарт аналагічнай прадукцыі на 50 працэнтаў. А распрацаваныя вучонымі Беларусі рэцэптуры эмульсійных соусаў перавышаюць па якасці і смаку некаторыя замежныя аналагі. Вучоныя цэнтра стварылі рэцэптуры алейна-тлушчавай прадукцыі функцыянальнага прызначэння на аснове раслінных сыравіны, натуральных харчовых сумесяў і прыпраў, якія надаюць непаўторныя смакавыя якасці гатовым прадуктам. Выпуск эмульсійных соусаў па новых рэцэптурах арганізаваны на Мінскім маргарынавым заводзе і Гомельскім тлушчавым камбінаце.

Напрыклад, эмульсійны соус «Дары лесу» ўтрымлівае рафінаваны дэзадарыраваны раслінны алей, мадыфікаваны крухмал, гародніннy і грыбны напаўняльнік, сумесь спецый, абагачаны поліненасычанымі тлушчавымі кіслотамі і вітамінным прэміксам. Прыкладна такое ж утрыманне мае эмульсійны соус «Стракаты» («Пестрый»), але ў ім больш агароднінных напаўняльнікаў і дабаўлены папрыка з цыбуляй, таму ён значна вастрэйшы. Прысутнічаюць на рынку і іншыя соусы, створаныя таксама па рэцэптурах НВЦ, — «Беларускі з хрэнам», «Грыбны», «Тар-тар», «Пікантны». Дзясяткі новых соусаў пад брэндам «Залатая кропля» выпускае Мінскі маргарынавы завод.

У адрозненне ад замежных аналагаў, наша прадукцыя ўтрымлівае толькі натуральныя інгрэдыенты, у нас не прымяняюцца кансерванты. Для прадпрыемстваў распрацавана дастаткова рэцэптур, каб можна было абнаўляць асартымент і забяспечваць рынак уласнай прадукцыяй, выключаючы імпарт.

Нядаўна на рынку з'явіўся льняны харчовы алей. Калі раней ён у асноўным прадаваўся ў аптэках як харчовая дабаўка, то цяпер выпускаецца, як і рапсавы і сланечнікавы алеі, для штодзённага ўжывання.

Спецыялісты НВЦ па харчаванні стварылі спецыяльныя віды маянэзаў для дзіцячага харчавання. Іх асаблівасць з'яўляецца адсутнасць у складзе гарчыцы і воцатнай кіслаты — яна заменена лімоннай, таму такі маянэз мае паніжаную каларыйнасць. У складзе маянэза «Бадзёрасць» («Бодрость») выкарыстоўваецца заменнік цукру раслінная паходжання — сцевіязід. На Усерасійскім аглядзе якасці алейна-тлушчавай прадукцыі маянэз «Бадзёрасць» узнагароджаны сярэбраным медалём. Маянэзы «Бадзёрасць» і «Школьны» — спецыяльным дыпломам як прадукты дыетычнага прызначэння. У параўнанні з 2004 годам выпуск гэтых маянэзаў у 2008 годзе павысіўся ў 16 разоў. Усе гэтыя новыя віды прадукцыі мы дэманструем на выставе «Харчовая індустрыя», якая пройдзе 2—5 чэрвеня ў Мінску ў рамках «Беларускага аграпрамысловага тыдня».

Таццяна ЛОБАС, *БЕЛТА.*

Замест «Залатога талера» — «Франсабанк»

Ліванскі «Франсабанк» набыў беларускі банк «Залаты талер». Кантрольны пакет акцый належыць арабскім банкірам, якія маюць намер пашыраць сваю прысутнасць у краіне. Такім чынам, «Франсабанк» рэалізуе стратэгію па пашырэнні сваёй прысутнасці на перспектыўных рэгіянальных і міжнародных рынках з высокім узроўнем эканамічнага і інвестыцыйнага патэнцыялу.

У размове Старшыня банка Аднан Касар заўважыў, што ўжо да канца года статутны капітал банка будзе павялічаны амаль у два разы. Гэта дасць магчымасць развіваць дадатковыя банкаўскія паслугі, адкрыць сетку філіялаў па ўсёй Беларусі. Акрамя гэтага, Аднан Касар запэўніў, што ён будзе садзейнічаць прыцягненню міжнароднага і прыватнага арабскага капіталаў у рэспубліку.

Аднан Касар упэўніў, што ўваход «Франсабанка» ў беларускі банкаўскі сектар прыцягне на гэты рынак вядучыя замежныя банкі і фінансавыя арганізацыі, якія з'яўляюцца акцыянерамі і партнёрамі «Франсабанка», а менавіта найбуйнейшы банк Францыі Credit Agricole SA, нямецкая Кампанія Інвестыцый і Развіцця (DEG), якая належыць ураду Германіі, Грамадскі інстытут сацыяльнай аховы ў Кувейце (PIFSS) і французскі Нацыянальны саюз Ашчадных кас — адна з найстарэйшых банкаўскіх груп Францыі.

Даведка: Аднан Касар вядомы грамадскі дзеяч і бізнэсмен. У кастрычніку 2004 года ён быў назначаны міністрам эканомікі і гандлю Лівана, узначальваў больш за 30 гадоў Ліванскі нацыянальны камітэт Міжнароднай гандлёва-прамысловай палаты, а ў 1997 і у 1998 гадах абіраўся віцэ-прэзідэнтам Міжнароднай гандлёва-прамысловай палаты, у 1999 і 2000 гадах быў прэзідэнтам гэтай арганізацыі.

Цяпер А. Касар з'яўляецца Старшынёй Саюза гандлёва-прамысловай і сельскагаспадарчай палат арабскіх краін, Старшынёй ліванскай эканамічнай арганізацыі, прэзідэнтам банкаўскай групы «Франсабанк».

Даведка: «Франсабанк» заснаваны ў 1921 годзе і з'яўляецца найстарэйшым банкам Лівана. «Франсабанк» — адзін з вядучых ліванскіх банкаў. На канец снежня 2008 года «Франсабанк» меў наступныя паказчыкі: актывы — 8,45 млрд долараў, акцыянерны капітал — 756 млн долараў, крэдыты кліентам — 1,7 млрд долараў, укладзі кліентаў — 7,15 млрд долараў. «Франсабанк» мае прадстаўніцтвы ў Францыі, Алжыры, Сірыі, Судане, Кубе, Лівіі.

Таццяна ПРУС.

ВІЦЕБСКІ АЭРАПОРТ РЭКАНСТРУЮЮЦЬ,

ён стане сучасным лагістычным цэнтрам, для мясцовай авіякампаніі купяць самалёты.

— Фактычна віцебская авіякампанія ўжо створана, — распавядае карэспандэнту «Звязды» **начальнік Віцебскага філіяла РУП «Белаэранавігацыя» Сяргей РУРЫС**. — Пакуль што ў ёй усяго некалькі супрацоўнікаў. І, зразумела, на сёння няма ні аднаго ўласнага самалёта, ні экіпажаў. Каб «мякка» ўвайсці на рынак авіяперавозак, дзе вялікая канкурэнцыя, трэба вызначыць, якія менавіта авіяцыйныя маршруты мы маглі б узяць на сябе. Альбо лятаць далёка — нават за акіян, альбо ажыццяўляць так званыя «рэгіянальныя» рэйсы, напрыклад, у Варшаву, Маскву. Адпаведна трэба закупляць самалёты канкрэтнага класа. Вядома ж, вялікія фінансавыя выдаткі самастойна прадпрыемству не пацягнуць, неабходна грунтоўная падтрымка з боку ўладаў. Губернатар яе паабяцаў.

Паводле слоў спадара С. Рурыса, вельмі прыбытковымі могуць быць рэгулярныя рэйсы Віцебск — Масква, Віцебск — Калінінград. Дарэчы, у Калінінград ужо цяпер можна ўляцець з Віцебска па нядзелях на самалёце Гомельскай авіякампаніі. І гэта, на жаль, адзіны рэгулярны пасажырскі маршрут. Што датычыцца так званых чартарных рэйсаў, фактычна штодня ў Віцебску садзяцца самалёты.

— Але, безумоўна, гэтага мала. Хочацца, каб з Віцебскага аэрапорта кожны дзень можна было вылятаць у розныя кірункі, — працягвае начальнік філіяла. — Напрыклад, у сонечную Італію. Не буду хаваць — вялікі інтарэс да развіцця магчымасцяў Віцебскага аэрапорта праяўляюць італьянскія інвестары. Тых, хто таксама гатовы ўкласці грошы ў віцебскую авіяцыю, шукаюць і ў іншых краінах.

Безумоўна, і Віцебскі аэравакзал стане сучасным комплексам абслугоўвання пасажыраў. Аэрапорт будзе сучаснай базай па абслугоўванні нават вялікіх самалётаў. Плануецца пабудаваць ангар для «Боінга». А, памятаецца, у лiхія 1990-я авіятарам на поўным сур'ёзе прапаноўвалі... на тэрыторыі аэрадрома пасвіць коней. Было такое.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Выдавецтва «Кнігазбор»
ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ
ЯКАСЦЬ
СЦІСЛЫЯ ТЭРМІНЫ
НІЗКІЯ ЦЭНЫ
Прымае заказы на выданне кніг і брашур ад 100 асобнікаў
Тэлефоны (017) 204 86 97
МТС (029) 772 19 14
Velcom (029) 682 83 86
Дыплом № 02332/0131712 ад 12.05.2006 г.

Карупцыя дастала!

Кіраўнікі самых вялікіх і ўплывовых кампаній планеты падтрымалі антыкарупцыйны пакт ААН.

У адпаведным лісце на імя Генеральнага сакратара Пан Гі Муна група выканаўчых дырэктараў шэрагу вядучых кампаній свету заявілf аб сваёй падтрымцы канвенцыі ААН па барацьбе з карупцыяй. Яны адзначылі вострую неабходнасць яе ўтаймавання і стварэння роўных умоў для дзейнасці ўсіх суб'ектаў сусветнай эканомікі.

Аўтары ліста характарызуюць канвенцыю як вельмі важны дакумент, які мае вырашальнае значэнне ў цяперашнюю эпоху фінансавых і эканамічных узрушэнняў і здольны прадухіліць «эрозію этычных стандартаў, пераадолець наступствы якой будзе вельмі цяжка».

Дырэктары кампаній таксама падкрэслілі, што рэалізацыя канвенцыі пашле надзвычай пазітыўны сігнал міжнародная дзелавой супольнасці.

Сярод падпісантаў, у прыватнасці, выканаўчыя дырэктары японскай карпарацыі «Фуджы Ксеракс», амерыканскай фірмы «General Electric», швецкай кампаніі «IKEA», нідэрландскай «Royal Dutch Shell», кітайскай карпарацыі «Sinosteel», індыйскай фірмы «Tata Sons» і швейцарскай «Цюрыхскай фінансавай групы».

Леанід ТУГАРЫН.

АРЫШТАВАНА ЦЫГАРЭТ НА BR509 МЛН

Органамі фінансавых расследаванняў КДК падчас мерапрыемстваў па кантролі за незаконным увозам у краіну тытунёвых вырабаў за чатыры месяцы было арыштавана больш як 180 тысяч пачкаў цыгарэт на суму 509 мільёнаў рублёў.

Як паведамілі карэспандэнту нашай газеты ў прэс-службе Камітэта дзяржкантролю, сёлета назіраецца пэўнае зніжэнне актыўнасці правапарушальнікаў, якія зарабляюць на «шэрым» увозе цыгарэт, тым не менш, клопатаў у прадстаўнікоў фінансавай міліцыі пакуль і тут хапае. Так, на днях супрацоўнікі УДФР КДК па Гродзенскай вобласці ў Гродне затрымалі мужчыну, які на сваім аўто перавозіў паўтары тысячы пачкаў расійскіх цыгарэт, якія не мелі беларускіх акцызных марак. А пазней у яго дома было знойдзена і канфіскавана яшчэ 4,1 тысячы пачкаў аналагічнага тавару.

Ігар ГРЫШЫН.

ФАЛЬШЫВЫЯ РАСІЙСКІЯ ГРОШЫ

Адначасова дзве фальшыўкі намаліам у тысячу расійскіх рублёў знайшлі пры пераліку грошай у галаўным офісе аднаго з банкаў. Эксперт пацвердзіў, што грошы несапраўдныя. Вызначана, што адна з купюр паступіла з філіяла ў вёсцы Селішча, а другая — з філіяла ў Навабеліцкім раёне Гомеля.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Турэцкі бераг і «Аўгустоўскае колца»

Лета-2009

Варыянты адпачынку — на любы густ і кашалёк

Дзясяткі розных прапаноў па адпачынку і падарожжах, лячэнні і аздараўленні прэзентаваліся на гарадскім турысцкім кірмашы «Лета-2009», які нядаўна прайшоў у Гродне. Пасля знаёмства з рэкламнымі матэрыяламі турфірмаў хтосьці, напэўна, аддаў перавагу крымскім альбо турэцкім пляжам, а нехта, мажліва, вырашыў актыўна адпачыць у Беларусі, на Аўгустоўскім канале.

На жаль, размешчаныя на Гродзеншчыне аграгурыстычныя сядзібы на кірмашы прадэманстраваны не былі. А вось колькасць прапаноў у замежным кірунку на прычыне сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу зусім не скарацілася. Адпачынак у Крыме, Турцыі, Егіпце, Балгарыі, Румыніі, Чарнагорыі, Харватыі, Венгрыі, Іспаніі, экскурсійныя туры ў Чэхію, Швейцарыю, краіны Прыбалтыкі, Фінляндыю, Швецыю, Германію, Польшчу, Італію, Англію... Як бачна, ёсць з чаго зрабіць свой выбар. Але на якіх жа фінансавых умовах? Цэны, сцвярджаюць тураператары, у параўнанні з мінулым годам практычна не павялічыліся, а па некаторых кірунках нават крыху зменшыліся. Быццам, і радавацца трэба, але ж расцэнкі пазначаны ў доларах ці еўра і ўсе ведаюць, колькі беларускіх рублёў гэта валюта «важыла» летась і колькі — сёлета. А ці шмат у каго сёлета павялічылася зарплата?

І ўсё ж, як сцвярджаюць прадстаўнікі турыстычных кампаній, магчымасць зэканоміць на кошце пуцёвак ёсць. Гэта можна зрабіць за кошт ранняга браніравання, калі цэны даволі істотна адрозніваюцца ад базавых. Праўда, у нас яшчэ не стала нормай загадзя планаваць і тым самым рабіць больш танным свой адпачынак, а турфірмы не надта заклапочаны інфармаваннем аб «казырных» варыянтах. Вось і атрымліваецца, што патэнцыяльныя кліенты прыходзяць на турысцкі кірмаш, аднак ранняе браніраванне на гэты час ужо закончылася.

Зрэшты, не трэба адчайвацца, калі па тых ці іншых прычынах не ўдалося трапіць на турэцкі бераг. Мо, азнаёміцца і з прапановамі па Беларусі? У прыватнасці, гродзенскае турыстычнае бюро «Каляда Тур» праводзіць ажно 18 розных экскурсій для школьнікаў і арганізацый — па тэрыторыі не толькі Прынямоння, але і іншых рэгіёнаў Беларусі. А ў турагенцтва «Нямнова Тур» варта звярнуцца тым, хто знаёмства з прыродай і гісторыяй роднага краю хоча сумясціць з актыўным адпачынкам у маляўнічых мясцінах на Аўгустоўскім канале. Падчас воднага паходу «Аўгустоўскае колца», разлічанага на адзін-два дні, вы пад кіраўніцтвам дасведчанага інструктара станеце ўдзельнікам сплаву па рэках Асташанка, Нёман і Аўгустоўскім канале з праходжаннем адзінага на ім чатырохкамернага шлюза «Нямнова». Побач размешчаны шлюз-рэгулятар «Куркуль» і міні-ГЭС «Нямнова». Дарэчы, у вёсцы Нямнова знаходзіцца музей канала. Экспанаты для яго сабраны сям'ёй Зажэцкіх, якая доўгія гады працуе на абслугоўванні гэтага ўнікальнага гідратэхнічнага аб'екта.

Не менш, а, пэўна, яшчэ больш уражанняў будзе і ад водна-веласіпеднага паходу «Аўгустоўскі шлях», які разлічаны на тры-чатыры дні. Спачатку аматары актыўнага адпачынку на байдарках (імі, як і веласіпедамі, забяспечвае турфірма) накіроўваюцца да шлюза Дамброўка. Далей падарожжа працягваецца на веласіпедах з аглядам абарончых збудаванняў «Лініі Молатава» і Сапоцкінскага заказніка дзікарослых раслін. Пабываўшы на берагах цудоўных лясных азёраў Яндрэня, Кавеня, Савек, турысты зноў перасаджваюцца ў байдаркі і працягваюць сплаў па чысцютках рэках Марыха і Чорная Ганча. Акрамя таго, у праграме паходу знаёмства з архітэктурнымі помнікамі XVII—XIX стагоддзяў у Сапоцкіне, Радзівілках і Свяцку...

Дарэчы, згодна з нядаўняй пастановай Савета Міністраў Беларусі № 407, зацверджана Дзяржаўная праграма развіцця беларускай часткі Аўгустоўскага канала на 2009 — 2011 гады. На яе рэалізацыю запланавана затраціць больш за 10,8 мільярда рублёў дзеля таго, каб канал пераўтварыўся ў адзін з вядучых цэнтраў актыўнага воднага і экалагічнага турызму ў Беларусі. Праграма прадугледжвае не толькі комплекснае эканамічнае развіццё беларускай часткі канала, але і рэстаўрацыю і музеефікацыю размешчаных у яго зоне помнікаў гісторыі і архітэктуры, адкрыццё турысцка-інфармацыйных цэнтраў і нават конкурс на распрацоўку турыстычных лагатыпаў Аўгустоўскага канала і Гродзенскай вобласці.

Для прыцягнення айчынных і замежных інвестараў беларуская частка канала і сумежныя тэрыторыі будуць уключаны ў свабодную эканамічную зону «Гроднаінвест». Мяркуецца, што гэта дапаможа стымуляваць развіццё турыстычнай інфраструктуры. Пры гэтым не менш важнай задачай, як сказана ва ўрадавым дакументе, з'яўляецца захаванне экалагічнага асяроддзя басейна Аўгустоўскага канала і Нёмана.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Фота БЕЛТА.

Трэці Дзень нямецкай эканомікі

З чэрвеня ў Беларусі пачнецца чарговы Дзень нямецкай эканомікі — трэці па ліку. Яго арганізатарамі выступілі нямецка-беларускі эканамічны клуб і прадстаўніцтва нямецкай эканомікі пры падтрымцы і садзейнічанні пасольства Германіі ў Рэспубліцы Беларусь.

Сёлета Дзень нямецкай эканомікі прысвечаны сельскай гаспадарцы, а таму яго правядзенне прымеркавана да адкрыцця ў сталіцы знакамітай выставы «Белагра-2009». Таму ў праграме Дня асаблівае месца займае работа яго ўдзельнікаў на гэтай выставе. Там нямецкія госці будуць мець цудоўную магчымасць на свае вочы ўбачыць розную сельгаспрадукцыю і тэхніку для вёскі айчыннай вытворчасці, змогуць пазнаёміцца з экспартным патэнцыялам сельскай гаспадаркі нашай краіны. «Беларускі аграпрамысловы тыдзень-2009» (адно з ключавых мерапрыемстваў выставы) таксама дазволіць звесці разам і пазнаёміць нямецкіх і беларускіх прадпрымальнікаў, якія займаюцца сельскай гаспадаркай і працуюць у харчовай індустрыі.

Як і ў мінулыя гады, экспазіцыя Германіі стане адной з самых вялікіх і разнастайных сярод замежных удзельнікаў выставы. Каля 30 нямецкіх фірмаў прадэманструюць на выставе сваю прадукцыю. Так, Федэральнае міністэрства эканомікі і тэхналогій ФРГ арганізуе сумесны стэнд у раздзеле «Харчовая індустрыя», а Федэральнае міністэрства сельскай гаспадаркі, харчавання і аховы правоў спажыўцоў — сумесны стэнд нямецкіх фірмаў, якія разлічваюць праз удзел у выставе наладзіць новыя сувязі з беларускімі партнёрамі.

Ёсць усе шанцы спадзявацца, што Дзень нямецкай эканомікі дасць імпульс пашырэнню эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Германіяй.

Леанід ТУГАРЫН.

«Белагра-2009»

З 2 па 5 чэрвеня пройдзе «Беларускі аграпрамысловы тыдзень» — найбуйнейшы форум беларускіх аграрыяў, работнікаў харчовай індустрыі і іх замежных партнёраў.

— Адметнасцю сёлетняга форуму з'яўляецца істотнае расшырэнне фармату правядзення выстаў, — паведаміла **прэс-сакратар Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Дар'я КАЗЛОЎСКАЯ**. — Традыцыйна 5-ая міжнародная выстава «Харчовая індустрыя», 12-ая міжнародная выстава «Упакоўка і этыкетка», 4-ая міжнародная выстава «Мікраклімат і холад» пройдуць у Футбольным манежы (праспект Пераможцаў, 20/2). Экспазіцыя 19-ай міжнароднай выставы «Белагра-2009» размесціцца на дзвюх пляцоўках: у Нацыянальным выстаўным цэнтры «БелЭкспа» (праспект Пераможцаў, 14) і на базе сельскагаспадарчага прадпрыемства Мінскага раёна ААТ «Гастэлаўскае».

Каля 80 % усёй экспазіцыі Беларускага аграпрамысловага тыдня зоймуць беларускія арганізацыі. Сярод замежных краін найбольш маштабна будуць выглядаць Германія, Расія, Італія, Польшча, Украіна, Літва, Нідэрланды, Аўстрыя і іншыя.

Удзельнікаў і гасцей форума чакае шмат сюрпрызаў. Яны змогуць пазнаёміцца з дасягненнямі сучаснай селекцыі сельскагаспадарчых культур, з айчыннай і замежнай сельскагаспадарчай тэхнікай, ацаніць магчымасці новых сельгасагрэгатаў на дэманстрацыйных паказах. Акрамя таго, у межах Беларускага аграпрамысловага тыдня ўпершыню пройдзе Рэспубліканскі конкурс аратых. На экспазіцыі ў ААТ «Гастэлаўскае» будзе арганізаваны гандаль харчовымі і нехарчовымі (сувеніры, інвентар для саду і агарода і г.д.) таварамі.

Надзея ДРЫЛА.

КІРМАШ
штотыднёвы рэкламны выпуск № 10 (610)
адрэсел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Кватэра 2-пакаёвая (41 кв.м), 1 паверх. $25 тыс. у г. Орша.
Тэл.: 8 0216 29 52 92, 8 029 517 41 82.

❒ Кватэра 1-пакаёвая з выгодамі, 2-гі паверх у в. Любань Вілейскага раёна.
Тэл.: МТС 775 35 35, Вэлком 690 78 70.

❒ Зруб новы 5х5, паўбрус у камплекце ўся кроквенная сістэма, цана па дамоўленасці.
Тэл.: 8 029 550 39 28, 8 01772 53 926.

❒ «Мерседэс-123» 1983 г.в., 2,4 Д, фаркоп, сігналізацыя, выдатны стан, цана па дамоўленасці.
Тэл. 8 029 723 06 67.

❒ «Форд-транзіт» 1991 г.в., 2,5 Д, чырвоны, 8 + 1 месца, $3700.
Тэл. 8 029 582 23 92.

❒ Запчасткі да Лідскай бульбакапалкі.
Тэл. 8 01770 65 507.

❒ Драўляная скульптура для эстэтычнага аздабл

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



Падчас святкавання 1147-годдзя Полацка 30 мая адбылося ўрачыстае адкрыццё новага гарадскога помніка. На гэты раз героем свята стаў апошні полацкі князь Андрэй Альгердавіч.

ПЕРШЫ ЦАЛКАМ ПОЛАЦКІ ПОМНІК

Андрэй Полацкі, як яго яшчэ звалі, быў старэйшым сынам Альгерда, мужным ваяром, які загінуў на полі бітвы. Дарэчы, ужо прайшло 610 гадоў з таго дня.

Стварыў помнік скульптар Ігар Голубеў на сродкі палачаніна Аляксандра Лукашова, у якога з'явілася ідэя ўвекавечання славутага земляка. Была ідэя стварэння драўлянага манумента, але ў рэшце рэшт рэалізавалася яна ў чугуне, а выглядае помнік зараз і зусім не горш за бронзавы.

Між іншым, помнік Андрэю Полацкаму — гэта першы цалкам полацкі помнік — ад ідэі да ўвасаблення.

Як упэўніў старшыня полацкага гарвыканкама Уладзімір Тачыла, напарадзе помнікі дойліду Іаану (ужо да восені), Рагнедзе і помнік удзельнікам вайны 1812 года.

Дар'я ПРЫШЧЭПАВА. Фота аўтара.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Крыжаванка (30 мая). Па вертыкалі: 1. Акрабатыка. 2. Слота. 3. Старыца. 4. Юшка. 6. Апал. 7. Магістр. 8. Кухан. 9. Карыкатура. 11. Рала. 16. Арматура. 17. Пагорак. 18. Баяніст. 19. Плацдарм. 24. Макуха. 25. Памост. 29. Балканіст. 30. Шаўкапрад. 31. Магерка. 33. Гаршчок. 35. Уцеха. 36. Раб. 37. Дол. 38. Сак. 39. Акт. 44. Армада. 45. Удыханне. 47. Абяцанне. 48. Сяннік. 49. Тачанка. 50. Уступка. 52. Народнасць. 54. Іпахондрыя. 58. Гамёлак. 59. Лансада. 64. Быдла. 66. Клюз. 67. Гліна. 69. Хала. 70. Кары. **Па гарызанталі:** 3. Склюд. 5. Фатум. 10. Акалот. 12. Агузак. 13. Акравак. 14. Фактура.15. Сібарыт. 17. Паб. 20. Шал. 21. Сцірта. 22. Аплата. 23. Хаз. 26. Вымах. 27. Самотніца. 28. Гарус. 31. Макулатура. 32. Стаматолаг. 34. Кут. 36. Расклад. 38. Смаката. 40. Ежа. 41. Опера. 42. Кош. 43. Барнаул. 46. Кампост. 49. Тау. 51. Анамастыка. 53. Святаяннік. 55. Крэда. 56. Пацалунак. 57. Пісаг. 60. Юда. 61. Хаднік. 62. Кантар. 63. Чоп. 65. Ака. 68. Матылёк. 71. Асалода. 72. Малюнак. 73. Сцілка. 74. Данцыг. 75. Куфар. 76. Выспа.

Казкі XXI стагоддзя

Каму нашкодзіў вірус Шкодзя?

Вы ведаеце, якая цацка адна з найбольш папулярных у сучасных малых? Пасля Новага года, калі мой чатырохгадовы сынок схадзіў у садок, ён пачаў мне дакладаць, што гэтую рэч ужо мае амаль не палова групы, і яму б таксама хацелася. І канькаў ён у мяне... дзіцячы камп'ютар. Складаная апаратура ўсё больш пранікае ў наша жыццё, калі нават самыя малыя становяцца тэхнічна прасунутымі.

Пад сучасныя рэаліі даводзіцца перастройвацца і нашым дзіцячым пісьменнікам. Так, у гэтым годзе выдавецтва «Мастацкая літаратура» выдала на беларускай мове кніжку Анатоля Бутэвіча «Прыгоды Віруса Шкодзі», і ў ёй галоўныя персанажы — гэта не звычныя для нас прыгажуні, каралі і разбойнікі, а жывыя істоты з тэхнічнымі імёнамі: кароль Віндаўс Вялікі, яго дачка Віндусачка, Мышка, Памяць, Клавіятура, Працэсар і, само сабой, самы галоўны свавольнік і ліхадзей Вірус Шкодзя. І жывуць гэтыя героі на далёкай планеце ў незвычайным каралеўстве — Сусветным Сеціве. Уласна, некаторыя казкі з гэтай кніжкі нагадваюць старыя добрыя сюжэты, напрыклад, з хітрай прыгажуняй, якая спрабуе высветліць сакрэты бессмяротнасці ў адмоўнага персанажа, альбо пра жыхароў каралеўства, якія пад чарадзействам віруса перасварыліся б, калі б разумная Мышка не заўважыла, што іх моц у адзінстве. Вось толькі напісаныя новыя казкі на новы лад, з тэхнічнай афарбоўкай. Што ж, калі такім чынам можна завабіць юных мабільных хлопчыкаў і дзяўчатак (кніжка разлічана на малодшы школьны ўзрост) да чытання і праз казку давесці пра добрае і вечнае, чаму б і не? Тым больш, што насычаны камп'ютарамі свет, у якім жывуць героі кніжкі, зусім не халодны і жорсткі. Знаходзіцца тут месца і любові, шчырасці, сумленнасці. Нават сам злосны Шкодзя прагне кахання і сяброўства.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.44	21.32	16.48
Віцебск —	4.25	21.30	17.05
Магілёў —	4.34	21.22	16.48
Гомель —	4.39	21.10	16.31
Брэст —	5.00	21.46	16.46
Гродна —	5.10	21.38	16.28

Месяц

Першая квадра 31 мая. Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Цімафея.*

К. *Марыі, Маркела, Эразма.*

Фота Іллі ВАКУЛІЧА.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

2 чэрвеня

1962 год — у Новачаркаску войскамі разагнана дэманстрацыя рабочых, якія пратэставалі супраць павышэння ў краіне цэнаў. Была прыменена зброя: паводле афіцыйных звестак, загінулі сама меней 24 чалавекі, неафіцыйныя крыніцы прыводзяць іншую лічбу — 53 загінулых. Яшчэ некалькі чалавек, арганізатараў выступленняў, былі асуджаны да расстрэлу.

1897 год — у адказ на шматлікія чуткі амерыканская газета «Нью-Ёрк джорнел» апублікавала абвяржэнне: «Паведамленні аб маёй смерці занадта перабольшаны. Марк Твен». Гэтае выслоўе папулярнага пісьменніка хутка стала крылатым.

Цытата дня:

«У каго сябры, у таго і багацце».

Пакувій (220—133 да н.э.), старажытнарымскі пісьменнік, драматург і мастак.

Спорт-тайм

«Нафтан» заваяваў Кубак Беларусі

Футбалісты наваполацкага клуба «Нафтан» упершыню заваявалі Кубак Беларусі. У фінальным матчы, які прайшоў 31 мая на мінскім стадыёне «Дынама», каманда Ігара Кавалевіча ў дадатковы час выйграла ў салігорскага «Шахцёра» з лікам 2:1. На матчы прысутнічала 9 тысяч гледачоў, у тым ліку галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Бернд Штанге. На шляху да фіналу «Нафтан» выйграў у нясвіжскага «Вераса» (2:0), мінскага «Лакаматыва» (3:0, 4:0), «Гомеля» (2:1, 0:1) і барысаўскага БАТЭ (1:0, 2:0).

Юрый Пунтус падаў у адстаўку

У суботу пяццю матчамі завяршылася праграма дзясятага тура чэмпіянату Беларусі ў вышэйшай лізе. У цэнтральным паядынку ў Мінску сышліся мясцовае «Дынама» і МТЗ-РІПА. Фінальны свісток зафіксаваў разгромны лік 5:0 на карысць «Дынама» і прымусіў настаўніка МТЗ-РІПА Юрыя Пунтуса аб'явіць аб адстаўцы. Перамогу святкаваў і яшчэ адзін сталічны клуб: «Мінск» выйграў у «Гомеля» (1:0). «Віцебск» паправіў настрой свайму трэнеру і кіраўніцтву валявой перамогай над «Гранітам» (2:1). Жодзінскае «Тарпеда» другі раз запар выйграе 1:0 і паціху ўліваецца ў кампанію пераследнікаў БАТЭ. У Брэсце нулявую нічыю запісалі на свой рахунак «Дынама» і «Брэст».

Вікторыя Азаранка выйшла ў паўфінал парнага разраду «Ралан Гарос»

Учора ў чвэрцьфінале парнага разраду Азаранка разам з расіянкай Аленай Весніной абгуляла кітайскі дуэт Цы Ян - Чжы Жэнь - 6:4, 4:6, 6:2.

19-гадовая беларуская тэнісістка Вікторыя Азаранка (9-е месца ў сусветным рэйтынгу) упершыню ў сваёй кар'еры выйшла ў чвэрцьфінал адкрытага чэмпіянату Францыі — адзнаго з чатырох турніраў серыі «Вялікага шлема». 31 мая ў 1/8 фіналу яна выйграла ў Аны Іванавіч з Сербіі з лікам 6:2, 6:3 і цяпер сустрэнецца з першай ракеткай свету Дзінарай Сафінай з Расіі.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

МАСАВЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Заданне № 15



Белыя: Крh3, Лf6, Лf8, Кс5, Ке5, n. g5 (6)

Чорныя: Крg1, Лg7, Сd4, Крh7, n. g2 (5)

Выйгрыш. (5 ачкоў)

Заданне № 16

Белыя: Крh6, Ch1, n. g6 (3)



Чорныя: Крh8, Са6, Кd8, n. a2 (4)

Нічыя. (5 ачкоў).

АБ ДЭБЮТНЫМ РЭПЕРТУАРЫ ШАХМАТЫСТА

Дэбютны рэпертуар шахматнага майстра ў практычнай гульні звычайна ўключае тры-чатыры пачаткі за белых і некалькі сістэм абароны за чорных. Гэта сведчыць не пра абмежаванасць ведаў шахматыста — яны двухбаковыя, а пра найбольш рацыянальны падыход да шахмат як спорту.

Дэбюты выбіраюцца такім чынам, каб яны гарманіравалі з густам шахматыста, яго стылем. Так, экс-чэмпіён свету М. Бацвіннік у свой час доўга гуляў на першы ход белых 1. е4 выбіраў французскую абарону 1... е6. Такі ж адказ быў і на 1. d4. Цяпер пасля 2. е4 атрымліваецца зноў французская, а на 2. с4 адказваў 2... f5, выбіраючы адну з любімых сваіх абарон — галандскую. Абедзве абароны вядуць да пазіцыйнай барацьбы з актыўнай контргульнёй у чорных. Таму, хто сур'ёзна цікавіцца практычным бокам шахмат, карысна завесці невялікую дэбютную картатэку — гэта падборка партый майстроў і гросмайстраў на выбраны дэбютны матэрыял. У іх спалучаецца дэбютная частка са стратэгічнымі ідэямі сярэдзіны гульні, эндшпілем. Паступова расшыраецца кругагляд па гэтым дэбюце, адбіраюцца больш надзейныя варыянты. Такі метад добра дапамагае ўдасканаленню шахматыста.

Прыводзім партыю на дэбют французскай абароны згулянай у цяперашні час чэмпіёнкай свету А. Касценюк.

А. Касценюк — П. Крамлінг

1. e4 e6 2. d4 d5 3. Кс3 Кс6 4. Kf3 Kf6 5. e5 Ke4 6. Cd3 Cb4 7. Cd2 K:d2 8. Ф:d2 f6 9. a3 C:c3 10. Ф:c3 fe5 11. de5 Фе7 12. h4 Cd7 13. b4 a6 14. h5 o-o-o. Фd2 Крb8 16. c3Лdf8 17. Фе3 Ка7 18. a4 c5 19. bc5 Лс8 20. Лb1 Ф:c5 21. Ф:c5 Л:c5 22. C:a6 Лс7 23. Фd2 C:a4 24. Лb4 Cd7 25. Лhb1 Сс8 26. Kd4 Лe8 27. f4 Лее7 28. Лb6 h6 29. g3 Лe8 30. Лd6 Лее7 31. Cf1 Cd7 32. Ch3 Кс8 33. C:e6! K:d6 34. ed6 C:e6 35. de7 Cd7 36. Kf5! Чорныя здаліся.

Віншуем з 70-годдзем дарагую ***Вольгу Іванаўну АНДРЭЕВУ*** *з в. Ліпавец. Жадаем моцнага здароўя, доўгіх шчаслівых гадоў жыцця.*

Дачка Таццяна і яе сям'я.

Паважаная ***Валянціна Міхайлаўна ЯРОТА****, былая настаўніца Сяражскай СШ. Прыміце нашы сардэчныя віншаванні з нагоды 80-годдзя. Зычым бадзёрага настрою, аптымізму і доўгіх гадоў жыцця.*

Былыя калегі: Новікі, Кухта, Некрашэвіч.

Віншуем з 25-годдзем ***Неанілу Іосіфаўну СЕМЕНАС*** *з г. Мінска.*

Прекрасное имя досталось тебе,
Ведь имя — таинственный ключик к судьбе
и радостный вестник удачи.
Пускай путеводной счастливой звездой
оно над тобою сияет.
Любовью, нежностью и теплотой
всю жизнь твою озаряет.

Мама, брат, родныя.

ГАДЗІННІК НА КАСЦЁЛЕ...

на сувязі са спадарожнікам

Самы вялікі ў Пастаўскім раёне (а мо і на ўсёй Віцебшчыне) гадзіннік усталявалі ў райцэнтры на фасадзе вежы мясцовага касцёла Святога Антонія Падуанскага, які размяшчаецца ў гістарычным цэнтры горада. Сам касцёл у стылі нэаготыкі (архітэктар Гойбель) быў пабудаваны ў 1898-1904 гадах на месцы былога манастыра францысканцаў.

З зямлі гадзіннік на першы погляд здаецца і не такім ужо вялікім, бо замацаваны на вышыні 20-ці метраў, а насамрэч яго памеры могуць здзівіць не толькі жыхароў глыбінкі: дыяметр гадзінніка — 165 сантыметраў, вага — 22 кілаграмы.

— Гадзіннік гэты знаходзіцца на пастаяннай сувязі са спадарожнікам, які аўтаматычна падключае падсветку і перадае сігнал дакладнага часу. Свецяцца ў цемры і стрэлкі, і лічбы. Нават калі адключыцца электрычнасць, гадзіннік сам будзе рэгуляваць час. Пры ўсім гэтым каштуе ён параўнальна няшмат — усяго 2,5 тысячы долараў. Вырабілі яго на невялікім заводзе, што ў Польшчы, — расказвае ксёндз-дэкан Анджэй Возьняк. — Мы вырашылі ўпрыгожыць наш касцёл у гонар 600-годдзя Паставаў, якое хутка будзе святкавацца. Чакалі майстра з Польшчы, ды вырашылі, каб паспець яшчэ да свята, усталяваць гадзіннік самастойна. Тым больш што польскі майстар падкрэсліў у нашай размове, што ўсё адно гарантыя на гадзіннік будзе выдадзена.

Кожную гадзіну адбіваюць куранты. Акрамя гэтага ў 6, 12, 15 і ў 21 і 24 гадзіны іграюць пяць розных мелодый. Іх, дарэчы, можна мяняць — запісаных каля 100, але можна і дадаць. І чатыры званы ёсць.

Аналагічны гадзіннік ёсць на касцёле ў вёсцы Лучай — што таксама ў Пастаўскім раёне, але ён меншы па памеры...

Аляксандр ПУКШАНСКІ, фота аўтара.

МЫ З ГОРАДА МАЙСТРОЎ

Гэты горад можна назваць казачным, бо ў рэальнасці такой вялікай колькасці маладых і вясёлых майстроў разам вы нідзе не сустрэнеце... У той жа час ён рэальна існуе і месціцца пад зялёнымі шатамі старога парка ў цэнтры Мінска. Менавіта тут святочнай музыкай абвясціла пра сябе рэспубліканская выстава-кірмаш Горад майстроў.

Прадаць тавар — таксама прафесійнае майстэрства.

З усіх абласцей прыехалі сюды навучэнцы каледжаў і вучылішчаў, каб паказаць майстэрства, набытае ў вучэбных кабінетах і майстэрнях. Дваццаць сем тысяч экспанатаў дэманстраваліся на стэндах, і кожны з іх не толькі твор умелых рук, але і вынік тэхнічнага і часам навуковага пошуку.

На алеях парку можна было ўбачыць дзейныя мадэлі і ўзоры станкоў, аўтамабіляў, электронных прыбораў, на вачах наведвальнікаў нараджаліся творы мастакоў, рэзчыкаў па дрэве, кавалёў. Кулінары прывезлі ўжо гатовую экспазіцыю, якая праз некалькі гадзін была паспяхова прададзена пад агульнае ўхваленне аматараў смачнай ежы. На працягу ўсяго выстаўнага дня не знікала чарга маладых модніц да стэндаў, дзе працавалі цырульнікі і майстры сучаснага манікюру — зразумела: прычоскі рабілі самыя папулярныя і да таго ж бясплатна.

Акрамя добрага адпачынку, наведвальнікі Горада майстроў атрымлівалі на выставе-кірмашы магчымасць убачыць перспектывы рабочых прафесій. А для выпускнікоў школ гэта азначае — убачыць адзін з варыянтаў сваёй блізкай будучыні.

Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара.

Гэты падворак прывезлі з Валожынскага сельскагаспадарчага прафесійнага ліцэя, дзе рыхтуюць кадры для агракомплексу.

ЖЫТА

Жыта — збожжавая расліна, з зерня якой пякуць хлеб. Жытні хлеб — штодзённая ежа нашых продкаў. Славяне здаўён звалі жытні хлеб «хлебушкам», а збожжа і палеткі — «жытам». У культуры ўсходніх славян жытнёвае збожжа сімвалізавала бессмяротнасць. Ураджай жыта даваў надзею на шчаслівае, багатае жыццё. Няўрод часам заканчваўся трагічна — галоднай смерцю. Нездарма з палеткамі, засеянымі збожжавымі культурамі, чалавек размаўляў, як з лепшым сябрам. А ў прыказках і прымаўках жыта ды ячмень «прасілі» ў гаспадара: «Сей хоць у пясок, ды ў свой часок».

● У народзе існавала шмат паданняў аб паходжанні жыта: «Жыта — найстарэйшае над усякім збожжам, якое ёсць на свеце. Быў кот і сабака, і ніхто ім есці не даваў, дык яны давай у Бога прасіць есці, дык Бог скінуў з неба два зярняткі жыта, а людзі гэта бачылі, тыя зярняткі пасадзілі, і ад таго развялося жыта».

● Каб атрымаць добры ўраджай жыта, трэба было прыкласці шмат намаганняў. Беражлівае стаўленне да хлеба выхоўвалася ў дзяцей з малодшага ўзросту. Да таго ж, яны самі бачылі, якімі цяжкасцямі здабываецца духмяны хлеб на іх стале.

● Не ўтрымаць хлеб заўсёды лічылася вялікім грахом. Непаважлівае стаўленне да хлеба было недаравальнае і вельмі строга каралася ў сям'і. Нашы продкі лічылі: калі Бог пачне гневацца, дабрабыт назаўсёды пакіне хату.

● Да пасеваў жыта заўсёды ставіліся вельмі адказна, выбіралі самы спрыяльны для гэтага дзень. Прыкмячалі: калі пры пасеве жыта ідзе маленькі дождж, то гэта «бог аб ураджаі вестку дасылае», а калі дождж быў моцны — лепш з поля з'ехаць, усё адно ўраджаю не будзе.

● У насенне жыта дадавалі попел з печы, каб засцерагчы палеткі ад граду.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Калі мураш падымае ў 10 разоў больш за сваю вагу, то 60 грамаў мурашоў можна паслаць за бутэлькай піва.

☺

У вёску вяртаецца з войска хлопец. Служыў у артылерыі зараджальшчыкам. Увечар сеў перад адчыненай печкай адпачыць, расслабіўся, на агонь глядзіць, ката гладзіць... Не заўважыў, як заснуў. У гэты час з печкі вугольчык выпаў і цьмее на падлозе. Уваходзіць маці, убачыла вугольчык і крычыць:

— Агонь!

Хлопец імгненна прачынаецца, шпурляе ката ў печку, зачыняе дзверцы, становіцца па стойцы «смірна» і дакладвае:

— Гармата да стральбы гатова!

☺

Сям'я, свята. Дзесяцігадовы Рома за сталом падсоўвае да сябе міску з чорнай ікрой і сталовай лыжкай пачынае запіхваць яе сабе ў рот. Мама робіць заўвагу:

— Ромачка, гэта ж не каша!

Сын, чмякаючы:

— Сапраўды! Ніякага параўнання!

☺

Яшчэ Пушкін казаў, што нават кот, калі хадзіў налева — заўсёды пры гэтым казкі распавядаў!

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 2910. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12